бх 1068).

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 5 ліпеня 1985 г. № 27 (3281) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

1 ліпеня 1985 года адбыўся чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Пленум разгледзеў пытанні трэцяй сесіі Вярхоўнага Савета СССР адзінаццатага склікання.

З прамовай па гэтых пытаннях на Пленуме выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. М. С. Гарбачоў.

Пленум падкрэсліў неабходнасць настойлівага ўдасканалення дзейнасці Саветаў народных дэпутатаў, дакладнага выканання сваіх функцый кожным звяном палітычнай сістэмы нашага грамадства, далейшага павышэння кіруючай ролі партыі, узмацнення яе ўплыву на ўсе ўчасткі дзяржаўнага, гаспадарчага і сацыяльна-культурнага будаўніцтва.

На Пленуме ЦК КПСС разгледжаны арганізацыйныя пытанні.

Задаволена просьба тав. Р. В. Раманава аб вызваленні яго ад абавязкаў члена Палітбюро і сакратара ЦК КПСС у сувязі з выхадам на пенсію па стану здароўя.

Пленум перавёў з кандыдатаў у члены Палітбюро ЦК КПСС тав. Э. А. Шэварднадзе і выбраў сакратарамі ЦК КПСС тав. Б. М. Ельцына і тав. Л. М. Зайкова.

На гэтым Пленум ЦК КПСС закончыў сваю работу.

КУРСАМ МІРУ І СТВАРЭННЯ

Трэцяя сесія Вярхоўнага Савета СССР адзінаццатага склікання

Высока цэнячы давер'е народа, з усведамленнем вялікай адказнасці сабраліся дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР на трэцюю сесію вышэйшага органа дзяржаўнай улады краіны. Яна адкрылася 2 ліпеня ў 10 гадзін раніцы ў Вялікім Крамлёўскім палацы сумесным пасяджэннем Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

Бурнымі, працяглымі апладысментамі сустрэлі дэпутаты і госці таварышаў **М. С. Гарбачова, Г. А. Аліева, В. І. Варатнікова, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, Д. А. Кунаева, Я. К. Лігачова, М. І. Рыжкова, М. С. Саломенцава, М. А. Ціханава, В. М. Чэбрыкава, Э. А. Шэварднадзе, У. В. Шчарбіцкага, П. Н. Дземічава, У. І. Далгіх, В. В. Кузняцова, Б. М. Панамарова, С. Л. Сакалова, Б. М. Ельцына, Л. М. Зайкова, М. В. Зімяніна, І. В. Капітонава, В. П. Ніканава, К. В. Русакова.**

Пасяджэнне адкрыў Старшыня Савета Саюза **Л. М. Талкуноў.**

Дэпутаты аднадушна зацвердзілі павестку дня сесіі і парадак яе работы.

У павестцы дня сесіі пытанні:

1. Аб выбранні Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

2. Аб змяненнях у саставе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

3. Аб выкананні патрабаванняў заканадаўства аб ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў.

4. Справаздача Генеральнага пракурора СССР аб дзейнасці Пракуратуры СССР па нагляду за выкананнем патрабаванняў савецкіх законаў аб умацаванні правапарадку, ахове правоў і законных інтарэсаў грамадзян.

5. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Па першым пытанні павесткі дня слова атрымлівае Генеральны сакратар ЦК КПСС, дэпутат **М. С. Гарбачоў,** які па даручэнні Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і партыйнай групы Вярхоўнага Савета ўносіць на разгляд, падтрыманы Саветам Старэйшын палат, праект пастановы:

«Вярхоўны Савет Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік пастанаўляе:

Выбраць дэпутата Грамыку Андрэя Андрэевіча Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР».

Адначасова прапануецца прыняць пастанову аб вызваленні таварыша А. А. Грамыкі ад абавязкаў першага намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР і міністра замежных спраў СССР.

Дэпутаты аднагалосна выбіраюць Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР дэпутата А. А. Грамыку.

Вярхоўны Савет прыняў пастанову аб вызваленні А. А. Грамыкі ад абавязкаў першага намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР і міністра замежных спраў СССР.

Сесія прыступае да разгляду пытання аб змяненнях у складзе Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Слова прадастаўляецца члену Палітбюро ЦК, сакратару ЦК КПСС дэпутату **Я. К. Лігачову,** які па даручэнні Цэнтральнага Камітэта КПСС уносіць наступны праект пастановы Вярхоўнага Савета СССР:

«Вярхоўны Савет Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік пастанаўляе выбраць членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР дэпутата Гарбачова Міхаіла Сяргеевіча».

Гэта прапанова была сустрэта бурнымі, працяглымі апладысментамі.

Аднагалосна прынята пастанова аб выбранні дэпутата **М. С. Гарбачова** членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Сесія вызваліла ад абавязкаў намеснікаў Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР дэпутатаў М. А. Яснова і П. Я. Страўтманіса ў сувязі з выхадам на пенсію.

Па прапанове члена Палітбюро ЦК КПСС, Старшыні Савета Міністраў РСФСР дэпутата **В. І. Варатнікова** намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад РСФСР выбіраецца Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета РСФСР дэпутат **У. П. Арлоў.**

Па прапанове першага сакратара ЦК Кампартыі Латвіі дэпутата **Б. К. Пугі** намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад Латвійскай ССР выбіраецца Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Латвійскай ССР дэпутат **Я. Я. Вагрыс.**

(Заканчэнне на стар. 2).

ПАСТАНОВА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

Аб выбранні дэпутата ГРАМЫКІ А. А. Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР

Вярхоўны Савет Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік **пастанаўляе:**

Выбраць дэпутата **Грамыку** Андрэя Андрэевіча Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Першы намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
В. КУЗНЯЦОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
Т. МЕНТЭШАШВІЛІ.

Масква, Крэмль. 2 ліпеня 1985 г.

Андрэй Андрэевіч ГРАМЫКА—

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік

Андрэй Андрэевіч Грамыка нарадзіўся ў 1909 годзе ў вёсцы Старыя Грамыкі цяпер Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці Беларускай ССР у сям'і селяніна-бедняка, рускі. Адукацыя вышэйшая — у 1932 годзе закончыў Эканамічны інстытут, затым — аспірантуру Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута эканомікі сельскай гаспадаркі. У 1936—1939 гадах працаваў старшым навуковым супрацоўнікам і выконваў абавязкі вучонага сакратара інстытута эканомікі Акадэміі навук СССР. Доктар эканамічных навук. Мае навуковыя працы.

З 1939 года Андрэй Андрэевіч Грамыка знаходзіцца на дыпламатычнай рабоце. Быў саветнікам пасольства СССР у ЗША, у 1943—1946 гадах — Надзвычайны і Паўнамоцны пасол СССР у ЗША і па сумяшчальніцтву — пасланнік СССР у Рэспубліцы Куба. У наступныя гады — пастаянны прадстаўнік СССР у Савеце Бяспекі ААН і адначасова намеснік міністра замежных спраў. Надзвычайны і Паўнамоцны пасол СССР у Вялікабрытаніі, першы намеснік міністра замежных спраў СССР.

З лютага 1957 года А. А. Грамыка — міністр замежных спраў СССР, з 1983 года — першы намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР, міністр замежных спраў СССР.

А. А. Грамыка — член КПСС з 1931 года. На XIX з'ездзе КПСС выбіраецца кандыдатам у члены ЦК, а на XX, XXII — XXVI з'ездах — членам Цэнтральнага Камітэта КПСС. З красавіка 1973 года — член Палітбюро ЦК КПСС.

Андрэй Андрэевіч Грамыка — дэпутат Вярхоўнага Савета СССР другога, пятага і ўсіх наступных скліканняў. Дэпутат Вярхоўнага Савета РСФСР.

За заслугі перад Радзімай А. А. Грамыку двойчы прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Ён узнагароджан многімі ордэнамі і медалямі.

КУРСАМ МІРУ І СТВАРЭННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1).

У сувязі з выбраннем **Б. М. Ельцына** сакратаром ЦК КПСС сесія вызваліла яго ад абавязкаў члена Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

Затым выступіў член Палітбюро ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР **М. А. Ціханаў**, які па даручэнні Цэнтральнага Камітэта КПСС уносіць прапанову аб назначэнні міністрам замежных спраў СССР дэпутата **Шэварднадзе** Эдуарда Амбросьевіча.

Вярхоўны Савет СССР аднагалосна назначае **Э. А. Шэварднадзе** міністрам замежных спраў СССР.

Вярхоўны Савет пачаў разгляд наступнага пытання парадку дня.

З дакладам «Аб выкананні патрабаванняў заканадаўства аб ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў» выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР дэпутат **З. Н. Нурыеў.**

Слова для садакладу камісій палат па ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў атрымлівае старшыня Камісіі па ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў Савета Саюза дэпутат **С. К. Гросу.**

На гэтым сумеснае пасяджэнне Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР закончылася.

Затым адбыліся раздзельныя пасяджэнні палат Савета Саюза і Савета Нацыянальнасцей.

●

З ліпеня сесія Вярхоўнага Савета СССР прадоўжыла работу на сумесным пасяджэнні палат.

Бурнымі працяглымі апладысментамі сустрэлі дэпутаты і госці таварышаў **М. С. Гарбачова, Г. А. Аліева, В. І. Варатнікова, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, Д. А. Кунаева, Я. К. Лігачова, М. І. Рыжкова, М. С. Саломенцава, М. А. Ціханава, В. М. Чэбрыкава, Э. А. Шэварднадзе, У. В. Шчарбіцкага, П. Н. Дземічава, У. І. Далгіх, В. В. Кузняцова, Б. М. Панамарова, С. Л. Сакалова, Б. М. Ельцына, Л. М. Зайкова, М. В. Зімяніна, І. В. Капітонава, В. П. Ніканава, К. В. Русакова.**

Пасяджэнне праходзіла пад старшынствам Старшыні Савета Нацыянальнасцей **А. Э. Воса.**

Старшынствуючы паведаміў, што абедзве палаты завяршылі абмеркаванне пытання аб захаванні патрабаванняў заканадаўства аб ахове прыроды і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў.

З заключным словам выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР дэпутат **З. Н. Нурыеў.**

Са справаздачай аб дзейнасці Пракуратуры СССР па нагляду за выкананнем патрабаванняў савецкіх законаў па ўмацаванню правапарадку, ахове правоў і законных інтарэсаў грамадзян выступіў Генеральны пракурор СССР дэпутат **А. М. Ракункоў.**

З садакладам камісій заканадаўчых меркаванняў па справаздачы Генеральнага пракурора СССР выступіў старшыня Камісіі заканадаўчых меркаванняў Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР дэпутат **В. П. Міронаў.**

У прынятай пастанове Вярхоўны Савет абавязаў Пракуратуру СССР і іншыя праваахоўныя органы прымаць рашучыя меры па выяўленні і своечасовым ухіленні любых парушэнняў законнасці, барацьбе з чужымі сацыялістычнаму ладу жыцця з'явамі.

З дакладам аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР выступіў Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР **Т. Н. Ментэшашвілі.** Вярхоўны Савет СССР прыняў адпаведныя законы і пастановы.

На гэтым трэцяя сесія Вярхоўнага Савета СССР адзінаццатага склікання закончыла работу.

Па матэрыялах ТАСС.

НАСУСТРАЧ ПАРТЫЙНАМУ З'ЕЗДУ

Акруговы Дом афіцэраў пачаў праводзіць творчыя вечары, прысвечаныя XXVII з'езду КПСС. У рамках іх адбылася сустрэча з народным мастаком СССР Міхаілам Савіцкім. Пра творчасць вядомага майстра, яго ўклад у развіццё савецкага шматнацыянальнага мастацтва расказаў пісьменнік А. Сульянаў. Прысутныя паглядзелі дакументальны фільм «Апаленая памяць», які ўзнаўляе старонкі біяграфіі М. Савіцкага, пазнаёміліся з рэпрадукцыямі яго карцін.

Міхаіл Савіцкі прыгадаў асобныя моманты са свайго жыцця, адказаў на шматлікія пытанні прысутных.

П. ГАРНАСТАЕЎ.

ПЛЕНУМ КНІГАЛЮБАЎ БЕЛАРУСІ

Пытанням удасканалення прапаганды грамадска-палітычнай і навукова-тэхнічнай літаратуры ў сувязі з падрыхтоўкай да XXVII з'езда КПСС быў прысвечаны II пленум рэспубліканскага праўлення Добраахвотнага таварыства аматараў кнігі БССР. Дакладчык — намеснік старшыні праўлення П. Вараб'ёў, а таксама тыя, хто выступіў у спрэчках — старшыня секцыі па прапагандзе грамадска-палітычнай літаратуры рэспубліканскай арганізацыі таварыства, дырэктар выдавецтва «Беларусь» А. Самаль, старшыня праўлення Барысаўскай гарадской арганізацыі Л. Белая, старшыня пярвічнай арганізацыі кнігалюбаў Цырынскай СШ Карэліцкага раёна П. Сачыўка і іншыя — гаварылі аб значэнні кнігі ў выхаванні працоўных, у паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу. Адзначалася, што значны вопыт у гэтай рабоце накоплены прапагандыстамі кнігі вытворчых аб'яднанняў «Бабруйскшына», «Хімвалакно», Віцебскага тэлевізійнага завода, калгаса імя Калініна Драгічынскага раёна і інш.

Гаварылася і аб тым, што не на ўсіх прамысловых прадпрыемствах, будоўлях, у навуковых установах можна атрымаць інфармацыю аб кніжных навінках, указвалася на іншыя нявыкарыстаныя рэзервы ў рабоце з кнігай, асабліва ў сельскай мясцовасці.

А. ПАНАСЕНКА.

НОВЫЯ МУЗЫЧНЫЯ ШКОЛЫ

З кожным годам паляпшаецца эстэтычнае выхаванне дзяцей і падлеткаў у Мінскай вобласці. Станоўчую ролю ў гэтым адыгрываюць музычныя школы, якіх цяпер 58. А будзе значна больш. Вось і нядаўна аблвыканком прыняў рашэнне аб адкрыцці такой школы ў вёсцы Станькава, што ў Дзяржынскім раёне.

Сёлета мяркуецца адкрыць тры музычныя школы за сродкі калгасаў і саўгасаў.

У вобласці робіцца шмат па ўкараненні ў практыку вопыту лепшых музычных школ. Нядаўна на калегіі ўпраўлення культуры аблвыканкома зроблены падрабязны аналіз работы педагагічнага калектыву Мачулішчанскай музычнай школы. Стала традыцыяй праводзіць агляды-конкурсы на лепшы калектыў мастацкай самадзейнасці такіх школ.

К. ПЯРШАЙСКІ.

КУПАЛАЎЦЫ Ў ХЛЕБАРОБАЎ

Прасторную залу Хаўхоліцкага сельскага Дома культуры, што ў Барысаўскім раёне, запоўнілі хлебаробы і жывёлаводы, механізатары, спецыялісты сельскай гаспадаркі, вясковая інтэлігенцыя і навучэнцы. Усе яны з розных вёсак калгаса імя Чкалава прыйшлі на сустрэчу з артыстамі Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. У іх пастаноўцы на сельскай сцэне паказваўся спектакль па п'есе лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Аляксея Дударава «Вечар».

Купалаўцы паказалі на Барысаўшчыне пяць спектакляў.

П. БАРОДКА.

ПРЭМ'ЕРА Ў НАРОДНЫМ

Народны тэатр юнага гледача Палаца культуры тэкстыльшчыкаў Мінскага камвольнага камбіната паказаў чарговую прэм'еру — спектакль па гераічнай аповесці А. Арэхава «Жменя брыльянтаў», прысвечаны 40-годдзю Вялікай Перамогі. Гэта дыпломная работа студэнта-выпускніка Мінскага інстытута культуры А. Мысліўца. Пастаноўка ажыццёўлена пад кіраўніцтвам галоўнага рэжысёра тэатра Я. Быткоўскага. Сцэнаграфія мастака Г. Лапшына. Музычнае афармленне К. Садоўскага.

Галоўную ролю выканаў вучань 8 класа СШ № 55 г. Мінска Ігар Крывец.

Г. ПЯТРОЎ.

ПАЧУЦЦЁ СЯМ'І АДЗІНАЙ

На Чарнігаўшчыне адбылося VI традыцыйнае літаратурнае свята «Пачуццё сям'і адзінай», на якое прыехалі паэты і перакладчыкі з Масквы, Кіева, Арменіі, Кіргізіі, Чувашыі... Як заўжды, свята пачалося ў сяле Пяскі на радзіме Паўло Тычыны. Майстры слова сустрэліся з працоўнымі вобласці, выступілі на прадпрыемствах і ў калгасах. Закончылася свята вялікім літаратурным вечарам у музеі М. Кацюбінскага.

Пісьменніцкую арганізацыю Беларусі прадстаўляў паэт А. Пісьмянкоў.

І. КУБРАКОЎ.

КАНЦЭРТ ПОЛЬСКІХ СЯБРОЎ

На летняй эстрадзе Гродзенскага гарадскога парку культуры і адпачынку прайшоў канцэрт духавога аркестра Войска Польскага. У выкананні музыкантаў з братняй краіны гучалі творы польскіх і савецкіх кампазітараў.

М. ДУБРАВІН.

АБМЕРКАВАНЫ ПРАБЛЕМЫ ПРОЗЫ

Адбылося чарговае пасяджэнне Савета па крытыцы Саюза пісьменнікаў СССР, на якім абмеркаваны праблемы развіцця сучаснай прозы, яе набліжанасці да жыцця. Асаблівая ўвага была звернута на ролю літаратуры ў сучаснай ідэалагічнай барацьбе.

Выступіў на пасяджэнні і Іван Чыгрынаў, які, адзначыўшы набыткі беларускіх пісьменнікаў, гаварыў аб тым, што трэба зрабіць, каб з-пад пяра літаратараў з'яўляліся творы, вартыя нашага велічнага часу.

Г. ВОЛКАЎ.

ВІНШУЕМ!

За вялікую работу па мастацкім абслугоўванні працоўных горада Мінска ў перыяд гастроляў у чэрвені 1985 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Дзяржаўны акадэмічны тэатр оперы і балета Маладзёўскай ССР Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

●

За вялікую работу па мастацкім абслугоўванні працоўных горада Мінска ў перыяд гастроляў у чэрвені 1985 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Кіеўскі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга акадэмічны рускі драматычны тэатр імя Лесі Украінкі Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

●

За шматгадовую плённую работу ў галіне савецкага выяўленчага мастацтва, актыўны ўдзел у яго прапагандзе і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР ГУГЕЛЯ Адольфа Самуілавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ВЫСТУПАЕ АГІТБРЫГАДА

Закончыліся заняткі... Цяпер можна наведаць сяброў, паглядзець цікавы фільм, пасядзець з вудай над рэчкай. Але некаторыя студэнты Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі не пакідаюць аўдыторыю. У іх праз гадзіну яшчэ адно не менш сур'ёзнае выпрабаванне — здача новай праграмы агітацыйна-мастацкай брыгады. Арганізаваны іх калектыў дванаццаць гадоў назад. За гэты час створана столькі ж праграм.

Шмат добрых водгукаў гледачоў атрымалі тэматычныя выступленні «Пачынаемся з Леніна мы», «Няма нічога даражэй за хлеб», «Людзі, будзьце пільныя!», «Пяцігодцы якасці — ударную працу» і іншыя.

Будучая спецыяльнасць удзельнікаў агітбрыгады звязана з працай у вёсцы. Таму гэты калектыў часты госць у сельскіх клубах, чырвоных кутках, на палявых станах калгасаў і саўгасаў вобласці. Вось і нядаўна самадзейныя артысты выступілі з цікавым канцэртам у Пухавіцкай перасовачна-механізаванай калоне.

Назавуць тут вам і больш далёкія паездкі. Агітбрыгада паспяхова выступала перад калектывамі леспрамгасаў Архангельскай вобласці і на ўдарных будоўлях Татарскай АССР.

— Мы прапагандуем савецкі лад жыцця, услаўляем працу нашых сучаснікаў, не даём спакою п'яніцам, гультаям, дэбашырам, — расказвае кіраўнік агітбрыгады М. Шаін.

Прадуманая навучальна-выхаваўчая работа дазваляе ўдзельнікам павышаць сваё выканаўчае майстэрства.

Цяпер у Мінску больш за 300 такіх самадзейных калектываў.

К. АНТОНАЎ.

У СЕРЫІ «МАЛАДЫЯ ГАЛАСЫ»

Малады рускі паэт Вячаслаў Казакевіч — наш зямляк, нарадзіўся ў Бялынічах, З Беларуссю падтрымлівае цесныя сувязі. Часта бывае ў родных мясцінах, шмат займаецца перакладамі твораў беларускіх паэтаў, прымаў удзел у рабоце пленума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, прысвечанага пытанням літаратурных узаемасувязей і перакладу.

Нядаўна выдавецтва «Молодая гвардия» ў серыі «Маладыя галасы» выпусціла першую кнігу вершаў В. Казакевіча «Свята ў правінцыі». Прадмову «Свята жывога жыцця» да зборніка напісаў Рыгор Барадулін, у якой ён, гаворачы ўхвальнае слова пра творчасць аўтара, жадае яму новых творчых поспехаў.

М. ГЕЛЬСКІ.

ВЫСТАЎКІ

Новая экспазіцыя разгорнута ў Бабруйскай выставачнай зале. Гэта частка выстаўкі «Мастакі Беларусі — народу», якая прысвячалася 40-годдзю Мастацкага фонду БССР і нядаўна дэманстравалася ў Мінску. У Бабруйску прадстаўлена каля сотні графічных работ, выкананых у розных тэхніцы. Гэта і афорт, і літаграфія, і гравюра на дрэве. Аўтарамі іх з'яўляюцца не толькі мастакі-прафесіяналы, але і аматары.

В. ЗЯМСКОЎ.

●

Невялікая экспазіцыя, што дэманстравалася ў мінскім кінатэатры «Масква», зацікавіла тых, хто прыходзіў на чарговыя сеансы. Свае работы на суд гледачоў вынеслі члены маладзёжнага аб'яднання Саюза мастакоў БССР В. Каралёў, У. Рынкевіч і В. Касцючэнка. Нягледзячы на малады ўзрост, творчасцю сваёй яны вядомы аматарам мастацтва — лепшыя творы іх дэманстраваліся на рэспубліканскіх выстаўках, а некаторыя і на ўсесаюзных.

Уладзімір Рынкевіч па камандзіроўцы ЦК ЛКСМБ выязджаў на партызанскую Лепельшчыну, пабываў на месцах былых баёў, сустракаўся з былымі партызанамі. У выніку гэтай паездкі нарадзілася серыя акварэлей «Зямля партызанская». Тэма мінулай вайны знайшла адлюстраванне і ў творчасці В. Каралёва. Але ўсе трое аўтараў уважныя і да спраў нашых сучаснікаў, раскрываюць іх паўсядзённую працу, паказваюць багаты ўнутраны свет.

На выстаўцы былі таксама прадстаўлены работы, якія апяваюць харастко краявідаў роднай зямлі.

К. ЛЯСОЦКІ.

●

У Літаратурным музеі Якуба Коласа адкрылася выстаўка, прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі. У экспазіцыі прадстаўлены рэдкія выданні, кнігі апошніх гадоў, а таксама зборнікі, што выйшлі ў перакладзе на рускую мову, успаміны Петруся Усцінавіча пра Якуба Коласа, з якім ён сябраваў.

Змешчаны на стэндах і шматлікія фотаздымкі.

М. ЖЫГОЦКІ.

ВЕСЕЛА РАЗАМ АДПАЧЫВАЦЬ

У мінулую нядзелю ў парках і скверах горада-героя Мінска, бадай, як ніколі, было ажыўлена. На летніх эстрадах, танцпляцоўках, а то і проста ў засені дрэў праводзілася асабліва шмат культурна-масавых мерапрыемстваў. Большасць з іх прысвячалася 41-ай гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У прыватнасці, у парку імя Чалюскінцаў прайшло народнае гулянне «Маладосць мая, Беларусь!». Асноўным зместам яго стала тэатралізаванае прадстаўленне «Мы — радасць, мы — шчасце тваё, Беларусь!», у якім прынялі ўдзел школьнікі.

30 чэрвеня краіна ў чарговы раз адзначыла Дзень савецкай моладзі. У сувязі з гэтым адбылося многа мерапрыемстваў пад знакам падрыхтоўкі да XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве. Гэтаму было прысвечана і свята моладзі Заводскага раёна, якое пад назвай «Салют, таварыш фестывалы!», праходзіла ў парку культуры і адпачынку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка. У ім прынялі ўдзел калектывы мастацкай самадзейнасці, а таксама вакальна-інструментальны ансамбль «Верасы», які парадаваў прысутных змястоўнай праграмай.

Ю. ЛАПІЦКІ.

Выступаюць «Верасы».

Фота М. МІНКОВІЧА.

НА МОВЕ ДРУЖБЫ І СУПРАЦОЎНІЦТВА

Дзесятая сустрэча савецкіх і балгарскіх перакладчыкаў

26—28 чэрвеня ў Мінску адбылася Дзесятая двухбаковая сустрэча савецкіх і балгарскіх перакладчыкаў. На такіх сустрэчах, якія праводзяцца адпаведна Дагавору аб супрацоўніцтве паміж Саюзам пісьменнікаў СССР і Саюзам перакладчыкаў Балгарыі, штогод па чарзе — у Савецкім Саюзе і ў Народнай Рэспубліцы Балгарыі, звычайна абмяркоўваюцца надзённыя пытанні тэорыі і практыкі мастацкага перакладу, праблемы далейшага развіцця літаратурных узаемасувязей, аналізуецца зробленае ў абедзвюх краінах з мэтай паляпшэння якасці перакладаў.

«Мастацкая і дакументальная літаратура пра Вялікую Айчынную вайну і праблемы яе перакладу» — такая была тэма сёлетняй сустрэчы, прысвечанай 40-годдзю Вялікай Перамогі савецкага народа і 40-годдзю заканчэння Другой сусветнай вайны. У Мінск прыехала дэлегацыя Саюза перакладчыкаў Балгарыі на чале з намеснікам старшыні саюза, народным дзеячам культуры НРБ Філіпам Гіневым. У яе складзе былі даўнія сябры нашай літаратуры, вядомыя перакладчыкі і прапагандысты беларускай літаратуры Сімяон Уладзіміраў, старшыня секцыі мастацкай літаратуры Саюза перакладчыкаў Балгарыі, заслужаны дзеяч культуры НРБ Найдзен Вылчаў, старшыня секцыі паэзіі Саюза балгарскіх пісьменнікаў, заслужаны дзеяч культуры НРБ, а таксама перакладчыкі і крытыкі Каця Вітанава, Наташа Манолава, сакратар Саюза перакладчыкаў Балгарыі Уладзімір Ганеў. Савецкую дэлегацыю на сустрэчы склалі намеснікі старшыні Савета па мастацкім перакладзе Саюза пісьменнікаў СССР Павел Топер і Элізбар Ананіяшвілі, вядомыя савецкія балгарысты-перакладчыкі Аляксандр Кяткоў (Кіеў) і Любоў Ліхачова (Масква), загадчык рэдакцыі выдавецтва «Советский писатель» Арнольд Там, а таксама вядомыя беларускія пісьменнікі і перакладчыкі.

Міжнародная сустрэча перакладчыкаў на гэты раз праходзіла ў Мінску не выпадкова. Беларуская зямля першай прыняла на сябе 22 чэрвеня 1941 года ўдары фашысцкіх полчышчаў. На гэтай зямлі савецкія людзі, прадстаўнікі ўсіх братніх народаў СССР, паказалі прыклады невымернай стойкасці і мужнасці. Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці, шырокі партызанскі рух, бліскучая аперацыя па вызваленні Беларусі «Баграціён» — усё гэта знаходзіць дастойнае адлюстраванне ў мастацкай літаратуры. І натуральна, што вялікай творчай размове папярэднічала знаёмства гасцей з горадам-героем Мінскам, які ўзняўся з папялішчаў і руін, з музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, з мемарыяльным комплексам «Хатынь».

Адкрыў сустрэчу сакратар праўлення СП СССР, першы сакратар праўлення СП Беларусі Ніл ГІЛЕВІЧ. Ён адзначыў, што савецкія і балгарскія перакладчыкі сабраліся для абмеркавання вельмі важнай, вельмі значнай тэмы. Сустрэча адбываецца ў Мінску — гэта высокая адзнака павагі да Беларусі, да гістарычнага лёсу нашай рэспублікі, да яе літаратуры пра вайну. Мастацкі пераклад, працягваў прамоўца, самая плённая форма культурнага абмену, вышэйшы акт творчага супрацоўніцтва. Балгарскія перакладчыкі клапоцяцца пра тое, каб усё лепшае, што з'яўляецца ў Савецкім Саюзе з твораў мастацкай літаратуры, стала вядома ў сваёй краіне. І наадварот, савецкія перакладчыкі актыўна працуюць над тым, каб духоўныя скарбы братняга народа зрабіць здабыткам свайго чытача. Н. Гілевіч падрабязна спыніўся на праблеме адбору сапраўды лепшага ў кожнай нацыянальнай літаратуры, вартага перакладу. У сувязі з гэтым, падкрэсліў ён, значна ўзрастае роля крытыкі перакладу, роля рэдактараў, укладальнікаў, выдавецкіх рэцэнзентаў. Свае праблемы ўзнікаюць і пры перакладзе твораў дакументальнай літаратуры. На думку Н. Гілевіча, распачынала гэты жанр кніга беларускіх дзяцей «Ніколі не забудзем», вартая ўвагі перакладчыкаў усіх краін свету.

Намеснік старшыні Саюза перакладчыкаў Балгарыі Філіп ГІНЕЎ пачаў сваю прамову словамі падзякі савецкаму народу за яго подзвіг у гады вайны. У Балгарыі, гаварыў ён, заўсёды будуць памятаць, што калі сыны савецкага народа змагаліся на палях Расіі, Беларусі, Украіны, на ўсёй акупіраванай фашыстамі зямлі, а пасля на палях Еўропы, яны змагаліся і гінулі і за нашу свабоду і незалежнасць, і за нашу перамогу над фашызмам. Савецкая літаратура ваявала разам з народам. І сёння мы не можам не радавацца таму, што зроблена намі ў справе перакладу і прапаганды твораў савецкіх аўтараў пра Вялікую Айчынную, пра нялёгкае, гераічнае жыццё савецкага народа ў тыя цяжкія гады. Але галоўнае — не колькасць гэтых перакладных кніг, не колькасць публікацый у газетах і часопісах, а іх уздзеянне на духоўнае жыццё балгарскіх грамадзян, вялікая цікавасць да гэтых кніг. Савецкая мастацкая і мемуарная літаратура, працягваў Ф. Гінеў, усё шырэй і глыбей раскрывае праўду пра вайну, пра савецкага чалавека ў яе агні — з усёй складанасцю чалавечых паводзін у выключна трагічных абставінах, у нечалавечна цяжкіх выпрабаваннях усенароднага жыцця. Союз перакладчыкаў Балгарыі клапоціцца аб павышэнні ўзроўню перакладаў, пра тое, каб яны захоўвалі першародную мастацкую сілу і свежасць арыгіналаў. У прыватнасці, прынята спецыяльная пастанова аб развіцці крытыкі перакладной літаратуры.

Павел ТОПЕР (Масква) адзначыў, што перакладчыкі ў многіх краінах сёння зусім натуральна цікавяцца беларускім раманам, беларускай прозай. Маюцца на ўвазе перш за ўсё творы К. Чорнага, І. Мележа, І. Шамякіна, Я. Брыля, А. Адамовіча і маладзейшых І. Чыгрынава, І. Пташнікава, Б. Сачанкі, В. Казько, А. Дударава, С. Алексіевіч і іншых. Асобнае месца ў гэтым кантэксце займае В. Быкаў. Прамоўца палемізаваў з тымі, хто лічыць, што ў новай аповесці «Знак бяды» Быкаў нібы адышоў ад звычайных сваіх герояў, ад звычайнай сваёй праблематыкі. Мне здаецца, — сказаў П. Топер, — што Быкаў тут як бы пайшоў у глыбіню беларускай тэрыторыі, у глыбіню народнага лёсу, у глыбіню народнага характару. Але зерне характару гэтай сялянскай пары — гэта тое самае зерне, што жыве ў грудзях яго герояў, лейтэнантаў, салдат, якія, паміраючы, думаюць толькі пра будучае. Немагчымасць жыць пад гнётам акупантаў — вось думка, якой прасякнута ўся савецкая літаратура пра Вялікую Айчынную вайну. Яна з вялікай сілай гучыць у творах беларускіх пісьменнікаў, яна асабліва пранікнёна і моцна выражана ў «Знаку бяды» В. Быкава. П. Топер адзначыў, што паміж беларускай і балгарскай літаратурамі аб вайне можна знайсці нямала адрозненняў, якія дыктуюцца гістарычнымі абставінамі. Але многа ёсць і агульнага, напрыклад, у абедзвюх літаратурах папулярная партызанская тэматыка. Блізкія і характары герояў-антыфашыстаў. З гэтага пункту гледжання прамоўца параўноўвае кнігу І. Радзічкава «Парахавы буквар» і «Знак бяды» В. Быкава. П. Топер спыніўся і на праблемах аўтаперакладу, на складаным працэсе ўзаемадзеяння моў у час аўтаперакладу. Гаворачы аб неабходнасці ўзняць ролю прафесійнай крытыкі перакладаў, П. Топер падкрэсліў абавязковую неабходнасць для крытыка ведання дзвюх моў. «Ацаніць пераклад можа толькі той, каму пераклад не патрэбны», — прывёў ён дасціпную думку аднаго з французскіх тэарэтыкаў мастацкага перакладу Андрэ Лефевера.

Упершыню наведала Беларусь Каця ВІТАНАВА (Балгарыя). Яна гаварыла пра радасць сустрэчы з новымі сябрамі і пра тое, што ў яе сціскаецца сэрца ад думкі: «На гэтай зямлі я магу ўбачыць вочы, якія маўкліва скажуць: «Я з вогненнай вёскі...» Ваенная літаратура для яе і яе пакалення — перш за ўсё школа чалавечнасці, школа высокіх маральных ідэалаў. Гэта яна асабліва выразна адчула, перакладаючы «Блакадную кнігу» А. Адамовіча і Д. Граніна.

Арнольд ТАМ (Масква) як выдавец перш за ўсё заклапочаны пэўным зніжэннем якаснага ўзроўню перакладаў прозы і паэзіі, якое назіраецца ў апошнія гады. Не ў кожнай рэспубліцы ёсць, як у Эстоніі, перакладчыкі, здольныя перакладаць амаль з усіх моў свету. Гарантыя якасці, па думцы прамоўцы, — перакладчык-пісьменнік, творца, які добра адчувае, што такое мастацкае слова.

Сваім вопытам перакладаў з савецкай і беларускай паэзіі падзяліўся Найдзен ВЫЛЧАЎ (Балгарыя). Ён падкрэсліў, што сёння ў Балгарыі ў сямі выдавецтвах перакладаюць і выдаюць беларускую літаратуру. Н. Вылчаў расказаў пра новыя пераклады вершаў А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, Р. Баравікова, Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, В. Вярбы, А. Грачанікава, М. Дуксы, С. Законнікава, В. Зуёнка, В. Іпатавай, К. Кірэенкі, Н. Мацяш, У. Някляева, Г. Пашкова, А. Разанава, Я. Сіпакова, Я. Янішчыц. Балгарскі госць паведаміў, што следам за А. Германавым і І. Давыдкавым да перакладаў беларускай паэзіі далучыліся і больш маладыя Янка Дзімаў, Марына Георгіева і Хрыста Папоў. Н. Вылчаў падзяліўся сваёй задумай і абавязкам давесці распачатую А. Германавым справу — пераклясці «Песню пра зубра» М. Гусоўскага. Толькі што ў Балгарыі выйшаў «Знак бяды» В. Быкава ў яго перакладзе, у Народным тэатры імя І. Вазава ідуць рэпетыцыі «Вечара» А. Дударава. П'есу з беларускай мовы таксама пераклаў Н. Вылчаў.

Да аналізу асаблівасцей перакладу мастацкай і дакументальнай ваеннай літаратуры трэба падыходзіць з пункту гледжання спецыфікі літаратурнага працэсу ў кожнай нацыянальнай літаратуры, зазначыў у сваім выступленні Ванкарэм НІКІФАРОВІЧ. Для перакладчыкаў балгарскай літаратуры, лічыць ён, яе антываенныя, антыфашысцкія старонкі пачынаюцца з класічных узораў, з твораў, прысвечаных барацьбе за вызваленне і Вераснёўскаму паўстанню 1923 года — першаму антыфашысцкаму паўстанню ў свеце. Прамоўца спыняецца на перакладах антываеннай лірыкі выдатнага балгарскага паэта Д. Дэбелянава, зробленых Н. Гілевічам, на праблеме канцэпцыі перакладчыка, выяўленай у перакладах Н. Гілевіча з Х. Боцева. Сам фактар магчымасці перакладу, лічыць В. Нікіфаровіч, уплывае і на суадносіны нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў літаратуры, прымушае пісьменніка свядома і падсвядома звяртацца не толькі да свайго нацыянальнага чытача (хоць перш за ўсё — да яго), размаўляючы з ім, ён нібыта гаворыць з людзьмі ўсёй планеты, для якіх сёння самае важнае — зрабіць усё, каб пазбегнуць магчымага ядзернага знішчэння. Менавіта таму будуць і будуць перакладацца кнігі пра мінулую вайну, таму што, як заўважыў Н. Вылчаў у прадмове да свайго перакладу «Знака бяды», іх героі «запамінаюцца надоўга, яны доўга жывуць у нашай свядомасці, ідуць побач з намі сёння, узбагачаюць нас маральна, гледзячы на нас сваім строгім позіркам, у якім — і пытанне, і дакор».

Наташа МАНОЛАВА (Балгарыя) расказала аб тым, што калі адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны творы савецкіх пісьменнікаў пра гераізм і подзвіг народа выклікалі ў яе краіне толькі ўзнёслае і радаснае захапленне, дык цяпер у ацэнках антываеннай літаратуры пераважае ўдумлівы, глыбокі, зацікаўлены аналіз, больш канкрэтны і змястоўны, звязаны з пэўным рухам у сацыяльна-грамадскім жыцці Савецкай краіны. Прамоўца заклікала і крытыкаў, і перакладчыкаў абедзвюх краін да больш крытычнага і аналітычнага сумеснага разгляду новых твораў як у савецкай, так і ў балгарскай літаратуры. Такі адкрыты творчы дыялог быў бы вельмі карысны, лічыць Н. Манолава.

Многія нацыянальныя літаратуры свету могуць сёння пахваліцца колькасцю твораў на антываенную тэматыку, значыў Элізбар АНАНІЯШВІЛІ (Масква). Але гэта літаратура неаднародная. Не заўсёды ў цэнтры такіх твораў чалавек, высокія маральныя праблемы. У гэтых адносінах важнае значэнне мае правільная арыентацыя перакладчыка, як і ўзровень яго майстэрства, падкрэслівае прамоўца.

Пытанні павышэння якасці перакладаў твораў мастацкай літаратуры былі ў цэнтры ўвагі многіх, хто выступаў на сустрэчы. Народны пісьменнік БССР Янка БРЫ�ль расказаў пра свой вопыт адбору твораў і перакладаў польскай літаратуры, падкрэсліўшы важнасць і неабходнасць асабістых кантактаў аўтараў і перакладчыкаў. Прамоўца параіў балгарскім калегам звярнуцца да цікавейшай спадчыны М. Гарэцкага і пазнаёміць з ёй чытачоў братняй Балгарыі. Уладзімір АНІСКОВІЧ гаварыў пра адказнасць крытыкі, пра тое, што ў крытыцы перакладаў нельга збівацца на дробязі, бо галоўная задача кожнага разгляду перакладнога твора — дапамагчы, каб ён дайшоў да чытача. Такую задачу, прызнаўся прамоўца, я ставіў, рэцэнзуючы выдадзеную ў нас у перакладзе Н. Гілевіча кнігу паэзіі Г. Джагарава «Зямля, як чалавечая далонь». Неўзабаве выйдзе ў Мінску новы раман А. Гуляшкі, рыхтуецца да выдання зборнік сучаснай балгарскай аповесці «Такое каханне». Сваім вопытам перакладаў на рускую мову твораў і мастацкіх, і дакументальных на антываенную тэму падзяліўся Любоў ЛІХАЧОВА (Масква). Апошняя яе праца — кніга Нікалая Хрыстозава «Гарнізоннае стрэльбішча» — пра антыфашысцкае супраціўленне ў Балгарыі, дзе ёсць раздзелы, прысвечаныя беларускім уражанням і сустрэчам аўтара. Алесь ЯСКЕВІЧ звярнуў увагу на аспект гераічнага ў нашай літаратуры як на звычайную норму жыцця ў перыяд вайны — гэта важна і для разумення спецыфікі беларускай ваеннай літаратуры і для канкрэтнай працы перакладчыкаў, тых, хто прапагандуе гэту літаратуру. Для перакладчыка, лічыць А. Яскевіч, важна знайсці ключ для перакладу такіх твораў, бо літаратура пра вайну апошняга часу даволі складаная па сваёй структуры: яна злучыла лірызм з эпікай, дакументальную плынь з эмацыянальнай. Прамоўца падрабязна спыніўся на ўзаемасувязях балгарскай і беларускай школ мастацкага перакладу, адзначыўшы і агульную павагу да літаратурнага матэрыялу, і высокі ўзровень прафесійнай культуры. Спецыяльнага разгляду, лічыць А. Яскевіч, патрабуюць пытанні ўзаемадзеяння нашых моў, іх параўнальнае вывучэнне, бо цяжкасці пры перакладзе з блізкіх моў сапраўды неймаверныя. Валянцін ТАРАС выказаў думку аб тым, што якасць перакладу твора пра вайну будзе значна вышэйшая, калі і перакладчык «ведае вайну ў твар», бачыў і перажыў яе. Ён жа звярнуў увагу балгарскіх калег на цікавыя творы рускіх пісьменнікаў, якія жывуць і працуюць у Беларусі.

Роза СТАНКЕВІЧ, высока ацэньваючы балгарскае гучанне перакладу Н. Вылчавым аповесці В. Быкава «Знак бяды», зрабіла канкрэтны параўнаўчы аналіз асобных мясцін беларускага арыгіналу і балгарскага тэксту. Поспех перакладчыка ў тым, лічыць Р. Станкевіч, што яго цікавіў не толькі сэнс быкаўскай фразы, але і яе рытм, яе драматызм, Н. Вылчаў знаходзіў не толькі лексічныя, але і падтэкставыя эквіваленты. Карлас ШЭРМАН падкрэсліў, што ўдача чакае перакладчыка звычайна тады, калі твор іншай літаратуры яму падабаецца, блізкі па інтанацыйнай і мастацкай структуры. Прамоўца пагадзіўся з выказанымі думкамі аб неабходнасці канкрэтнай, аператыўнай крытыкі перакладаў. Гаворачы пра адказнасць перакладчыка, К. Шэрман закрануў пытанне аб немагчымасці ў поўнай меры ўплываць асобным перакладчыкам і секцыі мастацкага перакладу СП БССР на фарміраванне планаў выдання перакладной літаратуры. Закрануў ён таксама праблему спрэчнасці так званага аўтаперакладу.

Літаратура можа зрабіць многае, бо кнігі заўсёды на перадавой, у баявым страі, так пачаў сваё выступленне Аляксандр КЯТКОЎ (Кіеў), адзін са старэйшых савецкіх балгарыстаў і перакладчыкаў. Ён падрабязна расказаў пра выданне на Украіне балгарскай антыфашысцкай літаратуры, пачынаючы з твораў пісьменнікаў-эмігрантаў у 20—30-ыя гады да нашых дзён. А. Кяткоў падзяліўся цікавым вопытам супрацоўніцтва і выпускам сумесных літаратурных зборнікаў абласцей Украіны і пабрацімаў-акругоў Балгарыі. Вялікі ўклад ва ўмацаванне ўзаемасувязей уносяць часопіс «Всесвіт», іншыя ўкраінскія часопісы і выдавецтвы. Балгарскі паэт Д. Мятодзіеў адзначаны прэміяй імя Рыльскага за пераклад «Кабзара» Т. Шаўчэнкі, а Д. Паўяычка — такой жа прэміяй за пераклады з Х. Марці, Х. Боцева, Н. Вапцарава.

Выказваючы думку многіх сваіх калег, Сімяон УЛАДЗІМІРАЎ (Балгарыя) падкрэсліў, што сёння беларуская літаратура — гэта ўжо вялікая літаратура не толькі ў кантэксце літаратур савецкіх народаў, але і ў кантэксце сусветнага літаратурнага працэсу. У вас ёсць пісьменнікі, значэнне якіх выходзіць далёка за межы краіны і якімі можа ганарыцца кожная літаратура, дадаў ён. Я звязаны з беларускай літаратурай, працягваў С. Уладзіміраў, не толькі прафесійна, як перакладчык, але перш за ўсё эмацыянальна. Гэтая літаратура хвалюе мяне. Ідэі, якія яна развівае, і вобразы, якія стварае, блізкія мне. Яе глыбокі гуманізм супадае з маімі ўяўленнямі пра чалавечнасць і маральнасць. Гэтыя мае адносіны да беларускай літаратуры не змяніліся з таго часу, як я пераклаў дзве аповесці В. Быкава «Пастка» і «Здрада» да апошняй працы — перакладу аповесці «Золак, убачаны здалёк» Янкі Брыля. Мне, можа быць, пашанцавала, што першым беларускім пісьменнікам, якога я пераклаў, быў В. Быкаў — яго слова вельмі захапіла мяне і далучыла да беларускай літаратуры.

Удзельнікі сустрэчы былі праінфармаваны аб самых апошніх перакладах, зробленых балгарскімі сябрамі. Сярод навінак — «Карнікі» Алеся Адамовіча, «Паляванне на апошняга жураўля» Алеся Жука, «У вайны не жаночы твар» Святланы Алексіевіч. Беларуская літаратура заваявала ў Балгарыі не толькі чытачоў, зазначыў у заключэнне С. Уладзіміраў, але і перакладчыкаў. Таму што ніхто з перакладчыкаў не стане перакладаць нецікавую літаратуру. Сёння ў Балгарыі ёсць добра падрыхтаваныя перакладчыкі беларускай літаратуры, зараз ідзе падрыхтоўка новых кадраў. А гэта значыць, робіць вывад С. Уладзіміраў, наш чытач зможа ў будучым пазнаёміцца з кожным новым цікавым творам, які з'явіцца на беларускай мове.

Ф. Гінеў, Н. Гілевіч, П. Топер, якія старшынствавалі на сустрэчы, у кароткіх заключных выказваннях падвялі вынікі змястоўнай і цікавай гаворкі. Яны адзначылі глыбіню многіх выступленняў, іх грамадзянскае гучанне. Савецкія і балгарскія перакладчыкі сёння адзінадушны ў разуменні свайго прафесійнага і чалавечага абавязку — як мага лепей прапагандаваць антываенную літаратуру і гэтым самым рабіць свой важкі ўклад у справу пашырэння і паглыблення ўзаемасувязей братніх літаратур, у барацьбу за мір і прагрэс на зямлі.

НАШ КАР.

ПРЫНЦЫПОВА, РАШУЧА, НАСТУПАЛЬНА

ПЯЦЬ ІНТЭРВ'Ю НА АДНУ ТЭМУ

ЦЯЖКА пераацаніць значэнне пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па пераадоленні п'янства і алкагалізму». Партыя, даўшы прынцыповую ацэнку гэтай пачварнай з'яве, ставіць пытанне рубам — раз і назаўсёды скончыць са злоўжываннем алкаголем — гэтым небяспечным сацыяльным злом, які наносіць непапраўную шкоду грамадству.

Барацьба з п'янствам і алкагалізмам вялася, вядома, і раней, але вялася па-кампанейску, неэфектыўна, без неабходнай арганізаванасці і паслядоўнасці. Пастаўлена задача ў бліжэйшы час распрацаваць і ажыццявіць комплекс усебакова абгрунтаваных арганізацыйных, адміністрацыйна-прававых і выхаваўчых мер, накіраваных на рашучае ўзмацненне антыалкагольнай барацьбы і павышэнне яе эфектыўнасці.

Якія гэта будуць меры, як будзе арганізавана барацьба з п'янствам — з такім пытаннем карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» звярнуўся да кіраўнікоў шэрагу міністэрстваў і ведамстваў.

М. Я. Саўчанка, міністр аховы здароўя БССР: — П'янства, алкагалізм характарызуюць перш за ўсё як сапыяльную з'яву. Правільна, шкоду грамадству яны наносяць велізарную. Але алкагалізм — яшчэ і сур'ёзная хвароба ў агульнапрынятым значэнні гэтага слова...

Кар.: — Гэта, мабыць, ці не адзіная хвароба ў свеце, якая не выклікае спачування. Мо таму, што ад яе пакутуюць не столькі сам алкаголік (якога ў народзе пагардліва называюць — «алкаш»), колькі яго блізкія, ды і наогул усе, з кім ён сутыкаецца. Гэта, відаць, адзіная катэгорыя хворых, якая не прагне сустрэчы з урачом.

М. Я. Саўчанка: — Сапраўды, так. Я павінен сказаць, што гэта з'яўляецца вялікім тормазам і ў прафілактыцы, і ў лячэнні алкагалізму. Трэба помніць, што чалавек, які сам хоча пазбавіцца гэтай страшнай хваробы — ужо на паўшляху да выздараўлення.

Кар.: — Што ўяўляе сабой сёння наркалагічная служба рэспублікі?

М. Я. Саўчанка: — Дапамогу асобам, якія злоўжываюць спіртным, аказваюць шэсць наркалагічных дыспансераў (пяць абласных і Мінскі гарадскі). Што тычыцца стацыянарнай дапамогі, дык у рэспубліцы функцыянірує 65 наркалагічных аддзяленняў з іх 42 аддзяленні — на прамысловых прадпрыемствах, у будаўнічых арганізацыях і сельскай гаспадарцы. У Брэсце, напрыклад, створаны дзённы наркалагічны стацыянар на 50 месц. Ёсць тут бальніца на 100 ложкаў для лячэння алкаголікаў, хворых на туберкулёз, і аддзяленне для алкаголікаў з псіхічнымі парушэннямі.

Вядзецца падрыхтоўка да адкрыцця двух аддзяленняў для прымусовага лячэння алкаголікаў з дадатковымі пяжкімі захворваннямі (вы ж разумееце, што гарэлка здароўе не ўмацоўвае). Пры ўсіх абласных і Мінскім гарадскім наркалагічным дыспансерах адкрыты кабінеты для падлеткаў. У многіх бальніцах ёсць палаты для стацыянарнага лячэння жанчын і падлеткаў, якія злоўжываюць алкагольнымі напіткамі. Мяркуецца неўзабаве мець адзін наркалагічны дыспансер на кожныя пяць раёнаў. Будзе разгорнута шырокая сетка наркалагічных кабінетаў ананімнага лячэння.

Кар.:—Там нават не пацікавяцца прозвішчам пацыента?

М. Я. Саўчанка: — Так. У кожнага толькі свой шыфр. Справа ў тым, што многія саромеюцца свайго захворвання. Да таго ж, часта «закончаны» алкаголік такім сябе не лічыць...

Кар.: — Калі-небудзь, Мікалай Яўсеевіч, чалавецтва рынайдзе эфектыўны сродак прафілактыкі п'янства, алкагалізму? Напрыклад, як супраць воспы...

М. Я. Саўчанка: — Ну, воспа, іншыя заразлівыя хваробы маюць сваіх узбуджальнікаў. Медыцына навучылася іх нейтралізаваць, абяззбройваць. Алкагалізм, як і ўсякая наркаманія — таксама, вядома, хвароба, але іншага паходжання. Прывіўкай (Мікалай Яўсеевіч усміхаецца) тут не абыдзешся.

Кар.: — Але ж ёсць медыкаментозныя сродкі лячэння алкагалізму, той жа славуты антабус, напрыклад. У пастанове, з якой мы пачалі гаворку, асобным пунктам пазначана стварэнне лекавых сродкаў, неабходных для лячэння хворых на хранічны алкагалізм.

М. Я. Саўчанка: — Ёсць, ёсць лекі супраць алкагалізму. На жаль, яны не вельмі эфектыўныя. Трэба шукаць больш надзейныя сродкі і метады лячэння алкагалізму. У гэтай справе, магчыма, было б мэтазгодным узяць за аснову распрацоўкі аддзялення рэгуляцыі абмену рэчываў АН БССР, дзе даказана існаванне грубых парушэнняў абмену рэчываў у алкаголікаў. Магчыма, трэба актыўна шукаць шляхі карэкцыі гэтых парушэнняў.

Кар.: — Мне ў свой час давялося пісаць пра Светлагорскі ЛПП — лячэбна-працоўны прафілакторый, у якім, па рашэнні суда, знаходзяцца п'яніцы, алкаголікі. Лячылі іх там і гіпнозам. Я прысутнічаў на гіпнатычным сеансе, дзе, як мне растлумачылі, спрабуюць выпрацаваць у хворых устойлівы рэфлекс, калі можна так сказаць, — агідзі да спіртнога. Назіраючы, як пасля ўнушэння гіпнолага «пацыентаў» літаральна выварочвала ад аднаго паху гарэлкі, падумаў — ну, гэтыя ўжо ўратаваны. Помню, я сказаў пра гэта ўрачу, які праводзіў гіпноз, але ён, усміхнуўшыся, адказаў, што, на жаль, значная частка яго пацыентаў пасля вяртання з ЛПП бярэцца за старое...

М. Я. Саўчанка: — Не стае ім волі. А лекаў, якія маюць волю, — няма. Але не трэба забывацца на адну істотную акалічнасць — алкаголікамі не робяцца за адзін дзень — гэтаму папярэднічаюць многія гады злоўжывання спіртным. Як сведчыць статыстыка, пераважная большасць алкаголікаў даведалася пра смак гарэлкі ў юначым узросце.

Кар.: — Цяпер часта можна пачуць, што алкагалізм памаладзеў. Убачыць зараз п'янага падлетка — звычайная з'ява, якая амаль не здзіўляе. Нядаўна адзін знаёмы ўрач расказаў мне пра сям'ю, дзе муж і жонка п'юць не толькі самі, а і прывучаюць да спіртнога трох малалетніх дзяцей. Малодшай, двухгадовай дзяўчынцы, маці дае віно, каб тая хутчэй засынала... Жах, дый толькі.

М. Я. Саўчанка: — Гэта пытанне пытанняў. На ім, на мой погляд, трэба сканцэнтраваць нам, медыкам, галоўную ўвагу. На карту пастаўлена здароўе будучых пакаленняў.

Кар.: — У Арменіі маладым у час рэгістрацыі шлюбу ўручаюць спецыяльную памятку аб небяспецы п'янага зачацця дзіцяці. Яе напісаў вядомы публіцыст, урач па адукацыі Зорый Балаян, і яна карыстаецца вялікай папулярнасцю. У нас, здаецца, такой памяткі няма...

М. Я. Саўчанка: — Так, санітарную асвету трэба рабіць больш дзейснай, прадметнай, зразумелай. Ёсць пэўныя дасягненні ў гэтай справе і ў нас. Але я вярнуся да праблемы дзяцей, што нарадзіліся ў сем'ях п'яніц. Мы правялі параўнаўчае вывучэнне фізічнага і псіхічнага развіцця дзяцей у нармальных і ненармальных з пункту гледжання злоўжывання алкаголем сем'ях. У апошніх анамаліі ў развіцці дзяцей сустракаліся ў сем-восем разоў часцей.

Шкада толькі, што раней усё гэта амаль не вывучалася, не даследавалася. Мы цяпер сутыкаемся ў гэтай справе з поўнай адсутнасцю ўліку і статыстычных дадзеных.

Дагэтуль пры ўзяцці на ўлік цяжарных жанчын пытанне аб ужыванні алкаголю задаецца чыста фармальна. Так, напрыклад, у Мінску на першае мая 1985 года, згодна з дакументальнымі дадзенымі, толькі 0,2 працэнта такіх жанчын ужывалі алкаголь. У 9 з 20 жаночых кансультацый сталіцы іх наогул не выяўлена. Калі б гэта адпавядала рэальнаму становішчу — было б, вядома, вельмі добра. Ды многія аб'ектыўныя факты сведчаць пра адваротнае. Па дадзеных тых жа дзіцячых кансультацый у Мінскай вобласці, напрыклад, 1554 дзіцяці ва ўзросце да двух гадоў выхоўваюцца ў 1168 сем'ях, дзе злоўжываюць алкаголем.

Мы мяркуем унесці ва ўлік цяжарных жанчын істотныя змены — будзе выяўляцца, колькі і як часта яны ўжываюць алкагольныя напіткі. Гэтае пытанне будзе ўдакладняцца і па іншых каналах — па месцы працы і жыхарства. Я лічу супрацьалкагольную антэнатальную абарону дзіцяці самым галоўным з усяго комплексу мер, якія цяпер распрацоўваюцца. Неабходна таксама распрацаваць спецыяльную схему аздараўлення дзяцей, якія нарадзіліся ў сем'ях п'яніц. Вучоныя павінны знайсці шляхі нейтралізацыі ўплыву алкаголю на патомства. Нашу псіхафізічную і наркалагічную службу мы ўжо арыентуем на гэтую работу.

Перад Міністэрствам аховы здароўя СССР мы хадайнічаем аб стварэнні ў рэспубліцы цэнтра псіхічнага здароўя з наркалагічнай дзіцячай накіраванасцю.

М. А. Макаед, міністр гандлю БССР: — У барацьбе супраць п'янства і алкагалізму вялікія задачы стаяць і перад гандлем...

Кар.: — Нягледзячы на тое, што амаль адзіны пастаўшчык спіртнога — той жа магазін, Мікалай Аляксандравіч?

М. А. Макаед: — У продаж спіртных напіткаў, згодна з новай пастановай, унесены істотныя змены. Я ўжо не кажу пра тое, што пачатак продажу гарэлкі і віна перанесены на 14 гадзін, што спіртныя напіткі прадаюцца толькі асобам, якім споўнілася 21 год.

Кар.: — Мне неаднойчы даводзілася быць сведкам канфліктаў паміж прадаўцом і пакупніком, які крыкам даказваў, што яму ўжо 21, а прадавец, не верачы, патрабаваў дакумент...

М. А. Макаед: — У такіх спрэчных выпадках прадавец мае поўнае права адмовіць пакупніку. Але я прадоўжу пералік змен у арганізацыі продажу алкагольных напіткаў. Вы помніце, колькі было нараканняў на тое, што гандлююць моцнымі напіткамі каля заводскіх прахадных, вучэбных устаноў, інтэрнатаў, школ і дзіцячых садоў, месцах адпачынку і г. д. Цяпер продаж гарэлкі і віна тут, як правіла, забаронены. Зменены парадак продажу піва — на вуліцы толькі з 11 гадзін дня, не будзе яно прадавацца ў сталовых.

Адначасова Міністэрства гандлю забараніла гандаль усімі відамі спіртных напіткаў у сталоўках, прадпрыемствах грамадскага харчавання і, перш за ўсё, у маладзёжных, кандытарскіх, малочных кафэ, кафэ-марожаных, піўных барах, блінных, шашлычных і г.д.

У выніку колькасць магазінаў, якія гандлявалі спіртным, зменшылася больш як напалову, а прадпрыемстваў грамадскага харчавання на 60 працэнтаў. Пры гэтым перад гандлёвымі арганізацыямі пастаўлена задача ўжо ў будучым годзе завяршыць пераход на продаж гарэлкі, лікёра-гарэлачных вырабаў, мацаваных пладоваягадных він толькі ў спецыялізаваных магазінах або аддзелах і секцыях.

Кар.: — Усё гэта ўражвае, Мікалай Аляксандравіч, толькі, помніцца, абмежаванні ў гандлі спіртнымі напіткамі ўводзіліся і раней. Але заканчвалася антыалкагольная кампанія, і ўсё вярталася «на круги своя»... Месяцы два назад у «Известиях» было надрукавана пісьмо жыхароў Салігорска, якія скардзіліся на тое, што ў іх горадзе адзін за адным адкрываюцца магазіны па продажу гарэлкі і віна. А вось магазінаў, дзе б прадавалі тавары паўсядзённага попыту, не хапае. Калі яны звярнуліся з такой скаргай да мясцовых улад, ім растлумачылі, што спіртное прадаюць, каб выканаць план таваразвароту...

М. А. Макаед: — Сапраўды, некаторыя выканкомы не без уплыву гандлёвых работнікаў, парушаючы правілы, дазвалялі гандляваць спіртнымі напіткамі нават тым прадпрыемствам, дзе рабіць гэта наогул нельга было. Думаю, такое не паўторыцца. Хоць бы таму ўжо, што колькасць магазінаў і іншых гандлёвых прадпрыемстваў, якім дазваляецца гандляваць гарэлкай і віном, зараз вызначаецца толькі аблвыканкомамі і Мінскім гарвыканкомам. Па-другое, устаноўленыя Указам Вярхоўнага Савета СССР меры матэрыяльнай і крымінальнай адказнасці за парушэнне ўстаноўленых правілаў, думаю, адразу паставяць на месца аматараў выконваць фінансавыя планы за кошт продажу спіртнога.

Кар.: — Не думаю, што знойдуцца людзі, якія, прачытаўшы ваш адказ, не зададуць сабе пытання: «А за кошт чаго будуць кампенсаваны страты і, відаць, немалыя ў таваразвароце?»

М. А. Макаед: — Правільнае пытанне. Я быў бы няшчыры, калі б сказаў, што тут усё проста, няма аніякіх цяжкасцей. Ёсць і нямала. Шукаем шляхі да вырашэння гэтага пытання. Напрыклад, у другім паўгоддзі мяркуецца дадаткова знайсці і рэалізаваць на 93 мільёны рублёў тавараў з дэцэнтралізаваных крыніц. Разам з прамысловымі прадпрыемствамі рэспублікі вырашаем пытанне аб выпуску і рэалізацыі звыш ужо зацверджаных планаў тавараў на 200 мільёнаў рублёў.

Кар.: — Вы маеце на ўвазе павелічэнне продажу прамысловых тавараў. А харчовых? Напрыклад, безалкагольных напіткаў, квасу, марожанага? У вёсцы можна сёння паласавацца марожаным? Думаю, што — не.

М. А. Макаед: — Вы маеце рацыю. Такі нізкі ўзровень задавальнення насельніцтва марожаным, у прыватнасці, тлумачыцца тым, што на прадпрыемствах Міністэрства мяса-малочнай прамысловасці выраб яго з году ў год змяншаецца. Зусім спынены выраб марожанага на малочных заводах Навагрудка, Гродна, Крычава, Рэчыцы, Слуцка, Маладзечна, Полацка і іншых.

Кар.: — Ды там, дзе і ёсць марожанае, выбар яго абмежаваны. Вельмі мала ў нас кафэ-марожаных, малочных кафэ, дзе б можна было выпіць той жа малочны кактэйль. Усюды за ім чарга.

Сумна пра гэта гаварыць, але гаварыць трэба — кожнае застолле, хай у ім удзельнічае хоць два чалавекі, не абыходзіцца без традыцыйнай бутэлькі. Цяжка паламаць традыцыі? Вядома ж, цяжка. Не ваша гэта справа? Вось з гэтым пагадзіцца нельга. Помню, адзін знаёмы з запалам мне даказваў, што на Беларусі, да чаю, скажам, народ непрызвычаены, як, напрыклад, у Сярэдняй Азіі. Да якога чаю? Які ў сталоўцы гатуюць у вялікім катле, які мае пах усяго, толькі не чаю? Дзе яны, сапраўдныя чайныя, каб можна было пасядзець, пагутарыць каля самавара? Колькі іх у рэспубліцы?

М. А. Макаед: — Усяго чатыры. Што і казаць, такога паняцця, як культура чаяпіцця, у нас пакуль што няма. Трэба пагадзіцца, ёсць тут і наша пэўная віна. Разам з тым, у рэспубліцы няблага арганізаваны продаж безалкагольных напіткаў, сокаў, кандытырскіх вырабаў. У краіне мы адны з першых пачалі выносіць гандаль на тратуары, у пад'езды вялікіх дамоў (у Мінску, на-

(Заканчэнне на стар. 13).

КНІГАПІС

В. БЛАКІТ. Шануй імя сваё. Аповесці. Пераклад з беларускай. М., «Молодая гвардия», 1985.

Героі жывуць побач — гэтае вызначэнне ў дачыненні да твораў Валянціна Блакіта набывае асаблівы сэнс. Пісьменнік, як правіла, расказвае пра людзей, з прататыпамі якіх добра знаёмы. І гэта не выпадкова. Працуючы раённым журналістам, у партыйных органах, ён меў магчымасць часта бываць у калгасах і саўгасах, наведваць прадпрыемствы. Асноўныя праблемы, на якіх засяроджвае сваю ўвагу В. Блакіт, праблемы маральна-этычныя. Праз вырашэнне іх робіць выхад і на пытанні сацыяльна-грамадскага плана.

Цікавая ў гэтым сэнсе аповесць «Шануй імя сваё». Здавалася б, старшыня праўлення калгаса Кунцэвіч — чалавек, якому сама час ісці на пенсію. Узрост паважаны, адукацыі адпаведнай не мае. Але хлебаробы мяркуюць інакш. Для іх галоўнае, што чалавек на сваім месцы, любіць зямлю. А гэтага якраз не скажаш пра Сурмілу...

Пільна прыглядаецца пісьменнік да сваіх герояў і ў аповесці «Вяселле ў Бераржках» — творы, які таксама ўзнімае надзённыя праблемы і сярод іх найпершую — адказнасць чалавека за кожны свой учынак, гатоўнасць яго — ці не гатоўнасць — судзіць сябе па самым высокім рахунку ўласнага сумлення.

У прадмове «Вясковыя клопаты» народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў дае высокую ацэнку творчасці В. Блакіта. У прыватнасці, ён зазначае: «У прозе Валянціна Блакіта, акрамя адчувальнага дабротнага ведання жыццёвых канфліктаў, падкупляе выразна абазначаны аналітычны пачатак, аўтарская непрадузятасць да літаратурных персанажаў, калі амаль кожнага з іх аўтар імкнецца паказаць знутры, разабрацца ў дыялектыцы яго характару».

Пераклалі аповесці на рускую мову Т. Залатухіна і Т. Смалянская.

З. СОМАЎ.

М. ПАРАХНЕВІЧ. Калодзеж. Апавяданні, аповесць. На рускай мове. М., «Советский писатель», 1984.

У кнігу Міхася Парахневіча, што выйшла летась у маскоўскім выдавецтве «Советский писатель» на рускай мове, уключаны аповесць «Маленства тваё і маё» і больш за сорак апавяданняў.

Творы беларускага празаіка пераклала Слава Пайна.

Д. МІХАЛЕВІЧ.

З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА *сонечны* ДЗЕНЬ?..

Памятаю, выступаючы на адным з пленумаў Саюза пісьменнікаў БССР, прысвечаных пытанням беларускай дзіцячай літаратуры, Васіль Зуёнак адзначыў: «Беларуская дзіцячая паэзія заўсёды была моцная сваёй народнай асновай, сваімі багатымі фальклорнымі традыцыямі. Выкарыстоўваючы іх, яна і ў апошнія гады асвойвала найноўшыя пласты жыцця і з найбольшым поспехам там, дзе гэта рабілася не па-эпігонску, а творча, са смелым і натхнёным пранікненнем у свет пачуццяў, настрояў, захапленняў сённяшняга малога, — менавіта так: сённяшняга, а не інакш».

Гэтыя думкі былі выказаны, у асноўным, у дачыненні да творчасці нашага прызнанага майстра дзіцячай літаратуры Васіля Віткі, аб вершах, напісаных ім на той час, што ўвайшлі ў яго кніжку «Хто памагае сонцу».

Пасля гэтага ў паэта было яшчэ некалькі зборнікаў, арыгінальных, цікавых, у якіх, як і раней, умела спалучаюцца педагагічная тактоўнасць і густ аўтара, займальнасць, пазнавальнасць — усё тое, што заўсёды па душы юным чытачам.

І вось перада мною — новыя кніжкі, якія выйшлі летась у выдавецтве «Юнацтва», — «Госці», «Казкі і краскі», «Загадка пра зярнятка».

Першая з іх — гэта жаданая, радасная (мне так здаецца!) сустрэча з добрымі сябрамі, крылатымі гасцямі, што захапляюць нас сваімі галасамі, абуджаюць вясну і ў прыродзе, і ў сэрцы. Без гэтых гасцей, без іх песень, наша жыццё, світанкі і надвячоркі, леты і зімы, лясы і лугі, увесь навакольны свет выглядалі б шэрымі, безаблічнымі, маркотнымі, пазбаўленымі радасці захаплення, радасці харастава, радасці пазнання не толькі прыроды, але і саміх сябе.

Хто ж яны, гэтыя госці? Іх перад намі цэлы вырай: сінічкі, гіль, дзятлік, жаўна, крыжадзюб, шчыгол, амялушка, аляпка, сыч і сава, верабей, шпак, гарыхвостка, чыж, дрозд, зязюля, пеначка, драч, фазан, сойка, сарока, ястраб, цяцёрка... І для кожнага са сваіх «гасцей» паэт пастараўся знайсці самыя жывыя, па-народнаму трапныя, прасякнутыя іскрынкамі гумару, характарыстыкі, выразныя фарбы, адценні, рысы.

Гэткім, напрыклад, бачыцца дзятлік:

Часта ён ад дзеда
Чуў, калі падрос:
— Хто б цябе, брат, ведаў,
Каб не доўгі нос.

Няпраўда нялюба,
А ўнучак прывык,
Хоць даўжэй за дзюбу
У яго — язык.

А гэта ўжо — круцігалоўка. Верш, здавалася б, пра звычайную птушачку. Але ж ці толькі пра яе?

Надта ж мянушку
Прыдумалі лоўка:
Назвалі птушку —
Круцігалоўка.

На дзіва ўдалася
З вёрткаю шыяй,
І ў нашым класе
Ёсць такія:
Не ступяць і кроку
Яны без падказкі —
Не ўспомняць урока,
Не раскажуць казкі.

Вухам так і водзяць —
Дзе пачуць бы слоўка,
Як на вербалозе
Круцігалоўка.

Ёсць, вядома, у кніжцы нямала вершаў, у якіх пераважае заалагічна-пазнаваўчая інфармацыя, тая, што дае магчымасць бліжэй пазнаёміцца юным чытачам і слухачам з паводзінамі, звычкамі і норавамі птаства — яго жыццём і таямніцамі. Аднак дзякуючы высокаму майстэрству аўтара зроблена ўсё гэта зусім не інфармацыйна, а з добрым адчуваннем паэзіі, магчымасцей роднага слова. І, як вы змаглі пераканацца на прыведзеных мною прыкладах, найчасцей — з гумарам, з усмешкаю, з зайздросным уменнем заўсёды адчуваць, бачыць перад сабою таго, каму адрасаваны яго радкі.

Хто прыносіць нам вясну,
Сонцам поплаў меціць,
Будзіць поле ада сну? —
Жаваранак, дзеці.

На раллі яшчэ лядок,
Не абсохла глеба,
Вестунок — за званок
І хутчэй у неба.

І звініць, звініць званок
У блакітным свеце.
Кліча нас на свой урок
Жаваранак, дзеці.

Так пад пяром умелага майстра, здавалася б, зусім далёкае ад нашага разумення і ўяўлення, у пэўнай ступені казачна-нерэальнае раптам набывае зусім рэальныя абрысы і высновы, набліжаныя да жыцця дзяцей, да іх побыту, да іх звычак і паводзін.

Прызнаюся шчыра: чытаючы кніжку «Госці», я быў крыху разгублены — што выбраць для прыкладаў, для цытавання? Сорак «гасцей» у ёй, і кожны варты таго, каб успомнілі, назвалі менавіта яго.

Тое ж самае адчуваў, калі знаёміўся і з другою кніжкаю — «Казкі і краскі». Яна — своеасаблівы працяг падарожжа ў цудоўны і непаўторны свет роднай прыроды. Як відаць з самой назвы, размова ў ёй ідзе пра кветкі, пра наш раслінны свет: званочак, дзядоўнік, дрыжнік, піжму, брата-і-сястрыцу, маці-і-мачыху, львіны зеў, кураслеп, зайцаву капусту, лісахвост і г. д. Іх шмат наўкол нас. Іх шмат сустрэнеце і ў кніжцы. І зноў жа — кожная з гэтых раслін, кветак і зёлак па-свойму прыгожая, адметная, непаўторная, прывабная, неабходная.

Паэт з першых жа радкоў уводзіць свайго чытача ў таямнічы і казачны свет роднай прыроды, зачароўвае мелодыкай свайго паэтычнага слова.

З чаго пачынаецца сонечны дзень?
Вядома, што з новае казкі.
Зірніце, ледзь дакрануўся прамень
Лясной серабрыстае краскі —
Зазіхацелі кроплі агню —
Апошнія пацеркі ночы,
І праз настылую цішыню
Выбіўся кволы званочак...

Пазнавальнасць, займальнасць, досціп, усмешка, гумар — і тут усе гэтыя лепшыя якасці Віткавай паэзіі навідавоку. Чытаеш у яго пра жыццё раслін, а бачыш, а ўяўляеш зноў жа болей знаёмыя, болей рэальныя для цябе малюнкі і з'явы:

У кожнага клопат пра свой агарод,
Кожны свае даглядае расліны:
Казёл з казою — Казлабарод,
Свіння — Свінакроп, журавель — Журавіны...

У лапцях хадзілі калісьці ваўкі,
Зараз — у чаравіках,
Але застаўся ўспамін на вяні —
Барвовае Воўчае лыка.

Кветкі людскія імёны бяруць,
Ёсць Васількі, Маргарыткі,
Наша здароўе яны берагуць,
Нашы шануюць здабыткі...

Паэтычны запеў, паэтычны ў самым найлепшым разуменні гэтага слова, зроблены ў пачатку кніжкі, трымаецца ад першага да апошняга радка. Адна казка змяняе другую, і неяк сумна расставацца з імі, загортваць кнігу, чытаць апошнія радкі:

Весела дзённая казка ідзе,
Бае, што бачыць і чуе,
І за сабою сяброўак вядзе —
Вячэрнюю і начную.

Гэтак за днём і мінаецца дзень,
Ночнай змяняецца ночка.
Строга трымаецца ранні прамень
Малога свайго званочка.

Толькі кранецца раніцай ён
Лясной чарадзейнай краскі —
Звоніць сярэбраны тэлефон:
Слухайце, слухайце казкі!

Нярэдка бывае, што пэўная зададзенасць твора забівае ўсё жывое ў ім: і тыя ж самыя займальнасць ды пазнавальнасць, а яшчэ — яскравасць паэтычнай думкі, харастава слова, тое, што так неабходна ў творчасці для дзяцей, асабліва для самых маленькіх. У новых кніжках В. Віткі таксама адчуваецца зададзенасць у выбары тэмы, у яе раскрыцці, асэнсаванні, у паказе таго, што ён захацеў расказаць нам, сваім чытачам, але ў яго гэта набывае жывыя рысы, казачнасць, свежасць успрыняцця, акрыленасць — тыя якасці, тыя знаходкі, якія западаюць у сэрца дзяцей, надоўга запамінаюцца ім. І лішнім доказам, пацвярджэннем гэтаму — «Загадка пра зярнятка».

У гэтай кніжцы В. Віткі ўсяго 60 радкоў. І кожны з іх — да месца, па-свойму важкі, напоўнены сонечнай радасцю пазнання красы роднага поля, усяго навакольнага свету, прасякнуты ўдзячнасцю чалавеку-працаўніку, роснаму коласу, які прыносяць нам на стол хлеб.

І тут мы зноў сустракаемся з казкаю.

...Прачнулася вясною зярнятка. За ім — другое, трэцяе. Усе астатнія браты-зярняткі. «І ўжо кожны набірае і да сонца падымае жменю залатых зярнятак». І гэтак непрыкметна руплівыя «браты-умельцы па зярнятку і па жменьцы гэтулькі сабралі збожжа, што падняць ніхто не можа...»

І далей:

Вунь вясёлка прабавала,
Мабыць, сем разоў не меней
Той набытак небывалы
Зважыць на сваім бязмене.
Пастаяла над зямлёю,
Бачыць, марна траціць сілу,
І, сагнуўшыся дугою,
Ледзьве злезла з небасхілу.

Потым узважыць нязжаты ўраджай «падхапіліся заўзята» аж сем вясёлак. Аднак і іх напаткала няўдача: не пад сілу ім аказваецца такі багаты ўраджай, «бо і сейбіт і араты працавалі не на жарты».

Хто ж зможа зрабіць гэта, справіцца з такою задачай? Аўтар у канцы сваёй загадкі адказвае коратка, адным словам, але зразумелым, даступным кожнаму дзіцяці: чалавек-хлебароб, яго ўмелым працавітым рукам усё пад сілу.

Няма ў гэтай кніжцы празмернай рыторыкі, узнёсласці, голай публіцыстычнасці, з дапамогаю якіх часам імкнуцца аўтары намаляваць вобраз чалавека-працаўніка, а ёсць другое, надзвычай істотнае, красамоўнае, неабходнае, — мяккі лірызм, сапраўдная паэзія. Я ўпэўнены: хлопчык ці дзяўчынка, убачыўшы ўлетку вясёлку над ніваю, адразу прыгадаюць радкі, уявяць малюнак — вясёлка ўзважвае ўраджай, што спее на палетку. Вобраз, знойдзены паэтам, запомніцца ім, а, значыць, запомніцца і сама кніжка. І ці толькі гэтая?!

Мікола ЧАРНЯЎСКІ.

В. Вітка. Госці. Вершы, Мінск, «Юнацтва», 1984.

В. Вітка. Казкі і краскі. Вершы. Мінск, «Юнацтва», 1984.

В. Вітка. Загадка пра зярнятка. Верш. Мінск, «Юнацтва», 1984.

ПРА НЯСВІЖЧЫНУ І ЯЕ ЛЮДЗЕЙ

Міхаіл Васільевіч Салянік — старшыня вядомага далёка за межамі Нясвіжскага раёна калгаса «Дружба», Герой Сацыялістычнай Працы. Аб ім расказвае ў нарысе «Бацькоўскі парог» журналіст Мікола Дзелянкоўскі. Аўтар не адзін год жыў у Нясвіжы, працаваў уласным карэспандэнтам абласной газеты «Мінская праўда», таму меў магчымасць неаднаразова сустракацца і гутарыць з М. Салянікам, няблага ведае пра справы гаспадаркі, якую ён узначальвае.

Нарыс пра М. Саляніка даў назву кніжцы М. Дзелянкоўскага, якая стала чарговым выпускам бібліятэчкі газеты «Голас Радзімы». З'яўленне гэтага зборніка невыпадковае. Нашы суайчыннікі за мяжой у пісьмах у рэдакцыю часта пытаюцца, як жывуць людзі ў родных ім мясцінах. Вырашана было спачатку расказаць пра Нясвіжчыну, а таксама пра сам Нясвіж—адзін з самых старажытных і прыгожых гарадоў Беларусі, у якім шмат гістарычных помнікаў.

Стаўшы своеасаблівым гідам, М. Дзелянкоўскі пабудаваў кніжку так, каб кожны з нарысаў ахапіў нейкі аспект жыцця гэтага кутка Беларусі. У першым «Старажытны і малады» гаворыцца пра ўчарашняе і сённяшняе горада. Знаёмячыся з другім нарысам «Пошук», чытачы змогуць завітаць у нясвіжскую сярэднюю школу № 3, дзе створаны музей мастацтваў. У наступных нарысах расказваецца пра Ланьскі мужчынскі хор («Каля вытокаў трох рэк»), вядомага беларускага мастака Міхася Сеўрука («Як раса на ландышы»), паэта-франтавіка Паўлюка Пранузу, які жыве ў Нясвіжы («На ветры жыццёвым»»), балгарына Івана Волкава, які знайшоў на Нясвіжчыне другую радзіму («Стаў сынам Беларусі»)...

Г. ЛОСЕЎ.

ПРА САМАЕ ДАРАГОЕ

Іван Кірэйчык — натура рамантычная, скажу больш, ён паэт, нават калі б і не выдаў два зборнікі вершаў, і гэтая шчаслівая для журналіста акалічнасць не магла не адбіцца на кнізе яго нарысаў «Калінавая квецень». І, мусіць, варта адразу ж адзначыць, што спроба сказаць сваё адметнае слова ў жанры аператыўным знайшла пэўнае разуменне і тых, хто рыхтаваў кніжку да друку, і, безумоўна, удзячных чытачоў. Большасць нарысаў вытрымана ў добрых традыцыях сучаснай беларускай нарысістыкі. Аўтар любіць тых, пра каго піша, амаль кожная старонка яго зборніка прасякнута шчырай сардэчнасцю і замілаванасцю да родных мясцін. Вось услухайцеся: «Пачатак мая. Цэлымі днямі сонца купаецца ў бяздонным і бяскрайнім хваёвым моры, і плавіцца, сцякаючы па кары, сасновая смолка; з брудных пасля зімы і запыленых галінак на дзічках і вербніку, яшчэ не ўмытых веснімі дажджамі, праклёўваецца і выглядае на свет кончыкамі вушак надзіва чыстае, жаданае лісцё; водарна духменіць вільгаццю набраклая зямля, п'янкой шчымлівасцю вярэдзячы сялянскія душы». Або: «...Ноч. Цёмна, хоць на ваўка сунься. І парна, і пахка, як у свежай капе сена... То ўсплёск качынага крыла ў пойме паводкай затопленай Цны, то блазенскі выкрык пугача...» Такія малюнкі здольны, на мой погляд, перадаць словамі чалавек, улюбёны ў родны край. Прафесійны ж узровень аўтара таксама не выклікае ніякіх сумненняў, бо, напрыклад, тая ж пейзажная замалёўка, якая б зрабіла гонар і празаічнаму твору, выкарыстоўваецца эканомна, умела, не засланяе галоўнага прадмета даследавання — чалавека.

У кожным з шаснаццаці нарысаў, змешчаных у кніжцы, аўтар з поспехам спрабуе пераканаць нас, што навокал, у жыцці, вельмі многа добрых людзей, сапраўдных гаспадароў зямлі, што трэба гаварыць менавіта аб кожным з іх, а не вышукваць нейкія экстравагантныя тыпы і адмоўныя з'явы, хоць яны і маюць месца ў жыцці і іх не варта замоўчваць...

Можна вітаць аўтарава імкненне бачыць толькі станоўчае ў нашай рэчаіснасці, цікавасць да станоўчага героя. Гэтым І. Кірэйчык як бы засцерагаецца ад выпадковага ў жыцці, шэрага і павярхоўнага.

Безумоўна, нарыс «Калінавая квецень», вынесены ў загаловак зборніка, адзін з лепшых. У рукі аўтара трапляе цікавы дакумент — агульны сшытак у чырвонай вокладцы. На тытульнай старонцы — загаловак: «Барацьба працоўных Ганцавіцкага раёна за Савецкую ўладу ў 1917—1920 гадах». З гэтага часу дыпломная работа настаўніка Люсінскай сярэдняй школы Мікалая Кляўца становіцца для нас своеасаблівым краязнаўчым даведнікам... Разам з аўтарам мы адчуем шчымлівае жаданне прайсці пешкі па таямнічых сцежках партызан-целяшоўцаў, сустрэцца са старажыламі, якія добра ведаюць Кірылу Арлоўскага, Івана Заньку, Піліпа Цялушку, Сымона Сенюковіча... А хто не ведае коласаўскае Цельшына — сённяшняе Люсіна, школу, у якой пясняр настаўнічаў і якая носіць яго імя?

Палымянае слова паэта надавала сілы падпольшчыкам, клікала народ на паўстанне супраць нямецкіх і белапольскіх акупантаў. І ўспамінаюцца сёння Івану Піліпавічу Варвашэвічу, паплечніку Кірылы Арлоўскага і Піліпа Цялушкі, палымнеючыя сцягі на святочных веснавых бярозах, радасныя твары сяброў па зброі Юзіка Крупеніча, Майсея і Юзіка Жалезных, Максіма Занькі, і не раз і не два папросіцца ўсмешка на вусны, калі ўспомняцца разгубленыя паліцэйскія...

Колер Першамая высвечвае Івану Піліпавічу даспелая каліна, — вобраз яе ў кнізе сімвалічны, ён чырвонай нітачкай праходзіць праз усе нарысы, аб'ядноўваючы матэрыял у адно цэлае і выяўляючы пазіцыю аўтара.

Іван Кірэйчык не ўяўляе, як гэта можна пражыць месяц ці нават тыдзень без дарогі... «Вітаю спадарожную!» — назва ўступнага раздзельчыка, з якога пачынаецца нарыс «Добрай долі, Стадолічы!», — заключае ў сабе нейкі праграмны для аўтара змест. Так, на спадарожнай машыне, якую ён «пачціва вітае на дарогах», бо яна «прывабна чаруе нязнанасцю сустрэч за далячынямі, а тыя далячыні сваёй загадкавасцю», нашы маршруты пралягуць у розныя куточкі Ганцавіцкага і Лельчыцкага раёнаў: на Дзікае возера, у гаспадарку егера Лабовіча, які робіць усё магчымае, каб лебедзі не мінералі возера, а прыжыліся тут, а таксама ў вярхоўе Цны да лесніка Мацея, які бескампрамісна лічыць, «што самавольшчыку ў лесе няма чаго рабіць», які добра ведае, што калі «адзін разок пашкадуеш дрэва — яно цябе ўвесь свой век шкадаваць будзе». Таксама наведаем самадзейных артыстаў з вёскі Глушкавічы, якія добра спеліся з украінскімі суседзямі.

Аднак вернемся да нарыса «Добрай долі, Стадолічы!», у якім аўтар паспрабаваў даць сацыяльны і эканамічны партрэт сучаснай вёскі. На жаль, партрэта пакуль што не атрымалася. І ў гэтай сувязі хацелася б звярнуць увагу на стан сучаснай беларускай нарысістыкі, якая як бы крыху... адстала ад тых з'яў і перамен, якія адбываюцца сёння ў вёсцы, і хоць быццам бы ўжо і пакінула ранейшыя пазіцыі, але не замацавалася на новых. А замацоўвацца трэба самастойна, не азіраючыся па звычцы на рускіх публіцыстаў, у лепшых з якіх сёння, канечне, можна шмат карыснага пераняць.

Сапраўды, мы жывём у такі час, калі ўжо недастаткова ў мажорным стылі праспяваць заздраўную Стадолічам, зрабіць пералік імёнаў, якія заслугоўваюць пашаны, і, палічыўшы, што ўсе праблемы ўсё роўна не вырашыць на паперы (галоўнае — было б усё прыстойна!), з пачуццём выкананага абавязку паставіць кропку. Не, не заслугоўвае таксама іранічнай усмешкі і жаўрук над веснім полем, як гэта лічыць сёйтой сталічны журналіст, які ўжо, бачыце, вырас настолькі, каб «правінцыялізм» ігнараваць. Не варта кідацца з адной крайнасці ў другую. Відавочна адно: жыццё з усёй рашучасцю запатрабавала ад нарысістаў павярнуцца да праблем сяла, але зірнуць на гэтыя праблемы, наогул на вёску з пункту гледжання галоўнага яе прызначэння — быць вытворцам сельскагаспадарчай прадукцыі. Бо навошта нам замоўчваць: вёска ў нашых нарысах, якія вельмі блізка стаяць да «вясковай прозы», была ўсё-такі больш месцам жыхарства, чым месцам вытворчасці. І герояў мы бачылі больш у іхнім доме, у коле сям'і ці сяброў, у лесе, на рацэ, у вясельным застоллі... А вось як яны працуюць на палях і фермах, аруць, сеюць жнуць — усё, што завецца тэхналагічным працэсам, заставалася як бы за кадрам...

Між тым, Юрый Чарнічэнка не дзеля прыгожага слоўца прыводзіць у сваім «Нарысе пра нарыс» словы вядомага аграхіміка мінулага стагоддзя Энгельгардта: «Папярэджваю, што рашуча ні аб чым іншым ні думаць, ні гаварыць, ні пісаць не магу як аб гаспадарцы. Усе мае інтарэсы, усе інтарэсы людзей, з якімі я штогод сустракаюся, засяроджаны на дрывах, хлебе, жывёле, угнаеннях... Нам ні да чаго іншага справы няма». Катэгарычна? Так. Але ж і надзённа. Я б сказаў, вельмі своечасова.

Калі ж зноў звярнуцца да нарысаў І. Кірэйчыка, то не трэба прафесійнага падыходу, каб адчуць і зразумець, што ў кожным з іх адчуваецца ўпэўненая рука газетчыка. З аднаго боку, гэта і няблага: уменне знайсці сваю тэму, выйсці на праблему і сканцэнтраваць на ёй увагу, адабраць з мноства фактаў галоўнае, неабходнае і нарэшце аператыўна падаць матэрыял чытачу — гэта яшчэ нікому не шкодзіла. Але ж з другога боку... Кірэйчыку яўна пакуль што не хапае дыхання на мастацкі нарыс, у якім важна не толькі назваць праблему, але і прааналізаваць яе, не толькі звярнуць увагу на тую ці іншую з'яву жыцця, але і даследаваць яе ў розных аспектах: сацыяльным, эканамічным і маральным...

Алесь Боб, парторг саўгаса імя Якуба Коласа, так расстаўляе акцэнты: «Багацеем надоямі, ураджаем, зямлёй. Сам прыкінь: апошнім часам адных асушаных тарфянікаў — як з неба яны нам зваліліся — ледзь не дзве тысячы гектараў займелі. Значыць, павінны багацець і духоўна (? — **У. Г.**). Я гэта к чаму? Ліпскі (старшыня. — **У. Г.**), сам жа чуў, падколваў мяне мазалямі. А я стаю на сваім! Узяць хоць тыя ж тарфянікі. Не, у белых пальчатках да іх не падступішся. А яшчэ з розумам падступацца трэба, бо без галавы (? — **У. Г.**) ой як дроў наламаць з імі можна. Хаця ж дзе-нідзе і наламалі ўжо. Ды што далёка хадзіць! Во, на Уборці нашай даўней трохпудовыя самы вадзіліся, а цяпер, бедная, так абмялела, што і печкуроў вароны палавілі...»

Знаёмыя скаргі, ці не так? Сто раз чутыя. На ўсіх узроўнях. Ды яны ўжо набілі аскоміну. А што канкрэтна робіцца ці плануецца рабіць, каб неяк выправіць становішча ў саўгасе з тымі малымі рэчкамі, з тымі ж тарфянікамі?.. На жаль, нічога аб гэтым не сказана, нават не запланавана было аўтарам сказаць.

Закрываць вочы на нашы хібы і пралікі сёння ані ў якім разе нельга, аб гэтым якраз і гаварыў на нядаўняй сустрэчы з ленінградскім партактывам Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў. Калі крытыкуеш—прапаноўвай, як хутчэй пазбавіцца таго ці іншага недахопу.

«Кніга адзначана паэзіяй і светлай любоўю да людзей і зямлі», — гаворыцца ў кароткай анатацыі да зборніка Івана Кірэйчыка. І сапраўды гэта так.

Уладзімір ГЛУШАКОЎ.

1. Кірэйчык. Калінавая квецень. Нарысы. «Рэспубліка. Час. Людзі». Мінск, «Мастацкая літаратура», 1984.

ДАСЛЕДУЮЦЦА ГРУЗІНСКА-БЕЛАРУСКІЯ СУВЯЗІ

Гісторыя грузінска-беларускіх культурных сувязей сягае ў глыбокую даўніну, у эпоху Кіеўскай Русі, часы Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага. Аднак толькі ў савецкі час яны набылі пастаянны характар, сістэмнасць, мэтанакіраванасць. У савецкі час, асабліва ў пасляваенны перыяд, пачалося і іх навуковае даследаванне. І вядучую ролю тут адыгрываюць, несумненна, грузінскія літаратуразнаўцы. У доказ гэтага можна назваць хоць бы дзве салідныя працы: «З гісторыі грузінска-беларускіх літаратурных узаемаадносін» (Тбілісі, 1973) К. Кванчатырадзе і «Грузіна-беларускія літаратурныя ўзаемасувязі» (Тбілісі, 1979) С. Кекялідзе. А зусім нядаўна ў сценах Тбіліскага дзяржаўнага універсітэта ў якасці кандыдацкай дысертацыі было абаронена даследаванне Наны Гапрындашвілі «Грузінска-беларускія літаратурныя ўзаемасувязі 60-х —пачатку 80-х гг.» (навуковы кіраўнік — прафесар А. Баканідзе).

У сваёй дысертацыі Н. Гапрындашвілі даследуе тэматычнае ўзаемаўзбагачэнне грузінскай і беларускай літаратур за апошнюю чвэрць нашага стагоддзя, асаблівасці ўспрымання грузінскай літаратуры на Беларусі і беларускай — у Грузіі, шмат увагі аддае аналізу грузінска-беларускага мастацкага ўзаемаперакладу. Даследчык спыняецца на раманах Д. Квіцарыдзе «Бывайце, дрымучыя лясы», «Помнікі зямлю не абцяжарваюць», яго шматлікіх апавяданнях, дзеянне якіх адбываецца на акупіраванай фашыстамі Беларусі. У полі зроку дысертанта і іншыя творы грузінскай літаратуры з беларускай тэматыкай: аповесць Аляксандра Каландадзе «Дні ў Брэсцкай крэпасці», навела Р. Мішвеладзе «Цырульнік», вершы Анны Каландадзе і Д. Івардава, вершаваны цыкл Х. Берулава «Хвалі Нёмана» і інш. Што датычыцца грузінскіх матываў у сучаснай беларускай літаратуры, дык аўтар даследавання знаходзіць іх у паэзіі П. Броўкі, А. Астрэйкі, П. Прыходзькі, М. Калачынскага, А. Лойкі, Н. Тулупавай, В. Макарэвіча, В. Яраца, у творчасці В. Быкава (аповесць «Здрада»), В. Карамазава (апавяданне «Пажоўклае лісце восені») і Т. Цулукідзе (творы для дзяцей).

Н. Гапрындашвілі значную ўвагу ўдзяляе аналізу перакладаў грузінскай літаратуры на беларускую мову — эпапеі Шата Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры», зборнікаў вершаў М. Гелавані «Клятва» і Х. Берулава «Пісьмы надзей», кнігі апавяданняў грузінскіх савецкіх пісьменнікаў «Горны вадаспад». Тут даследчыцы значную дапамогу аказвае добрае веданне беларускай мовы.

Прадметам даследавання сталі і асобныя выданні беларускай літаратуры на грузінскай мове апошняга часу — зборнікі «Беларускія апавяданні», «Беларуская савецкая паэзія», «Беларускія савецкія паэты», аповесці В. Быкава «Сотнікаў» і «Дажыць да світання», раманы І. Мележа «Подых навальніцы» і П. Броўкі «Калі зліваюцца рэкі».

Афіцыйныя апаненты прафесар Р. Мішвеладзе і дацэнт В. Рагойша, а таксама дактары філалагічных навук П. Дзюбайла і М. Мушынскі, якія выступілі на абароне дысертацыі, далі высокую ацэнку працы Н. Гапрындашвілі.

В. КАЧАНОВІЧ.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

ЧАСАМ на самоце, бывае, пачую ягоны голас, спакойны, напеўны, — так шчыра і выразна лепіцца, акругляючыся, кожнае слова:

**У нас было шмат
для гаворкі прычын:
Над садам вясна
рассыпала пялёсткі,
Чарэмшынай пахкай
цвіла далячынь,
Заходзіла сонца
ў ружовых усплёсках.**

Быццам толькі табе, седзячы побач, чытае паэт, а голас — дзіва дзіўнае! — даходзіць здалёк, аж з даваеннага часу, калі гучаў ён з трыбуны ў актавай зале педінстытута. Мы тады захапляліся вясёлай, адкрыта-сардэчнай Глебкавай кніжкай «Чатыры вятры».

Яшчэ адна згадка з нагоды, што паэзія не памірае. Верш «Канкордыя» — вынік дыпламатычнай місіі за мяжой. Выдатны, быццам нядаўна напісаны, верш пра сённяшні неспакойны, трывожны свет, калі лямантна каркаюць з Белага дома, віхтаючыся, як цыркачы на каркаломным канаце: у адной руцэ евангелле, у другой — тэрмаядзерная свечка.

У гэтым вершы глыбокая чалавечнасць і вельмі ж шчымлівая разнасцежанасць душы. Ноч у Парыжы. Канкордыя — маўклівая плошча. «Стаю і думаю, чаму ж на свеце, калі ўсе бесклапотна гэтак спяць, не спяць малыя дзеці?» Паэт чуе плач дзяцей. Адкуль? З далёкага В'етнама? Ці з Лаоса?

**Укрый мяне
ад смерці і бяды,
Укрый ад страху, мама...**

Душа дзіцяці — душа прарока — трывожыцца, што недзе ходзіць страшная вайна, і ходзіць непадалёк.

**Канкордыя!
Багіня добрых спраў!
Багіня згоды
старажытных рымлян,
Чаму ж маўчыш?
Чаго чакаеш ты?
Пакуль вайна бліжэй
не грымне?**

Ен заўсёды быў такі — адкрыты, спагадлівы, чулы. Да вайны, помню, сустрэліся на сцежцы ў блакітным ільне. Адзін на адзін сустрэліся ўпершыню, сышоўшы з цягніка на станцыі Бабёр. Я адразу пазнаў яго, павітаўся.

— А куды вы, даруйце...

— У камандзіроўку. Нарыс буду пісаць.

— І я па нарыс. Для «Звязды».

— Ну, тады адна дарожанька.

Габардзінавы макінтош. Светлы фетравы капялюш. Лёгкая хада. Уважлівасць і далікатнасць.

Мы спыніліся на мосце каля млына. Белачубыя, апаленыя сонцам хлопчыкі вудзілі рыбу. Пятро Фёдаравіч уздыхнуў і, калі падаліся далей, загаварыў пра рэчку свайго маленства. Завецца яна Усой, кіламетраў праз дваццаць — трыццаць ад вёскі ўпадае ў Нёман — зімою коўзаліся на лядзянках, вясною глядзелі, як гоняць плыты, а летам купаліся і рыбачылі.

— На жаль, вольнага часу ў тыя гады было небагата. Ужо з самых малых гадоў станавіліся пастушкамі, затым баранавалокамі, а потым аратымі і касцамі. Гэты шлях прайшоў і я...

Як ляціш ты, няўмольны, непадуладны час! У пацьдзесят пятым святкавалася пяцідзесядзігоддзе Пятра Глебкі. У тэатры імя Янкі Купалы я чытаў даклад. Пасля ўрачыстага вечара Якуб Колас пацісну ў руку, хітра пазіраючы на юбіляра:

— А прамоўца, трэба сказаць, хват. Хапіў такія цытаты,. што куды ні глянеш, дык Глебка класік, — патрыярх на хвіліну задумаўся, шукаючы ў глыбіні душы патрэбныя словы: — Прастата, свежасць, шчырасць — лепшыя якасці твайго таленту, Петрусёк. Са-

Да 80-годдзя з дня нараджэння Пятра ГЛЕБКІ

ХАРАСТВО ЖЫЦЦЯ І СЛОВА

праўднае хваляванне не патрабуе ўпрыгожвання, яно ідзе ад душы, і ў гэтым сіла паэзіі...

Паэзія, як і кожнае мастацтва, павінна караніцца ў народных нетрах. У Пятра Глебкі на пачатку шляху — і праца ў полі, і перапіска з арміяй ад імя добрай палавіны вёскі (паводле старога пісьмоўніка), і «дырэктарства» ў першай камуне — вучыў грамаце парабчанскіх дзяцей, а потым сакратарства ў сельсавеце. «Яшчэ ў 1918 годзе я запісаў ад нашага вясковага настаўніка некалькі беларускіх вершаў, сярод якіх, як пасля высветлілася, было і пару вершаў Я. Купалы. Затым мне трапіліся «Песні-жальбы» і зборнік апавяданняў (здаецца, «Родныя з'явы») Я. Коласа і «Шляхам жыцця» Я. Купалы. Спачатку я быў здзіўлены тым, што, аказваецца, кнігі пішуць і на той мове, на якой гавораць у нас у вёсцы, а затым быў ашаломлены хараством і блізкімі, роднымі мне вобразамі гэтых кніг. Я чытаў іх па некалькі разоў — чытаў сам сабе, чытаў сваім дамашнім, чытаў суседзям...»

У 1927 годзе, калі Пятро Глебка вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта, была выдадзена яго першая кніжка «Шыпшына». У ёй сабраны юнацкія вершы пра вёску, камсамол, «правады ў саломе». Гэта зборнік лірыкі. Багата ў ім твораў пра цяжкія замужаныя лясы, палеткі, прысады, дзе юнак збірае ў «пасаг Беларусі залатую пад клёнамі россып». Праз квяцістыя, часам сузіральныя радкі прабіваўся жывы голас, сведчачы пра тое, што малады паэт задумваўся наконт кірунку творчага шляху і правільна вызначаў гэты шлях. Помніцца верш пра яблыню, якая вясной, наліваючыся крамяным сокам, строіцца ў зялёныя шаты:

А не збярэ яна апалых лісцяў,
Не зацвіце ў старых пялёстках зноў,
Бо толькі зоры — тыл, што й калісьці,
Ды неба сінь з дымкамі аблакоў.

Як маладзік, навокал гляну вокам —
Я разгадаць наступны дзень прыйшоў:
Гадае той аб прышласці далёкай,
Хто верыць у сучаснае душой.

Паэт жыў жаданнем сустрэць новую радасць, бо «быльняговыя межы агорклі», прагнуў пабачыць зямлю без палосак і межаў. Народныя песняры, майстры мастацкага слова спагадна, уважліва ставіліся да выхавання маладой змены. Цікавы адзін прыпамін Пятра Глебкі аб адной яго размове з Янкам Купалам. Ён падзяліўся з Іванам Дамінікавічам сваімі ўражаннямі ад толькі што прачытаных паэм у прозе С. Пшыбышэўскага. Купала параіў яму чытаць не паэмы, а прозу або драмы Пшыбышэўскага, згадаўшы словы Пляханава пра сімвалістаў: «Сімвалізм — гэта нешта накшталт пасведчання аб беднасці». Затым народны паэт, разважаючы аб рамантызме, разгарнуў том Бялінскага: «Рамантызм, без жывой повязі і жывога дачынення да іншых праяў жыцця ёсць найвялікшая аднабаковасць» — і яшчэ дадаў: галоўнае — сувязь з жыццём.

Актыўны дзейсны ўдзел у жыцці жывіў паэзію Глебкі ў віхурныя гады разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва і ўсталявання калгаснага ладу. Пашырэлі далягляды паэзіі, акрылялася, набывала гарт слова, прасякнутае грамадзянскім пафасам:

І скрозь —
На ўсіх пясках пустыні,
На стромах рэк,
На скалах гор —
Паўсталі крэпасці ў краіне:
Турксіб,
Кузнецк,
Магнітагорск.
І гэтай велічы не зрушыць
Ні вораг злы,
Ні люты час:
Мы палажылі ў сцены дужасць,
Якой валодае наш клас.

1928—1933 — гады напружанай працы, набору вышыні. За гэты час Пятро Глебка надрукаваў дванаццаць паэм: «Матчыны казкі», «У дарогу», «Трывожны сігнал», «Хада падзей», «Арка над акіянам», «Арлянка», «Эма», «Ноч у вайсковых лагерах», «Дваццаты год», «Апошняя стрэча», «Карменсіта», «Кара». Апрача паэм, выдадзены зборнік вершаў «Урачыстыя дні» і кніга нарысаў «Ураджай», напісаная сумесна з Петрусём Броўкам.

А мае маладыя равеснікі —
Я пазнаў —
Не скупыя на сэрцы,
І яны завалодаюць песнямі,
Недаступнымі нават і смерці, —

прызнаўся паэт у паэме «Карменсіта».

У творах Глебкі загучала тэма мужнасці народа. «Трывожны сігнал», «Ноч у вайсковых лагерах», «Дваццаты год», «Арлянка» — песні пра герояў грамадзянскай вайны. Паэма «Кара» прысвечана памяці члена ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі таварыша Рэдыка. Камісары і чырвонаармейцы, вязні Лукішак, пагранічнікі і чэкісты паўстаюць перад намі як жывыя з усхваляваных, імклівых і суровых, як той час, радкоў, сагрэтых подыхам вясны і рэвалюцыі.

Дзе ж тут занізі
вашай рамантыкі кволай,
Дзе ж тут ваш,
маладая,
шалёны алюр?!
Мы на нервах сваіх
перавешалі сволач,
У каторай забралі
ваду і зямлю.
І здабытні свае
баранілі не крыкам:
Калі нуль не было
і клінок быў тупы —
Пад варожымі кулямі
клаліся крыжам,
А ніхто не хацеў
і не мог адступіць.

Яскрава бачны традыцыі Маякоўскага, калі чытаеш даваенныя творы Глебкі, асабліва паэмы «У тыя дні» і «Мужнасць». Яны з'яўляюцца першай і трэцяй часткамі задуманай трылогіі. Адна з іх прысвечана векапомным дням Кастрычніцкай рэвалюцыі, другая — памяці Леніна. Усім вядомыя цудоўныя паэтычныя помнікі эпохі — «Уладзімір Ільіч Ленін» і «Добра!». Пятро Глебка напісаў свае рэчы пазней за Маякоўскага, але, не паўтараючы вялікага папярэдніка, знайшоў цікавыя паэтычныя сродкі для вырашэння гэтых грандыёзных тэм. «Патрэбен незвычайны талент, смелая думка, непадробленае пачуццё, каб справіцца з такой адказнай і складанай задачай, — адзначаў Якуб Колас. — З-пад яго пяра выйшлі натхнёныя карціны, якія будуць доўга жыць у мастацтве».

Разнастайнасць, гібкасць рытму, дакладнасць і свежасць рыфмы, шырыня ахопу падзей — усім гэтым вызначаецца паэма пра тыя дні, калі «мы вельмі мала мелі: вінтоўку, шаблю, кулямёт ды шэрыя шынелі». Суровая аповесць аб рэвалюцыйным народзе, правадырах рэвалюцыі, славе Кастрычніка.

У другой частцы паэмы «Мужнасць» паэт звяртаецца да мужнасці класа, каб яна дала яму слова наймоцнага гарту:

Падымі мяне,
Мужнасць класа.
Над галовамі паўшых ніц,
Правядзі над імклівым часам,
Над палётам планет і зарніц.

Драматычная паэма «Над Бярозай-ракой» — рэч зусім іншага ладу паводле свайго жанру. Гераічная драма. Герой яе — народ, што ўзняўся на барацьбу з акупантамі. Яскравыя ў драме народныя характары, з любасцю вылеплены вобраз вернага ленінца Сярго Арджанікідзе. Чытач і глядач захапляліся багаццем мовы, добрым глебкаўскім вершам.

Перад вайной Пятро Глебка напісаў верш «Прысяга». Прысяга воіна і паэта. Здарылася так, што пераклад верша на рускую мову змясціла газета «Красноармейская правда» ў першы дзень вайны. У тым навальнічным чэрвені гэта быў першы ваенны твор у савецкай паэзіі.

І я сваю прысягу
Ніколі не парушу:
Калі і мёртвы лягу
Прыкрыю целам сушу.

У час Вялікай Айчыннай вайны паэт працаваў спачатку на Заходнім фронце ў рэдакцыі газеты «За Савецкую Беларусь», затым на Калінінскім фронце ў рэдакцыі «За свабодную Беларусь». Рэдакцыйны калектыў узначальваў Ілья Гурскі. У склад яго ўваходзілі Пімен Панчанка і Алесь Кучар. «Я лічу, што франтавыя вершы Пятра Глебкі — адна з ярчэйшых старонак яго творчасці, — згадвае Пімен Панчанка. — Зрэдку выпадала зацішная гадзіна. Тады мы з Пятром ішлі ў бліжэйшы лясок, ляжалі на траве і ўспаміналі родную зямлю, перабіралі імёны знаёмых людзей, назвы гарадоў і вёсак, дзе мы бывалі, назвы траў, кветак, птушак. Аднойчы мы панапісвалі на кавалачках паперы словы «кнігаўка», «зязюля», «салавей», «дрозд», «журавель» і іншыя. Скінулі ўсё ў пілотку і дамовіліся: якую хто птушку выцягне — пра тое і верш напіша. Неадкладна, на лясной палянцы. Пятру дастаўся салавей, мне — зязюля. Так з'явіліся вершы «Аб чым спяваюць салаўі...» і «Ты скажы мне, зязюля...»

Есць у паэта верш пра трактарыстку, і мы яго адразу пазнаём між сотні іншых вершаў на гэтую тэму, бо ў Глебкі трактарыстка — жывая (чытаючы, здаецца, блізкая табе) дзяўчына, у якой «нават ямачкі на шчоках поўны радаснага смеху». І калі яна, вяртаючыся дахаты, узбягае на ганак, без яе «ранак праменісты адразу смутнее».

Паэт прайшоў няпросты шлях, удасканальваючы майстэрства, гартуючы сваё слова. У гэтым сэнсе паказальны верш «Радасць», верш, на першы погляд, пейзажны, лісток асенняй лірыкі. Мы ведаем першую кнігу «Шыпшына», помнім: «збіраю ў пасаг Беларусі залатую пад клёнамі россып». Але як жа рознятца гэтыя вершы! Там, у «Шыпшыне», — умоўнасць, сузіральнасць, тут — жыццё, роздум, сталасць думкі.

Вядомы паэт, акадэмік, значны вучоны-лінгвіст, Пятро Глебка быў жыццялюбам, харошым чалавекам, верным таварышам. З ім лёгка і мудра чулася і ў далёкай камандзіроўцы, і дома ў застоллі, у грыбах ці на рыбалцы — была пара, калі ён нават у Стайках на Свіслачы падсякаў ладнага шчупачка...

У сёмым нумары часопіса «Полымя» за 1980 год апублікаваны яго верш з незакончанай кнігі «Дасэні». У адным з іх паэт разважае аб грунце, на якім вырастае і трымаецца Яе Вялікасць Паэзія:

Усёй паэзіі аснова —
Пульс няўрымслівы радка і пачуцця,
Не хараство нямога слова,
А хараство твайго жыцця.

Хораша выглядала яго жыццё. Хораша гучыць пявучае слова Пятра Глебкі.

Анатоль ВЯЛЮГІН.

ЗАПОМНІЛАСЯ НАЗАЎСЁДЫ

Здаецца, гэта было ў 1965 годзе. Восенню. Па аўдыторыях Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна пранеслася чутка, што ў Дом пісьменнікаў на сустрэчу з творчай моладдзю Мінска прыйдзе вядомы беларускі савецкі паэт і драматург, акадэмік Пятро Фёдаравіч Глебка. Заспяшаўся, зазбіраўся на гэту сустрэчу і я з сябрамі-аднакурснікамі. У Доме пісьменнікаў па вуліцы Энгельса не было дзе ўпасці яблыку, столькі сабралася народу. Вядома ж, усе мы вельмі хваляваліся. Але калі пачалася сустрэча, Глебка нейкай асаблівай бацькоўскай спагадай і цеплынёй сагрэў усю нашу яршыстую маладзёжную гасціну, вечар-справаздача пачаўся роўна і спакойна.

Адзін за адным прысутныя са сцэны дэкламавалі свае вершы. Глебка быў засяроджаны і нейкі па-асабліваму чалавечны. Хацелася проста глядзець на яго і такім запомніць назаўсёды. Загадзя скажу, што тады мне давялося бачыць Пятра Фёдаравіча першы і апошні раз.

Прачытаць свае вершы перад строгім экзаменатарам я так і не адважыўся, але тое, пра што сказаў Глебка, падводзячы вынікі сустрэчы, вельмі блізка прыняў да сэрца. Пятро Фёдаравіч заўважыў, што ўсе прадэкламаваныя на вечары вершы пісаў нібыта адзін аўтар — аднолькавы настрой, ніякай разнастайнасці формы, вельмі падобная рытміка і гэтак далей. Ён заклікаў ад гэтага рашуча пазбаўляцца, смела станавіцца на шлях творчых пошукаў.

Тая сустрэча са знакамітым паэтам назаўсёды прыцягнула маю ўвагу да яго шматграннай творчасці. Зацікавіўся я ім як паэтам-драматургам. Не раз і не два перачытваў Глебку, найперш яго драматычныя творы. Многае дало мне ўважлівае азнаямленне з імі. Драма «Над Бярозай-ракой» напісана паэтам у 1939 годзе, а найбольш значны твор—«Святло з усходу»— на працягу 1946—1957 гадоў. Па ўсім бачна, паэт шмат шукаў, працаваў. Ён хацеў як мага больш яскрава, па-мастацку праўдзіва адлюстраваць у ім падзеі Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны — падзеі, надзвычай вартыя паэтызацыі!

Хочацца адзначыць і яго паэтычныя набыткі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта ў гэты час піша ён вершы, пазначаныя тонкім лірызмам і глыбокім драматызмам. Згадаем хоць бы такія творы, як «Благаславенне», «Дзень вайны», «Галасы дарог», «Мы вернемся», «Песня партызан» і іншыя. Перад намі — светлы вобраз маці-Радзімы, Савецкай Беларусі, сыны якой узняліся на бой з ненавісным ворагам.

Такім ён і застаўся ў маім уяўленні — лірыкам, публіцыстам і паэтам глыбокага драматычнага напаўнення.

Уладзімір ДЗЮБА.

ПАЭЗІЯ

Алег САЛТУК

Вочы Радзімы

Кароткае жыццё,
Бясконцая Радзіма!
І смутак тут і гордасць агарне.
На свет гляджу тваімі я вачыма,
А ты глядзіш, Радзіма, на мяне.

Я кожнай жылкай адчуваю гэта,
Я кожным нервам позірк твой лаўлю.
Як ціха ў сэрцы, нібы над планетай
Толькі й чуваць:
— Люблю, люблю, люблю!

А над планетай цёмна і халодна,
І «ненавіджу» слова яшчэ ёсць.
Мой родны кут, вялікі і свабодны,
Няўжо і ты на свеце толькі госць?
Як б'ецца сэрца,
Як яно грукоча!
Ды покуль маё сэрца адбаліць,
Глядзяць твае ў яго, Радзіма, вочы,
І мне не страшна паміраць і жыць!

Рабінавая ноч

Рабінавая ноч
Малоціць у сто білаў.
Тут спаць пара даўно,
Ды сэрца так скруціла,
Што боязна заснуць:
А раптам назаўсёды?
О, як маланкі б'юць
У боль грамаадводаў!
Ракеты пад зямлёй
З лакатарнаю вартай.
Што адчувае той,
Хто ставіць свет на карту?
Ён вострыць хцівы меч.
Як рады ён маланкам!
Ноч, боль ты мой адпрэч...
Дажыць бы да світанку.

Дажынкі

Адвячоркам крычалі гракі,
Туманы асядалі ў лагчынах.
З песняй жніўнаю напрасткі
Ішлі полем жанчыны.

У адной — даўні сум у вачах.
Васількі на старэнькім халаце.
Сноп жытнёвы на чуйных руках,
Нібы ў люльцы дзіцяці.

Цеплыні ўжо даўно не было,
Толькі ціхія, ясныя далі
За маўклівым гарэлі сялом,
Да сябе заклікалі.

А жанчыны ішлі і ішлі,
Іх чакалі сынкі і дачушкі.
І бясконца над полем плылі,
І крычалі расчулена птушкі.

Восень.
Ноч.
Толькі вока звяду —
Ўскалыхнуцца жытнёвыя хвалі,
І жанчыны ідуць і ідуць,
І гараць, не згараючы, далі.

Армейскія зборы

В. ФЕДАРАВУ

Народу — і з лесу і з бору.
Жывая чарга ля капцёркі.
Мяняюць вясёлыя зборы
Кашулі на гімнасцёркі.

Знаёмяцца, разважаюць
Хлопцы сур'ёзнага веку.
Дома, канечне, чакаюць —
Смяшынка з журбінкай з-пад веек.

— На цэлы месяц ад жонак —
Без іхніх папрокаў горка!...
Свідруюць тугія пагоны
Маленькія, але зоркі.

І палітычная, і баявая,
І страявая ў прыдачу:
Месяц — не год, а значыць —
Поўную дай аддачу.

Давай, каб падэшвы смылелі
У новых кірзовых ботах,
Каб мускулы ўсе балелі
Ад нашай салдацкай работы.

Так, ад патрэбнай работы
З турботай аб свеце і міры.

ПРОЗА

АБРАЗКІ

Ян СКРЫГАН

З шуфляды майго стала

Тастамент

Час ідзе і ідзе. Пра гэта таксама, мабыць, пара ўжо расказаць. Хоць не вельмі і зручна. Усё роўна як гэта быў тастамент.

Я вучыўся на другім курсе універсітэта. Студэнцкая наша сталоўка была хілая, гатавалі ў ёй нясмачна і бедна. Са свайго Завакзалля я панадзіўся хадзіць у цэнтр. Недалёка ад Дома пісьменніка, на Савецкай вуліцы, здаецца, адразу ж за польскім консульствам, у белай прысадзістай камяніцы месцілася даволі ладная і прасторная сталоўка. Тут і напаткала мяне гэтая сустрэча.

Собіла мне сесці за столік у зручным і ціхім месцы пры куткавой сцяне. Толькі я паглыбіўся ў паперку, каб выбраць стравы, як нехта папытаўся, ці можна са мною сесці. Я падняў вочы і тут жа падхапіўся сам, пазнаўшы чалавека.

— Ну а як жа, калі ласка, дзядзька Гарэцкі, — толькі і адважыўся я сказаць.

Максім Гарэцкі. Ён быў мне даўно загадкаю. Па сваім веку і па пісьменніцкай сталасці і знанасці ён павінен быў бы гарнуцца да старэйшых — да Купалы, Коласа, Бядулі, але трымаўся асобна, убаку; па літаратурнай і грамадскай надзённасці мусіў бы хаўрусаваць з маладнякоўцамі, але й тут ён не быў блізкі, сабою ўяўляў нешта большае. Яго постаць стаяла адна і займала ўсё месца — да астатку. Не вельмі лёгка было распазнаць, дзе і што ён рабіў, але след апантанай руплівасці неадступна ішоў за ім: выдавецкая і рэдактарская дзейнасць, упершыню напісаная гісторыя беларускае літаратуры; лекцыі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, у Горы-Горыцкай агранамічнай акадэміі; навуковая работа ў Інстытуце беларускае культуры; кнігі свайго духоўнага жыцця — аповесці, апавяданні, роздум над светам — мы не маглі спакойна чытаць, калі тыя кнігі паяўляліся з друку. Было дзіва — калі ўсё гэта ён паспяваў рабіць? Вось чаму я аж злякаўся, убачыўшы яго перад сабой. Першы раз гэтак блізка можна каля яго стаяць. І нават гаварыць з ім. Добра, што ён не ведае, хто я, няхай думае, што проста студэнт, бо я ж перад ім і праўда — як горкае хлапчанё.

— Давайце сядзем, — сказаў ён, мабыць, дзеля таго, каб зняць маю няёмкасць.

Быў ён сярэдняга ці, можа, трохі большага росту і самавітай пастаці. Удумлівы, адкрыты твар, душэўныя вочы. Мяккі, спакойны голас. На верхняй губе як бы зусім нядаўна намеціўся ці знячэўку астаўся недабрыты цень вусікаў. Яны смела вязаліся з цёмным пінжаком і зусім чорным гальштукам.

Перад тым як сесці, ён пашукаў вачыма, куды можна палажыць папку. Месца ёй знайшлося на парожнім крэсле пры сцяне.

Пакуль мы заказвалі абед, пакуль яго нам прынеслі, ён распытваў мяне: як жывецца, на якім курсе вучуся, ці хапае на пражытак таго, што зарабляю? Куды збіраюся налета, ці на зусім развітаўся з футурызмам? Я нямала здзівіўся: аказваецца, ён ведае, што я — гэта Відук, што патроху пішу і вершы, і прозу.

— Штодня тут сталуецеся? — папытаўся ён, калі мы ўжо збіраліся падняцца з-за стала. І раптам дадаў, не чакаючы адказу. — Я рад, што з вамі сустрэўся. І хачу пагаварыць шчыра, па-пісьменніцку. Нядаўна ў мяне выйшла з друку невялікая крытычная кніжка пра творчасць вашых маладнякоўцаў. Там напісана і пра вас.

За ўвесь час нашай сённяшняй стрэчы я больш за ўсё баяўся, што дзядзька Гарэцкі ўпомніць тую кніжку. У ёй папраўдзе гаворыцца і пра мяне, можа, не так і блага, можа, нават пахвальна, але — колькі горкіх папрокаў! Я мог пераказаць іх на памяць: ...аўтар арыгінальнічае, па-моднаму расстаўляе радкі, хоць дабра ад таго не шмат... у значнай меры збіваецца на шаблон... ёсць нямала штучнасці, нервовасці, трохі недагляду ў мове... не чужаецца эратычных матываў...

— Я чытаў вашу кніжку, ёсць яна ў мяне, — сказаў я пакорліва.

— Ну то й лепш, тады мы яе й чапаць не будзем. — Ён паспеў быў узяць у рукі папку, збіраючыся развязаць яе, няйначай як там ляжала кніжка, але тут жа палажыў назад.

— Ды, уласна, я хачу сказаць зусім другое: вам трэба перастаць пісаць вершы, яны ў вас надуманыя, нежывыя. Як толькі вы бераецеся за верш, вы стараецеся рабіць яго модна, шукаеце чужых, ненатуральных слоў. Нашто вам «пэрлы дум», калі вы самі не ўяўляеце, што гэта такое? Свае вершы вы пішаце пераважна на чужым, незнаёмым матэрыяле, як тую «Чадру», якой нават не бачылі ў вочы. Няўжо ж пра чадру вы раскажаце лепш за паэта, які там жыве? Пісаць трэба пра сваё, знанае, блізкае, каб яго кожны мог бачыць і любіць. Трэба пісаць пра свой край, ён жа ўсім нам самы мілы. Хіба не гэтак?

Я слухаў, затаіўшы дух. Найдзіўней было тое, што ўсё гэта мне было як бы знаёмае. Як бы гэта былі мае ўласныя, болем вынашаныя думкі. І цяпер мне хацелася як бы папытацца ў кагось: як, якім чынам дзядзька Гарэцкі мог падслухаць ці падгледзець мае пакуты і трывогі, што вершы ніколі не давалі мне радасці?

— Вы кажаце, што чыталі маю кніжку? То, мабыць жа, пачулі, што ў ёй я не раз настаўляю вас на прозу. Толькі яна паможа вам. Бо ўгадваю, што вы можаце дабіцца, каб вас у добрай меры слухаліся і душэўныя перажыванні, і рамантыка роднага краю, і народнае слова. Пішыце прозу.

Нам трэба вучыцца

Трое нас — Пятрусь Броўка, Макар Шалай і я — надумалі кончыць вучыцца. Трэба было ехаць у Мінск. Там быў ужо Паўлюк Шукайла і нас прыспешваў. Але Броўка адразу паехаць не мог: не так проста было пакінуць рэдакцыю газеты «Чырвоная Полаччына», у якой ён рабіў адказным сакратаром.

Пад канец 1927 года мы паехалі двое: Макар Шалай і я. Пятрусь Броўка прыехаў намнога пазней. Мы загадзя згаварылі яму пакой у тым жа доме, дзе жылі самі: на Завакзаллі, у Мар'і Жакевіч. Гэта было і зручна і па-сяброўску, бо наш клопат не абмяжоўваўся толькі побытам і універсітэцкімі турботамі, нам хацелася быць разам. Кожнаму з нас наперадзе свяціла таемная зорка жаданых літаратурных скуткаў. Заняткі ва універсітэце не заміналі нам у гэтай мары. Мы мелі магчымасць на лекцыі важнейшыя і цікавыя — хадзіць, на малаважныя і нудныя — не. То быў час пошукаў і станаўлення беларускай новай літаратуры. У Мінску то ў клубе Карла Маркса, то ў Доме працасветы, то яшчэ дзе наладжваліся літаратурныя дыспуты, вечары, абмеркаванне нейкіх неадкладных праблем ці твораў. І мы свой час аддавалі на гэта. Такая атмасфера была нам найлепшаю літаратурнаю школай.

Пятрусь Броўка, будучы чалавекам вельмі чулым да грамадска-палітычнай чыннасці, рынуўся ў гэтую атмасферу з усім запалам свае непасрэднае натуры. У Полацку, нейкі пэўны, зусім невялікі, час яго трывожылі матывы так званай ясеніншчыны, тут жа гэты налёт знік імгненна. Яго цалкам захапіла паэзія барацьбы, наступу, услаўлення часу, рэвалюцыйных пераўтварэнняў рэчаіснасці. Вершы той пары пазней увойдуць у першую кнігу, сама назва якой будзе гаварыць аб іх накіраванасці: «Гады як шторм».

Была ў Петруся Броўкі яшчэ і такая здольнасць, што ён ніколі не аставаўся адзін, каля яго абавязкова збіраўся гурт аднадумцаў ці прыхільнікаў. І вельмі скора яго сябрамі сталі такія паэты і празаікі, як Уладзімір Хадыка, Васіль Каваль, Сымон Баранавых, Валерый Маракоў. Але найважней сказаць, што яго палюбіў Янка Купала. Ён сумаваў, калі Броўкі доўга не бачыў.

Паўлюк Шукайла меў сваю натуру: ён ніколі і ні ў чым не мог быць радавым. Па сутнасці, ён паехаў з Полацка ў Мінск і прыспешваў наш прыезд па той прычыне, што выношваў ідэю аб утварэнні беларускай літаратурнай футурыстычнай арганізацыі. А гэта можна было рабіць толькі ў сталіцы. Мы ж трое павінны былі стаць членамі-заснавальнікамі «Беларускай літаратурна-мастацкай камуны».

Цікаваю фігураю ў Літкамуне быў Уладзімір Варава, член КПСС з 1923 года, колішні партыйны работнік у Заходняй Беларусі, пісьменнік з вельмі вострым палітычным зрокам — на жаль, у 1929 годзе ён стаў ахвяраю кулацкага тэрору. Незвычайнаю з'яваю было і тое, што членам-заснавальнікам «Камуны» быў вядомы рускі пісьменнік, рэвалюцыянер, рамантык, наватар Арцём Вясёлы.

Літаратурна-мастацкая камуна жыла нядоўга, але нам, яе ўдзельнікам, яна дала нямала карысці. Гэта таксама была вучоба. Больш практычная. На рэдагаванне свайго часопіса «Росквіт» мы збіраліся ўсе, хто жыў у Мінску. Рассаджваліся дзе хто мог на кватэры ў Шукайлы або лажыліся на разасланыя на падлозе кажухі і світкі і ўголас чыталі кожны твор — ці то прозу, ці вершы. Знаходзілася многа заўваг — і па сэнсе, і па граматнасці пісьма, і па паэтычным дыханні, якое тады было ў нас, маладых, яшчэ вельмі слаба пастаўлена. Мы гаварылі адзін аднаму ў вочы толькі праўду. Аўтар або пераконваўся, што яго твор нікуды не варты, або згаджаўся сам давесці да ладу, або прымаў папраўкі, якія мы падбіралі гуртам тут жа на зборні. Божа, які гэта быў светлы і святы час на нашым шляху да сталасці!

Гэта быў наш, другі паралельны універсітэт.

У нас не было ніякіх ні штатных адзінак, ні рэдкалегій, ні рэдакцый, ні жанравых аддзелаў, але з другога нумару «Росквіта» паэзія фактычна ляжала на Броўку. У той час яна таксама была розная, можа, нават у боль-

Ні ўсмешкі на цэлую роту:
— Зборы,
раўняйся,
смірна!

Чайкі ў горадзе

Чайкі ў горадзе.
Што за дзіва —
Недалёка Дзвіна цячэ.
Над зялёным яе разлівам
Сінь нябёс — не хапае вачэй.
Чайкі ў горадзе.
Вербы ў коціках.
Без канца і без краю вясна.
Сонца весела ў вечнасць коціцца,
Пакідаючы промні нам.
Чайкі ў горадзе.
Вокны ў золаце.
Ап'яніў красавік без віна.
Учарашнія сталі золушкі
Каралеўнамі, як адна.
Хвалі коцяцца.
Промні кружацца.
Ачмурэла ад волі дзятва.
У адбеленым лёгкім кужалі
У старога майго галава.

Белы іней на папяросцы.
Чайкі ў горадзе.
Бацька ў вёсцы.

Пытанні

Колькі зор памерла ўгары,
Колькі рэк у свеце не стала,
Колькі высахла дрэў у бары,
Колькі птушак не даспявала,
Колькі прахам пайшло надзей,
Колькі талентаў не адбылося...
Я ж па-ранейшаму веру ў людзей.
. . . . . .
А колькі ім жыць засталося?

Тры рачулкі

Ёсць на свеце тры рачулкі —
Боль мая, мая любоў.
Мне без іх на свеце мулка,
З імі ж сэрца б'ецца гулка
У прадчуванні добрых слоў.
Добры дзень, мая Нярэшня,
Мой зялёны пясок.
Як хаваеш ты пацешна,
(Думаў, перасохнеш, грэшны!)
Ты ў малінніку вірок.
Віраватая Дабрэйка —
Зубы ломіць ад глытка.
Я дабрэю і мудрэю,
І надзеяй маладзею
Ля старэнькага мастка.

А шляхцяначка-Уллянка —
Вышыванкі берагі,
Песень звонкіх паланянка,
Незабыўнае каханкі
Пацалунак дарагі.

Ёсць на свеце тры рачулкі —
Берагі маёй тугі.

Пра што баліць

Сяброў шукаю днём з агнём —
Так мала іх чамусьці стала.
Адзін вунь робіць ход канём,
А той ужо на п'едэстале.
Конь убрыкне, а п'едэстал —
Яго і трактарам не зрушыш...
Няўжо і я інакшым стаў,
Няўжо і я ў грахах па вушы?
Суджу не іншых, а сябе
Судом няўмольным і суровым.
У малацьбе і на сяўбе
Шукаю праведныя словы.
Грабу палову набакі
Аж на руках смыляць мазолі
І асцюкі, як нажакі,
Да болю твар і сэрца колюць.
Калі ж гады рассудзяць нас,
Згніюць і асцюкі з паловай,
Сяброў сваіх убачу ў час
І прарашчу жывыя словы.

шай ступені як цяпер. І лірычная, на вясковай меладычнай яснасці, і грамабойна-урбаністычная, так званая наватарская. Апошняя больш пасавала да нашага футурыстычнага накірунку, але Броўка прыкладаў многа намаганняў, каб у вершах аставалася і душа, і ласка, і мелодыя. Вядома, не без сутычак, і часта вельмі вострых, з Шукайлам. Тут якраз месца сказаць — Шукайла не быў помслівы. Ён быў чулы, спагадлівы, чалавечны.

Мяркую, што іменна гэтая практычная школа памагла нам прафесійна вырасці, пасталець, ярка навучыла баяцца фальшу і хадульнасці, і прывяла да перакананння самаліквідавацца.

Памятаю адзін, мабыць, нікому не вядомы эпізод. Аркадзь Куляшоў пачаў пісаць вершы вельмі рана, яшчэ вучнем у сваіх Саматэвічах. Часамі ў Мінск ён прыязджаў, каб наведаць сваіх сяброў-землякоў Змітра Астапенку і Юлія Таўбіна. Вершы яго былі, як цяпер кажуць, наватарскія, свежа-нечаканыя, смелыя. Натуральна, што, спакушаны нашымі дзёрзкімі літаратурнымі навацыямі, і тым больш падахвочаны самім Шукайлам, аднаго разу ён забег на наша чарговае пасяджэнне. Вядомая рэч, каб паглядзець, ці варта яму да нас падавацца. Было такое асцярожнае ўзаемнае меркаванне. Гэта сталася якраз тады, калі ў нас набрыняў творчы крызіс і мы ўжо гаварылі толькі павышанымі галасамі. Дачакаўшыся перапынку, Аркадзь Куляшоў нашу зборную ціха пакінуў.

Памятаю і апошнюю хвіліну нашай выдавецкай дзейнасці. Мы з Броўкам зайшлі ў друкарню, дзе друкаваўся другі нумар «Росквіта». Там быў Шукайла, ён прыйшоў, каб падпісаць часопіс у свет. Шчасліва ён трымаў гэты нумар у руках. Гэтак жа шчасліва перадаў яго Броўку, сказаўшы, што нарэшце напісаў дэкларацыю, якой вельмі не хапае нам як творчай арганізацыі. Здзівіўшы вочы, Броўка перадаў нумар мне. На першай старонцы, набраныя рознымі шрыфтамі ўразбіўку крычма крычалі радкі дэкларацыі.

Мы даўно зразумелі, што літаратуры нельга падменьваць штукарствам. Толькі дома я апамятаўся і пашкадаваў, што тую дэкларацыю мы знішчылі. Але потым яна знайшлася ў кішэні майго пінжака.

Тайны

Аднаго разу ўвечары па тэлефоне жаночы малады галасок папытаўся, ці я гэта той пісьменнік, які напісаў апавяданне «Факір Іяма». Той самы, прызнаўся я, і ў сваю чаргу папытаўся: чаму і каго гэта цікавіць?

— Я дачка тае жанчыны, пра якую вы гэтак хораша напісалі. Скажыце, усё, што вы пра яе напісалі — гэта праўда?

Адказаць было цяжка, бо было відно, што пытанне задаецца нездарма. Яно выклікана нейкай невядомай мне сітуацыяй. І, мабыць, важнай. Я сказаў, што ў аснове апавядання ляжыць праўда, але, паколькі яно зроблена як твор мастацкі, то ў ім ёсць і пэўная доля вымыслу. Хоць бы дзеля таго, каб звязаць між сабою мясціны фактычныя.

— Вы вельмі хораша напісалі пра маю маму, — гаварыла тым часам маладая жанчына. — І прыгажосць, і абаяльнасць, і чыстае, усё роўна як незямное каханне. Чалавек з гэтакімі якасцямі павінен быць душэўны, чулы, далікатны, а ў мае мамы нічога гэтага няма.

— Што здарылася? — папытаўся я.

— Пасля таго, як памёр наш татка, яе проста як падмянілі. Яна мяне ўзненавідзела. Разумееце, я выйшла замуж, неўзабаве будзе дзіця, а яна праганяе нас з дому. У нас трохпакаёвая кватэра, лецішча, усюды прастору хоць танцуй, а яна кіпіць: каб вашага й духу тут не было! Я не ведаю, што з ёю робіцца, усё роўна як я ёй чужая.

Я быў ашаломлены. Я папытаўся:

— Што мне трэба зрабіць? Як заступіцца за вас?

— Ніяк. Не трэба. Проста я хачу, каб вы ведалі, што памыліліся ў вашай гераіні. Што яна не варта вашага ўслаўлення.

Надоўга мяне вывела са спакою гэтая размова. Я спрабаваў дадумаць, якім чынам маладая жанчына наткнулася на маё апавяданне. Як пазнала, што яго гераіняю з'яўляецца яе маці, бо ў творы імя яе перайначана. І навошта пачала шукаць аўтара, калі ад усякіх яго паслуг адмовілася. Не дзеля таго ж толькі, каб сказаць, што гераіня не варта ўслаўлення. Прычына тут большая. Глыбейшая. У яе званку міжволі я пачуў сабе папрок, мяне як бы звінавацілі, што нечым я прычыніўся да чужое бяды. Нечаканасцю мяне здзівілі словы «Я дачка тае жанчыны», бо ніколі не чуў, каб у той сям'і была дачка. І зусім трывожна прагучала параўнанне «Усё роўна як я ёй чужая».

Я пачаў успамінаць далёкае наша знаёмства. Факіра Іяму, пажылога, са стомленым тварам чалавека, яго памочніцу па сцэне, вельмі маладую, мілую, папраўдзе абаяльную жанчыну, што на маё дзіва аказалася і яго жонкаю, якую ён па-юначы ўлюбёна зваў Мар'янкаю; наша нечаканае сяброўства, што перайшло ў сямейную дружбу. Потым яе адзіноту і гора, калі неспадзеўна Іяма знік, а проста кажучы ўцёк, і душэўнае суцяшэнне яна знаходзіла ў нашым доме.

Потым, як гэта часта бывае, нашы сем'і неўзаметку раз'ехаліся па свеце, хто куды, але я часта ўспамінаў Мар'яну, як нейкую паэтычную незбытэчнасць ці далёкую казку. Мне скрозь здавалася, што лёс надарыў яе не зусім звычайнаю, можна сказаць, выключнаю сустрэчаю з Іямам, даўно вартаю таго, каб надаць ёй літаратурную форму. І я напісаў апавяданне. Я быў упэўнены, што гераіня, калі недзе жыве, пра гэта не дазнаецца, бо літаратура ніколі не была яе стыхіяю. А калі і дазнаецца, то, можа, будзе толькі рада: на яе біяграфію гэта не кіне ніякае ганьбы. Наадварот, аздобіць яе.

І якое ж было мне дзіва, калі аднаго разу, на плошчы Якуба Коласа, сышоўшы з трамвая, я твар у твар стыкнуўся з ёю. Ведама, быў рад, што гады як бы нават не закранулі яе. Наадварот, надалі ёй нейкай новай, надзіва ласкавай і спакойна-ўдумлівай вабнасці. Яна расказала, што ў свой час Рыгор Апанасавіч быў запрошаны ў Ташкент на работу па профілю яго навуковай дзейнасці, і яны пражылі там дванаццаць гадоў. А цяпер ужо два гады як зноў у Мінску, таксама на цікавай рабоце. У іх добрая кватэра, лецішча пад Крыжоўкаю, жывуць спакойна, як і калісь. Бадай штогод бываюць на курортах. Толькі з сэрцам у яго нядобра.

Нечаканая сустрэча ўзрушыла мяне, неяк па-святочнаму памаладзіла, хацелася, каб гэтакая святочнасць перадалася і ёй, і я сказаў:

— Дарагая Мар'яна Тодараўна, вы ж, мабыць, і не ведаеце, што я напісаў пра вас апавяданне?

— Дзе? Як? — мне здалося, што з трывогаю папыталася яна.

Я сказаў, што друкуецца. Неўзабаве будзе, прачытаеце.

— Я вас вельмі прашу,— яшчэ з большаю трывогаю сказала яна,— зрабіце так, каб пра гэта не ведаў Рыгор Апанасавіч.

Гэта была першая загадка, неразгаданая мною і дагэтуль.

Але трэба ж расказаць і пра Рыгора Апанасавіча.

Пасля таго, як знік Іяма, мне выпадкова сустрэўся добры даўні прыяцель, зямляк, у свой час мы разам вучыліся ў тэхнікуме, Рыгор Дробыш. Ён скончыў сельскагаспадарчую акадэмію, спецыялізаваўся ў Ленінградзе, цяпер вярнуўся ў Беларусь на работу. Паскардзіўся на сваю бяду: жонка з ім не паехала, асталася там, пры бацьках, з малою дачкою. Словам, пакінула яго. Яму жывецца адзінока, непамысна, няўтульна.

— Хочаш, я цябе ажаню?—сказаў я.

— Папраўдзе? — павесялеў ён.

— А што—паспрабуем. Прыходзь да мяне ў чацвер. Завуць яе Мар'яна: яна прыйдзе да мае жонкі, а ты — да мяне. Паседзімо, папрэстарэкуем. Яна таксама была замужам.

Мой даклярунак спраўдзіўся надзіва хутка і лёгка. Прыяцель, пайшоўшы правесці яе дадому, прывёў да сябе.

Гэтак выходзіла яна замуж і за Іяму. Няўжо ж тое далёкае падабенства стаяла, як цень? Бо мне нават здалося, што яна аберагалася, каб мы цяпер не сустрэліся з Рыгорам. І вельмі шкода, што я сам міжволі адхіліў магчымасць гэтай сустрэчы.

Я пільна спяшаўся на неадкладны візіт. Толькі я ўскочыў на падножку тралейбуса, як мяне аклікнуў чужы, але, здалося, знаёмы голас з тратуара. Рыгор Апанасавіч настойліва, словам і жэстам прасіў не ехаць, пачакаць, яму трэба конча перагаварыць са мною. Не магу я, дарагі Рыгор, гаварыў я таксама словам і жэстам, вельмі спяшаюся, другім разам, сазвонімся.

Гэтак я і паехаў, неспакойна думаючы, што колішні добры сябар нешта важнае хацеў мне сказаць. Можа, у нечым адкрыцца. Можа, параіцца перад нейкім адчайным крокам. Людзям жа вельмі часта не стае блізкага чалавека, каб у нечым паспавядацца. І не паспеў. На другі дзень ён памёр дома, звонячы па тэлефоне ў Ленінград.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Марк СМАГАРОВІЧ

Мсціўцы

Нахлынула навала,
Узняўшы чорны дым.
Спакою больш не стала
Дарослым і малым.

І па-над галавамі
У край наш, у наш дом
Сцярвятнікі з крыжамі
Смяротны везлі гром.

Дзіцячы плач ад жаху
Зліваўся з дымам хмар.
Нібыта ўсход і захад
Сышліся твар у твар.

Ноч ясны дзень цясніла.
Грымеў за боем бой.
На сілу ўстала сіла
Сцяною пад Масквой.

У грукаце металу,
Пад куль гарачы град,
Змятаць пачаў навалу,
Як волат, Сталінград.

І абудзілі далі
На помсту галасы.
Шумець сурова сталі
Палескія лясы.

●

Знямела вёска Кавалі,
Не звоніць кузня ў вёсцы.
Гняздо паспешліва звілі
Сваё ў ёй крыжаносцы.

Бывала ў хаце—што ні сын—
Касец, каваль, гвардзеец.
Але ў калгасе хоць адзін,
А быў і адшчапенец.

У хвор кідаўся абібок,
Хадзіў з кійком-кульбакай.
Цяпер фашыстам за паёк
Пайшоў служыць, сабака.

Па вёсцы робіць свой абход,
Выслужваецца надта,—
Збірае часта яйкі, мёд
Для пана каменданта.

А побач лес. І цішыня.
У партызан нарада.
Былы калгасны старшыня
Іх камандзір атрада.

— Лютуе вораг,—кажа ён,—
Дымяцца папялішчы.
Варожы трэба гарнізон
Абавязкова знішчыць.

Больш ста адважных партызан,
У ствалы загнаўшы кулі,
На досвітку ў густы туман,
Нібы ў ваду, нырнулі.

Спыніліся на пяць хвілін
У здраднікавым доме.
І ўжо быў партызан адзін
У паліцэйскай форме.

І ён наперадзе ішоў
Па вуліцы к бараку,
Гатоў сваіх таварышоў
Павесці ў бой-атаку.

І вось прыйшоў к бараку ён,
І вартавы ім зняты.
І зазвінела шкло акон,
У ход пайшлі гранаты.

І ўжо барак пачаў гарэць,
Гранаты ўсё ляцелі...
Праклятых гітлераўцаў смерць
Спасцігла ў пасцелі.

ДЗЕНЬ ДОБРЫ, БЕЛАРУСЬ!

Старонкі летапісу захавалі ўзрушальныя і драматычныя факты творчай біяграфіі Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Факты часоў Вялікай Айчыннай, калі знакаміты беларускі калектыў, эвакуіраваны ў Томск, не спыняў сваю творчую работу ў сібірскім краі. Прыгадайма, што менавіта ў той суровы час пабачылі свят-

падкова, што праходзіць яна на свяшчэннай беларускай зямлі, спаленай, скатаванай акупантамі, ды няскоранай, непераможнай, адроджанай з попелу і руінаў.

Дружба Томска і Мінска змацавана ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі сібірскі горад прыняў у сябе эвакуіраваны Першы Беларускі дзяржаўны тэатр, і на працягу трох год тамічы былі ўдзячнымі і захопленымі гледачамі спектакляў, якія іграліся спачатку на беларускай, а потым ужо на рускай мове.

У рэпертуары нашага тэатра нямала спектакляў, у якіх з пазіцый сучаснікаў асэнсоўваецца гісторыя краіны, падзеі драматычных гадоў, апяваецца народны подзвіг, даследуецца гераічны характар. Лепшыя з такіх спектакляў увайшлі ў гастрольную афішу.

«Салёная падзь» паводле рамана Сяргея Залыгіна расказвае пра адзін з эпізодаў грамадзянскай вайны ў Сібіры. Пастаноўшчык спектакля заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР Фелікс Грыгар'ян і выканаўца ролі галоўнакамандуючага чырвонапартызанскай арміяй Яфрэма Мешчаракова заслужаны артыст РСФСР Уладзімір Варанцоў удастоены за гэту работу Дзяржаўнай прэміі РСФСР.

Спектакль па п'есе Віталія Раздольскага «Завіруха» (таксама ў пастаноўцы Ф. Грыгар'яна) узнаўляе адзін з самых напружаных момантаў у жыцці маладой Савецкай дзяржавы — час падпісання Брэсцкага міру. Галоўныя дзейныя асобы спектакля — Уладзімір Ільіч Ленін і Аляксандр Блок.

Дзве работы прысвяціў калектыў 40-годдзю Перамогі: «Эшалон» Міхаіла Рошчына і «Начная споведзь» Аляксея Арбузава. Абодва спектаклі пастаўлены Міхаілам Барысавым. Амаль усе буйныя прамысловыя прадпрыемствы нашага горада правялі Дні тэатра, пад час якіх глядзелі і абмяркоўвалі спектакль «Эшалон». Бо ў кожным калектыве ёсць ветэраны, якія прыбылі ў Сібір з гэткімі ж эшалонамі. (У гады вайны Томск прыняў 38 прамысловых прадпрыемстваў і 50 тысяч эвакуіраваных грамадзян). Гарачую зацікаўленасць меў спектакль «Эшалон» і ў маладзёжным асяроддзі: мы, артысты, ведаем пра гэта і па водгуках у друку, і па шматлікіх сустрэчах у ВНУ і ў школах. І што можа быць больш дарагім для артыста, чым такая простая і сардэчная ацэнка, дадзеная адной з глядачак: «Быццам сама з вамі ў гэтым эшалоне ехала!»

Трэці год у нашым рэпертуары палітычны памфлет Жана-Поля Сартра «Толькі праўда», які ў вострай гратэскнай форме паказвае механізмы распальвання ваеннай істэрыі, якімі карыстаюцца заходнія палітыканы. Гэты спектакль быў дыпломнай работай выпускніка рэжысёрскага факультэта тэатральнага вучылішча імя Б. Шчукіна Міхаіла Барысава, які цяпер узначальвае наш творчы калектыў.

Складаючы гастрольную афішу, мы імкнуліся зрабіць яе больш разнастайнай, каб прывабіць гледачоў рознага ўзросту, каб паўней і цікавей прадставіць трупу. Мы паказваем творы розных жанраў: народную драму і трагедыю, палітычны памфлет і камедыю, меладраму і фарс.

«Васа Жалязнова» М. Горкага, «У гэтым мілым старым доме» А. Арбузава, «Рэтра» А. Галіна — назвы, якія не маюць патрэбы ў каментарыях. П'есы гэтыя шырока ідуць па краіне, аднак мы смела ўключылі іх у рэпертуар, спадзеючыся, што беларускіх тэатралаў зацікавіць наша «прачытанне» вядомых твораў.

Тое, што гастролі нашы — абменныя з Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы, робіць іх асабліва адказнымі. Гэта настройвае ўсіх нас — і ветэранаў і творчую моладзь — на асаблівую хвалю... Да святкавання 40-годдзя Перамогі камсамольская арганізацыя нашага калектыву падрыхтавала прадстаўленне, якое расказвае пра франтавікоў — работнікаў тэатра і пра тэатральнае жыццё Томска ў гады вайны. Вялікае месца ў гэтым апавяданні занялі ўспаміны пра работу беларускіх артыстаў у Томску: пра спектаклі, пра брыгады, якія выязджалі на фронт, пра сустрэчы ў шпіталях, пра абслугоўванне працаўнікоў тылу.

Народная артыстка РСФСР Л. Далматава ў ролі Васы Жалязновай.

Фота М. ЛІМАРЭНКІ.

Сёлета мы на гастролях у двух беларускіх гарадах — у Мінску і ў Віцебску. Пабываем і ў палацах культуры прамысловых прадпрыемстваў, у сельскага гледача — для гэтага падрыхтаваны выязныя варыянты сцэнаграфічнага афармлення спектакляў, спецыяльныя праграмы для канцэртных груп. Спадзяёмся, што сустрэча наша будзе ўзаемна цікавай і радаснай.

Запісала М. СМІРНОВА.

ло рампы «Фронт» А. Карнейчука, «Рускія людзі» К. Сіманава ў рэжысуры Л. Рахленкі, «Паўлінка» — Купалава камедыя, пастаўленая рэжысёрам Л. Літвінавым, якая ўжо чатыры дзесяткі гадоў не сыходзіць з гэтай сцэны...

Параўнальна нядаўна ў Томску прайшлі Дні горада-героя Мінска. Цяпер Беларусь вітае тамічоў; у рэспубліцы пачынае гастролі калектыў Томскага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра. А наш тэатр імя Янкі Купалы гастралюе сёлета ў Томску.

Гастролі сібіракоў пачынаюцца ў Віцебску. Праз месяц, у жніўні, іх будуць вітаць мінскія тэатралы. Увазе нашых чытачоў прапануем інтэрв'ю народнай артысткі РСФСР, дэлегата XXVI з'езда КПСС, старшыні Томскага аддзялення ВТА, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Людмілы Іванаўны Далматавай:

— Сёлетнія гастролі — першы візіт старэйшага сібірскага тэатра ў Беларусь. Дакладней было б назваць яго не гастролямі, а творчай справаздачай, якую наш калектыў прысвячае 40-годдзю Перамогі. І не вы-

---

Кожны па-свойму запомніў Андрэя Ягоравіча Макаёнка ў апошнія дні яго жыцця. Гэта, вядома, залежала і ад характару сітуацыі, у якой адбывалася сустрэча. Некаторым з нас ён запомніўся па сумеснай — на жаль, апошняй для яго — паездцы ў Маскву на пленум праўлення СП СССР, па яго ўдзеле ў пісьменніцкім партыйным сходзе (быў абраны ў прэзідыум і аглядаў з-за стала залу позіркам, які не прадвяшчаў нічога дрэннага), больш блізкім людзям — па клопатах, звязаных з пераездам на новую кватэру... Для супрацоўнікаў аддзела літаратуры «Літаратурнай газеты», у прыватнасці, для Б. Тарошчынай, Андрэй Макаёнак запомніўся ў сувязі з тым, што рыхтавалася да друку яго выступленне пад традыцыйнай для газеты рубрыкай «Літаратура — жыццё маё».

Браніслава Дзмітрыеўна сказала, што апошні раз прыязджала ў Мінск у 1982 г. для гутаркі з Макаёнкам, што помніць тое ўражанне, якое зрабіў на яе драматург з яго эмацыянальна-выбуховым характарам, з яго акрэсленай пазіцыяй па надзённых пытаннях грамадскага і літаратурнага жыцця, з яго аддадзенасцю тэатру. Я пацікавіўся лёсам выступлення. Артыкул, сказала Б. Тарошчына, быў падрыхтаваны да друку, ухвалены аўтарам і павінен быў убачыць свет у чарговым нумары. Ды тут прыйшла вестка пра смерць. «А пасля смерці ён не мог быць змешчаны?» — «У прынцыпе мог бы, але вельмі ўжо «жывы», тэмпераментны быў ён для гэтага. Неяк не стасаваўся ён па сваім духу з фактам нечаканай для ўсіх смерці аўтара...».

Па маёй просьбе супрацоўнікі «Літаратурки» знайшлі гранкі з набраным артыкулам — апошнім публічным выступленнем А. Макаёнка — і далі згоду на публікацыю яго ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва».

Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Андрэй МАКАЁНАК

ПРЫ ЯРКІМ СВЯТЛЕ РАМПЫ

НЯДАЎНА скончыў работу над п'есай з трохі дзіўнай назвай «Дыхайце эканомна!». Нарадзілася яна такім чынам. У 1965 годзе я ў складзе беларускай дэлегацыі браў удзел у сесіі ААН у Нью-Йорку. У той самы час у сталіцы Злучаных Штатаў праходзіла гіганцкая прамысловая выстаўка, якая сваім размахам рабіла проста ашаламляльнае ўражанне.

Але больш за ўсё мяне зацікавіў адзін экспанат у амерыканскім сектары. Гэта было падземнае бамбасховішча на выпадак атамнай вайны коштам 1 мільён 220 тысяч долараў. Калі мы ішлі па прыступках уніз, я звярнуў увагу на белы лісток паперы, прымацаваны кнопкай да сцяны. «Дыхайце эканомна!» — заклікаў нас лісток... Бамбасховішча ўяўляла сабой цудоўны дом, у якім мог бы размясціц-

ца цэлы коледж. Запасаў прадуктаў і іншых жыццёвых рэсурсаў у гэтым доме было, як сказаў нам гід, разлічана на 20 год. Я пераходзіў з аднаго пакоя ў другі, за акном электрычнасць імітавала дзень, потым заход сонца, потым зорнае неба, і задума новай п'есы нараджалася літаральна на вачах. Тут у мяне з'явілася думка напісаць пра тое, як у час атамнай вайны ў такое ж самае бамбасховішча трапляе амерыканская эліта, якая і тут працягвае жыць на аснове прынцыпаў недатыкальнасці прыватнай уласнасці і свабоды прадпрымальніцтва. Наверсе, на зямлі, гіне чалавецтва, а тут, вядома, ідзе бойка за ўладу, развіццё цывілізацыі па спіралі паступова паўзе ўніз...

П'еса мяне захапіла, і я стаў пісаць яе проста ў Нью-Йорку. Але потым, праз пэўны час, пачаўся працэс разрадкі, палепшыліся нашы адносіны з Амерыкай, і я вырашыў, што гэтая мая п'еса страціла актуальнасць. Але час, на жаль, мяняецца.

Свет зараз знаходзіцца на краі катастрофы. Сёння кожную мінуту на Захадзе на ўзбраенне ідзе 50 мільёнаў долараў. І за ўсім гэтым стаяць канкрэтныя людзі, чыімі ўчынкамі кіруе імкненне да масавага знішчэння цэлых народаў. І мне здаецца, што вось пра гэтых людзей мы яшчэ мала гаворым і пішам, а больш за ўсё прыкрываемся агульнымі тэрмінамі «ваенна-прамысловы комплекс», «мілітарызм», «транснацыянальныя карпарацыі» і гэтак далей. Да гэтага часу засталіся непераўзыдзенымі і, напэўна, адзінымі сапраўды моцнымі рэчамі такога плана «Дыктатар» Чаплі-на ды «Восень патрыярха» Г. Маркеса. Мы павінны штогадзіны, штомінуты памятаць: вайна пагражае кожнаму з нас, яна падбіраецца да кожнага дома.

У выніку такога роздуму я вырашыў дапісаць п'есу «Дыхайце эканомна!» Дапісваючы яе, думаў: а як было б добра, каб яна сапраўды страціла сваю актуальнасць...

Літаратура ў маім лёсе адыграла велізарную ролю. З маленства кніга — самая шаноўная істота, менавіта істота, якая дапамагала і дапамагае мне жыць і нават выжыць. Раскажу пра такі выпадак. У час высадкі дэсанту ў Крыме ў гады вайны быў я цяжка паранены. Прысуд медыкаў: ампутацыя абедзвюх ног. Хлопец я быў гарачы — не згадзіўся. Боль трываў жахлівы. І вось аднаго разу доктар прынёс мне ў палату томік «Энеіды» І. Катляраўскага. Калі казаць праўду, не да чытання мне тады было. Але кніжку разгарнуў. Старонка, другая... І, здаецца, боль пачаў адступаць. Да выпіскі ведаў «Энеіду» на памяць. Ногі засталіся пры мне. Накульгваю, праўда.

Я сатырык, але люблю не толькі Гогаля, Салтыкова-Шчадрына, але і Пушкіна, Цютчава, Лермантава, і часта, працуючы над новай п'есай, бяру ў рукі запаветныя томікі, перачытваю, думаю.

МЫ ЦЯПЕР вельмі шмат гаворым, думаем, разважаем пра выхаванне, пра мараль і маральнасць. Галоўным, на мой погляд, тут павінна быць адзінства слова і справы. Інакш нічога не атрымаецца, пустымі словамі чалавека новага грамадства не сфарміруеш. «А што такое новы чалавек, чым ён адрозніваецца ад нас?» — задавалі мне колькі гадоў назад у час паездкі па ЗША ў ліку іншых пытанняў і такое студэнты аднаго з самых старых амерыканскіх універсітэтаў. Падумаў і адказаў:

— Вось уявім, — сказаў я, — вы купляеце ў магазіне світэр за 20 долараў. Потым вы камусьці яго перапрадаеце за 30 долараў, атрымліваеце прыбытак, і вам анітрохі не сорамна, гэта называецца «рабіць бізнес». У нас гэта называецца інакш — «спекуляцыя», і ні адзін прыстойны чалавек не дазволіць сабе займацца такой ганебнай справай.

Мог бы я і цяпер быць такім катэгарычным, як колісь у гутарцы з амерыканскімі студэнтамі? Наўрад, на вялікі жаль.

Нейк незаўважна, але ўсё больш настойліва ў наша жыццё ўваходзіць паняцце «дэфіцыт», які за любую цану трэба займець. Усё часцей мы чытаем у друку пра «чорны рынак». А Дзяржплан нават вынайшаў спецыяльны тэрмін, праўда, на мой погляд, вельмі мяккі: «неарганізаванае пераразмеркаванне». Вось зловяць за руку аднаго такога мярзотніка, які актыўна займаецца «неарганізаваным пераразмеркаваннем», а ў яго ў кішэні, аказваецца, партбілет. Потым «Правда» ці «Известия» напішуць: вінаваты сурова пакараны — яму аб'яўлена строгая вымова з занясеннем ва ўліковую картачку. Чытач неўразумела пацісне плячамі, а мярзотнік пасля публікацыі збірае дома гасцей, корміць і поіць іх зноў жа «дэфіцытам».

Самае крыўднае, што мы часта, шмат гаворачы пра складаныя матэрыі, скіраваныя ў самыя высокія сферы, сваёй паблажлівасцю тут, на зямлі, дазваляем рабіць людзям амаральныя ўчынкі, а часам быццам і самі просім: зрабі гнюснасць і атрымаеш за гэта грошы. Вось прыклад, які ляжыць на паверхні. На першым паверсе будынка размешчаны магазін, дзе можна купіць пляшку каньяку, скажам, за 8 рублёў. На другім паверсе будынка — рэстаран, дзе тая самая пляшка каштуе ўжо 15 рублёў. Сам гэты факт — ускоснае заахвочванне афіцыянтаў, і было б нават дзіўна, калі б яны не скарысталі магчымасць купіць каньяк на першым паверсе, а прадаць яго на другім, апусціўшы чысты прыбытак у кішэню. Можна яшчэ згадаць і катлеты, якія, перабазіраваўшыся з абеду, дзе яны каштавалі 70 капеек, на вячэру, дзе яны каштуюць ужо два рублі (я маю на ўвазе рэстараны, якія працуюць удзень як сталоўкі), прыносяць немалы даход сваім стваральнікам. Можна ўспомніць карбюратары, якія ў «Сельгастэхніцы» каштуюць 6 рублёў, а на тэхабслугоўванні — 22 рублі. Першыя знайсці немагчыма, а другія — калі ласка.

Кожны чытач, думаю, здольны гэтыя прыклады працягваць да бясконцасці.

ХАЙ БУДЗЕ РАДАСНАЙ СУСТРЭЧА

Закончыўшы гастролі ў Віцебску, Калінінскі дзяржаўны драматычны тэатр дзён колькі назад прыехаў у сталіцу Беларусі. Выступленні ў вашай рэспубліцы, тым больш — у год 40-годдзя Вялікай Перамогі, — сур'ёзнае, вельмі адказнае творчае выпрабаванне для тэатра.

Калектыў наш мае багаты творчы вопыт, свае традыцыі. Тэатр у колішняй Тверы пачаў працаваць з 1921 года, першымі ж сваімі спектаклямі — «Вялікі камунар», «Містэрыя-буф», «Любоў Яравая» — далучыўшыся да барацьбы за новае жыццё ў краіне. Выдатныя майстры, будучыя народныя артысты РСФСР Н. Ганчарова, І. Лабанаў, В. Бранскі былі ядром яго трупы.

Прадаўжальнікі лепшых традыцый, вядучыя майстры сённяшняга Калінінскага драматычнага, удзельнічаюць у гастрольных спектаклях, што іграюцца на сцэне мінскага Акруговага Дома афіцэраў. Гэта народная артыстка РСФСР А. Вольская, заслужаныя артысты рэспублікі М. Бутрэхін, В. Гатаеў, Н. Хоніна, А. Чуйкоў, К. Ючанкоў і інш. На афішы — нашы лепшыя пастаноўкі.

Галоўная работа сезона — спектакль «Нашэсце» Л. Лявонава, якім 3 ліпеня адкрыліся гастролі. Пастаноўку ажыццявіла галоўны рэжысёр тэатра народная артыстка РСФСР В. Яфрэмава. Адметны для нашага творчага жыцця спектакль «Не спіцца начамі», прысвечаны вясковаму жыццю. Сама п'еса (аўтары А. Аўсянікаў і М. Міхайлаў) стваралася непасрэдна ў тэатры, працуючы над яе ўвасабленнем, калектыў неаднаразова сустракаўся з працаўнікамі сяла, дырэктар саўгаса «Мядноўскі» А. Прыткоў быў кансультантам гэтай работы. Спектакль «Не спіцца начамі» — лаўрэат леташняга Усерасійскага фестывалю «Вобраз сельскага працаўніка ў драматургіі і на сцэне».

Па п'есах нашых сучаснікаў — спектаклі «Начныя забавы» В. Мярэжкі, «Змеялоў» Л. Карэліна.

Тэатр стала працуе і над класікай. Лаўрэат сёлетняга фестывалю драматургіі А. Чэхава — спектакль «Вішнёвы сад». Асаблівую цікавасць да яго прываблівае выкананне ролі Ранеўскай народнай артысткай РСФСР В. Васільевай, запрошанай для гэтай работы з Маскоўскага тэатра сатыры. Замежная класіка прадстаўлена ў нашай афішы «Дэкамеронам» Г. Бакачыо, увасобленым на сцэне народным артыстам РСФСР Б. Галубоўскім, галоўным рэжысёрам Маскоўскага тэатра імя М. В. Гогаля. Поспех у гледача мае «Каханне пад вязамі» Ю. О'Ніла, маладзёжны спектакль па п'есе П. Марыво «Гульня кахання і выпадку». Адна з нядаўніх прэм'ер «Д—Р» («Доктар філасофіі») Б. Нушыча.

Маленькім гледачам адрасаваны казкі «Руслан і Людміла» паводле А. Пушкіна і «Баба-Яга супраць» Э. Успенскага (пра героя Маскоўскай Алімпіяды мядзьведзяня Мішу).

Калектыў нашага тэатра не ўпершыню ў Мінску. Мы рады гэтай сустрэчы і спадзяёмся, што мастацтва Калінінскага драматычнага знойдзе водгук у сэрцах мінчан.

Народная артыстка РСФСР В. Васільева (Ранеўская) і заслужаны артыст В. Гатаеў (Яша) у «Вішнёвым садзе»

Фота Ю. ЧАМАВА.

Р. ДЗКУЯ,
загадчык літаратурнай часткі тэатра.

ЗАПРАШАЕ ГДР

У гэтыя дні кожны лёгка можа пабываць у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Для гэтага няма патрэбы збірацца ў далёкую дарогу, наведваць аэрапорт ці вакзал. Праўда, без білета ўсё ж не абысціся, але набыць яго зноў жа лёгка—дастаткова толькі наведаць касу мінскага кінатэатра «Масква», а потым зайсці ў яго за некалькі хвілін да пачатку сеанса і, калі ласка, — знаёмства з ГДР пачнецца.

У фае аднаго з буйнейшых кінатэатраў беларускай сталіцы адкрылася выстаўка турыстычнай фірмы «Райзебюро», якая называецца «ГДР — краіна турызму, краіна сяброў». Арганізатары гэтай прадстаўнічай экспазіцыі — Галоўнае ўпраўленне БССР па замежным турызме, Беларускі рэспубліканскі савет прафесіянальных саюзаў, Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спадарожнік» ЦК ЛКСМБ, Мінскае аб'яднанне Дзяржкамінтурыста СССР і Беларускае аддзяленне савецкага таварыства дружбы з ГДР.

Маляўнічыя матэрыялы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, расказваюць пра знакамітыя мясціны Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, знаёмяць з непаўторнымі краявідамі, культурнымі цэнтрамі і цэнтрамі турызму.

П. ЛЕПІЧ.

Прэм'ера ў «Кастрычніку»

У мінскім кінатэатры «Кастрычнік» адбылася прэм'ера фільма «Ідзі і глядзі» сумеснай вытворчасці кінастудый «Беларусьфільм» і «Масфільм». У аснову двухсерыйнай стужкі пакладзена «Хатынская аповесць» А. Адамовіча.

Перад пачаткам сеанса гледачы сустрэліся з рэжысёрам фільма Э. Клімавым, А. Адамовічам, іншымі членамі творчай групы.

В. АСТРЫНСКІ.

Можа здацца, што я гавару пра нейкія нязначныя дробязі. Але ж з мноства такіх дробязей і складаецца наша жыццё, і мы, літаратары, не маем права іх не заўважаць. І не трэба баяцца, што нехта нас няправільна зразумее, калі мы будзем актыўна выкрываць недахопы. Асабліва гэта важна для пісьменнікаў-сатырыкаў. «Калі сатырык звяртае ўвагу на шчэлкі ці на яшчэ якія-небудзь недаробкі ў сваім доме, — пісаў я ў эпілогу да сваёй п'есы «Пагарэльцы»,— то яму не трэба даказваць, што ён добры, што ён наш, свой. Ніхто ў гэтым не сумняваецца».

Неяк Іон Друцэ сказаў, што самы востры канфлікт у драматургіі цяпер — гэта супярэчнасць паміж матэрыяльным і духоўным узроўнем. Я б сказаў, што гэта толькі адзін з канфліктаў, надзвычай небяспечны для нашага грамадства. Але ёсць і другі, не менш, а можа быць, нават яшчэ больш небяспечны: разыходжанне паміж словам і справай. Кажуць адно, а робяць другое. Значыць, кажуць праўду, а робяць хлусню? На фальшывым падмурку нельга ставіць вялікі трывалы будынак — ён абавязкова разваліцца. Цвёрдым словам моцная і ўлада, і ўзведзены будынак, і напісаны твор.

У АСНОЎНЫМ пішу пра сяло, таму натуральна, што ўсе праблемы, звязаныя з сельскай гаспадаркай, мяне вельмі хвалююць. Тут маса нявырашаных пытанняў. Але мяне найбольш цікавіць вось якое: чаму людзі ідуць з калгасаў, чаму селянін (што б там ні пісалі і ні казалі) рвецца ў горад, парывае са сваім мінулым, з устойлівымі традыцыямі? Цэлы клас ідзе з вёскі. Гэта сапраўдная драма! Або такая праблема. Мы змагаемся за павышэнне прадукцыйнасці працы ва ўсіх сферах дзейнасці. Вядома, што для паспяховага развіцця сельскай гаспадаркі сабекошт сельскагаспадарчай прадукцыі пастаянна павінен паніжацца. У нас жа ён павышаецца. Чаму? Вось пра гэта і надумаў пісаць п'есу. Але жыццё, як гэта часта бывае, умешваецца ў нашы планы. Вырашыў сваю п'есу пакуль што адкласці — Харчовая праграма, разлічаная да 1990 года, датычыць менавіта ўсіх тых непарадкаў, канфліктаў, тых вельмі важных пытанняў, якія хвалююць усіх нас і якія ў выніку яе выканання павінны быць зняты. Але ж важна не толькі правільна мысліць, але і правільна дзейнічаць. Гэтая пастанова, як і ўсякая іншая, разлічана на добрых, сумленных і справядлівых людзей. Літаратура і мастацтва могуць і павінны садзейнічаць стварэнню маральнай атмасферы, у якой такім людзям лёгка дыхалася б.

Іншы раз адно чужароднае слова можа перакрэсліць усю аўтарскую задуму. Так было з маёй п'есай «Таблетку пад язык». У адным з тэатраў іншы рэпетыцыі, усё было спакойна, і я збіраўся ехаць на адпачынак. Напярэдадні апошняга прагону мне патэлефанаваў акцёр, які выконвае галоўную ролю — ролю старшыні калгаса, — і кажа: «Андрэй Ягоравіч, я тут адно слоўка прыдумаў, яно створыць дадатковы каларыт вобразу. Можна, я яго ўстаўлю у ролю?» Я легкадумна згадзіўся, бо вырашыў, што гэта будзе якая-небудзь нявінная фраза тыпу «забадай цябе камар». Нарэшце апошняя рэпетыцыя, і што ж я чую? Прыходзіць да старшыні бухгалтар, гаворыць пра свае непаладкі, пра калгасныя справы. «Дыхні!» — кажа старшыня. Прыходзіць даярка, расказвае пра тое, што ёй кароў няма чым карміць, а ёй у адказ «Дыхні!» І так заканчваецца любая рэпліка галоўнага персанажа п'есы. Тым самым перакрэсліваецца вобраз старшыні, чалавека прамога, сумленнага, у вышэйшай ступені заклапочанага патрэбамі сялян, але вымушанага прыстасоўвацца да пэўных акалічнасцей. Слова «дыхні» ўводзіць яго ў зусім іншы рад—у рад нізкіх людзей, якія не вераць людзям.

Рэзюме гэтая павучальная гісторыя не патрабуе. І так усё зразумела.

У НАС ЦЯПЕР вельмі шмат добрых драматургаў — розных, не падобных адзін да аднаго. І. Друцэ са сваёй незвычайна тонкай адчувальнасцю на ўсё, што дзеецца на свеце; Н. Думбадзе, такі грузінскі і ў той самы час такі агульначалавечы; Ч. Айтматаў — суровы рыцар сумлення і справядлівасці; В. Розаў са сваім уменнем беспамылкова трымаць руку на пульсе часу; рамантычны, схільны да прыпавесці Мустай Карым; М. Рошчын, якому ўласціва абвостранае пачуццё дабраты, чыстаты, прыстойнасці, чалавечай годнасці...

Сёння вельмі цікава распрацоўваецца ў драматургіі гістарычная тэма. З вялікай павагай стаўлюся да таго, што робіць М. Шатроў, да яго грамадзянскай пазіцыі. Ён выконвае вельмі высакародную місію, нагадваючы нам сёння пра тое, што завяшчаў У. І. Ленін. Плённа працуе М. Зарудны, уваскрашаючы гісторыю Украіны. У нас на Беларусі цікава мысліць і працуе малады драматург А. Дудараў, з больш старэйшага пакалення А. Петрашкевіч, чые п'есы адкрыта публіцыстычныя і злабадзённыя.

Я даволі шмат перакладаю п'ес на беларускую мову. Поле дзейнасці тут велізарнае, важных і патрэбных п'ес вельмі шмат — толькі паспявай перакладаць і ставіць. Зараз ажыццяўляю-даўнюю сваю мару — перакладаю «Самазабойцу» М. Эрдмана...

ШТО ТАКОЕ «тэатральны пісьменнік»? Асаблівасці нашага рамяства, перш за ўсе ў тым, што п'еса становіцца фактам грамадскага жыцця толькі тады, калі трапляе ў святло рампы. Таму адносіны «аўтар — тэатр» хвалюе кожнага драматурга. Самая большая каштоўнасць п'есы камедыёграфа-сатырыка ў навізне і ступені сацыяльнай значнасці канфлікту. Іначай навошта брацца за пяро? Бывае часам, калі працуеш, адчуваеш сябе дужым, гэткім воінам, змагаром. Прыносіш п'есу, а табе кажуць: няма такіх канфліктаў у жыцці і герояў такіх няма. Вось і разбярыся: ці то ты б'еш, ці то цябе б'юць.

Я ўжо не кажу пра тое, што стала «притчей во языцех»: праходжанне п'есы ў розных ведамствах і міністэрствах. Як можа драматург увасабляць канфлікт, што хвалюе ўсіх сёння, калі яго п'еса знаходзіцца ў дарозе не менш чым два гады?

Наступная стадыя — тэатр. Тут свае складанасці, якія вынікаюць у асноўным з пяцігадовага планавання. Вядома, можна запланаваць на пэўны перыяд пастаноўку класічных твораў — з гэтым усё зразумела. А як быць з сучаснымі драматургамі і п'есамі? Вось і пакідаюць для іх славутыя «дзіркі» ў рэпертуары. І атрымліваецца бязглуздзіца: дзенебудзь у каго-небудзь ляжыць п'еса новага Вампілава, а дзірку ў тэрміновым парадку затыкаюць якой-небудзь дробяззю.

Ну, а далей, як ужо прадбачыць спакушаны чытач, пойдуць нараканні з нагоды рэжысёраў. Добрых рэжысёраў сапраўды мала. Іх трэба рыхтаваць доўга, сур'ёзна, дбайна, выбіраючы літаральна па крупінках. Ды і жыццёвы вопыт, на мой погляд, ім проста неабходны. І зноў парадокс. Пры такім дэфіцыце многія сапраўды цікавыя рэжысёры, скажам, А. Васільеў ці Марозаў, не маюць сваіх тэатраў. Гэта не значыць, што яны сядзяць без работы, іх запрашаюць у розныя тэатры на пастаноўкі, але адкуль жа тут узяцца калектыву аднадумцаў, які ёсць адна з зарук поспехаў?

Калі Леніну задалі пытанне пра тое, што нам заменіць царкву, калі мы яе адлучым ад дзяржавы, ён задумаўся, а потым адказаў: тэатр. І людзі прыходзяць сёння ў тэатр, як колісь прыходзілі ў храм. Тут відзён самы малы фальш, найменшая хлусня — яркае святло рампы мае падабенства з гіганцкім павелічальным шклом. І для гледача не мае значэння, чыя гэта мана — драматургава, рэжысёрава ці акцёрава. Таму я, як і кожны тэатральны пісьменнік, мару аб такім адмысловым трыадзінстве. І калі яно адбылося, дык ты і на сотым, як і на двухсотым, спектаклі з хваляваннем заўважаеш, як глядач і смяецца, і радуецца, і абураецца менавіта там, дзе табе хацелася б. Калі цябе разумеюць — гэта і ёсць шчасце для чалавека творчага.

ЛЮБІМАЕ пытанне журналістаў — «як вы ставіцеся да папулярнасці?» Думаю, што да папулярнасці ўсе, і я, ставяцца някепска. Але ў сувязі з гэтым заўжды ўспамінаю гісторыю, якая здарылася са мною ў раннім дзяцінстве. Мне было тады пяць гадоў. Мой дзядзька пасадзіў мяне на каня. Эмацыянальная памяць захавала гэтае адчуванне — верхам, на кані, над усімі! Вышэй за дзядзьку, вышэй за плот, вышэй за страху, нават вышэй за каноплі! І раптам адкуль ні вазьміся з канапель на сцежку выскачыла рабая свіння. Конь як стане на дыбы! І з такой вышыні — ды на зямлю. Потым галасіла мама, нехта мяне вадой паліваў, зачэрпнутай з лужыны. Ні каня, ні страхі, а каноплі — як лес... З таго часу я цвёрда ведаю: як бы ўпэўнена ні сядзеў, як бы ўчэпіста ні трымаўся за грыву, не забывай, што ў любы момант можа выскачыць рабая свіння і перабегчы табе дарогу. Таму што, схапіўшыся за грыву, не трэба думаць, што трымаеш бога за бараду.

З каня я злез, каноплі ўжо не здаюцца лесам, і лічу, што за рабочым сталом — самая ўстойлівая пазіцыя.

Публікацыя Б. ТАРОШЧЫНАЙ.

МУЗЫКА

ЗАЛА АПЛАДЗІРАВАЛА СТОЯЧЫ

Афішы паведамлялі пра канцэрт ў Мінску Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Армянскай ССР. Вабіла магчымасць пазнаёміцца з мастацтвам аднаго з адметных выканаўчых калектываў краіны і саліста, таленавітага маладога скрыпача, лаўрэата міжнародных конкурсаў Лявона Амбарцумяна, якія ўпершыню выступалі ў сталіцы Беларусі. Безумоўна, цікавасць слухачоў выклікала і праграма, якая ўключала «Фантастычную сімфонію» Г. Берліёза, Другую сюіту з балета «Дафніс і Хлоя» М. Равеля, Другі скрыпічны канцэрт Б. Бартака. Творы гэтыя досыць рэдка гучаць з канцэртнай эстрады. Імя ж галоўнага дырыжора аркестра, заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР, народнага артыста Паўночна-Асецінскай АССР, лаўрэата прэміі «Фонд Герберта фон Караяна» Валерыя Гергіева ўжо добра вядомае ў нашай рэспубліцы. Адразу скажу, канцэрт гасцей апраўдаў нашы спадзяванні: адбылося сапраўднае свята музычнай творчасці.

Мастацкая інтэрпрэтацыя музыкі вызначалася бездакорным адчуваннем стылю. Цяжка сказаць, што ўразіла найбольш. У іх выкананні імпрэсіяністкае палатно М. Равеля прывабіла тонкім каларытам, артыстычнасцю, прыгожай, філіграннай апрацоўкай дэталей. Рамантычная інструментальная драма Г. Берліёза — насычанасцю гучання, эмацыянальнай выразнасцю інтанацый, якія часам асацыіраваліся з жывой чалавечай гаворкай. З бляскам была ўвасоблена яркая гукавая карціна дзікага разгулу стыхійных сіл у фінале сімфоніі. Безумоўна, выкананне гэтага твора было кульмінацыяй канцэрта.

У выкананні віртуознага, пазначанага свежым нацыянальным каларытам Канцэрта Б. Бартака па-мастацку пераканаўча была перададзена вострая кантрастнасць музычных вобразаў. Ярка і тэмпераментна правёў сваю складаную партыю Л. Амбарцумян.

Такое пранікнёнае адчуванне розных мастацкіх стыляў — сведчанне высокай выканаўчай культуры калектыву. Таму гаварыць пра выдатны лад, цудоўную ансамблевую тэхніку, думаецца, было б проста лішне. Аднак адну прафесійную асаблівасць, якая літаральна ўразіла мінскіх аматараў музыкі, адзначу: манеру ігры на драўляных духавых інструментах, гучанне якіх выклікала ў памяці легенды аб народных выканаўцах-дудукістах, якія іграліі «без дыхання». Наогул, знаёмства з мастацтвам армянскага калектыву пераканала ў тым, што ён мае сваё аблічча, самабытны нацыянальны характар. У выканаўчым стылі калектыву прываблівающь таксама адухоўленасць адной ідэяй, яркая кідкасць кантрастаў, жывапіснасць, эмацыянальная паўната.

Радаслава АЛАДАВА.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Павел ПРУДНІКАЎ

Невядомыя героі

Пра вайну мы не ўсё яшчэ
знаем
І пра безліч панесеных
страт.
Мы па ранах яе ўспамінаем
Ды па брацкіх магілах
салдат.

Пра вайну горы кніг напісалі—
Ад маленькіх да тоўстых
тамоў,—
Ды не ўсё пра яе расказалі.

І пра тых вельмі мала сказалі,

Хто з яе не вярнуўся дамоў.
Не пра ўсе расказалі Хатыні,
Пра Асвенцімы і Трасцянцы,
Як мужнелі мы ў полымі,
стыні,
Як сцякалі крывёю байцы.

Пра «катлы» Сталінграда
і Мінска,
Пра падзеі на Курскай дузе
Нам нагадваюць скрозь
абеліскі,
Патанаючы ў скрусе, тузе.

Колькі спіць невядомых
герояў
Па палях, па балотах, лясах!
Іх знаходзім пад кожнай
гарою
І ў лагах, дзе іскрыцца раса.

Не, не ўсё пра вайну яшчэ
знаем.
Мы пакуль у вялікім даўгу
Перад тымі, што ў спёку
і ў замяць
Неразлучна ішлі побач з намі
І згарэлі ў пякельным
кругу...

Перапёлка

Зноў у росным ліпені, на золку,
Калі ноч губляе сваю моц,
Чую ў жыце голас перапёлкі —
Незабыўны голас «віць-палоць».

Нагадаў ён мне маё дзяцінства
І юнацтва ранняга гады...
Былі дух з развагай у адзінстве
І узлёт пачуццяў маладых.

На начлег вадзіў тады я коней,
Слухаў казкі кемлівых сяброў.
На світанку я не спаў ніколі,
Захапляўся гоманам дуброў.

І, канечне ж, слухаў з асалодай
Птушкі любай голас
«віць-палоць».
Я забыў пра ўсе мае прыгоды,
А яна ж мне мроіцца штоноч.

Праляцела болей за паўвека
З той далёкай казачнай пары,
А той голас, ледзь закрыю
вейкі,
Мне прыносіць радасці дары.

Запявалы

Прыляцелі шпакі-запявалы,
Не забылі свой кут і свой
«дом».
Дзе б яны ні былі, ні ляталі,
А вярнуліся ў тое ж гняздо.

Так і мы, куды б лёс ні заносіў,
Зноў вяртаемся ў «гнёзды»
свае.
Хай вясна гэта будзе ці восень
Родны кут да сябе нас заве.

●

Калі зноў ты не ў гуморы,
Сваіх дум не варушы.
Слухай гоман-песню бору —
Палягчэе на душы.

Пакланіся нізка соснам
Ды бярозкам маладым,
І табе не будзе млосна
Ў пасівелыя гады.

Зноў настрой у госці прыйдзе,
Як у лепшыя часы,
І не стане месца крыўдзе,
Што у сэрцы ты насіў.

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

Новыя імёны

У Лідзе прайшоў рэспубліканскі конкурс выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Мэта гэтага конкурсу — далейшае паляпшэнне работы з творчай моладдзю, выяўленне маладых таленавітых выканаўцаў і ўдасканаленне прафесійнай падрыхтоўкі навучэнцаў музычных навучальных устаноў. Удзельнічалі ў ім 70 прадстаўнікоў сярэдніх спецыяльных музычных навучальных устаноў. (На жаль, у конкурсе не прымала ўдзел толькі Рэспубліканская школа-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве імя І. Ахрэмчыка).

Вынікі двух тураў паказалі, што ў Беларусі ёсць група маладых даравітых выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах: яны ў далейшым змогуць паспяхова абараняць гонар рэспублікі на міжрэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах, калі будуць мэтанакіравана ўдасканальваць сваё прафесійнае майстэрства.

Самым яркім уражаннем конкурсу была ігра вучня 10 класа Сярэдняй спецыяльнай музычнай школы пры БДК Юрыя Лікіна (габой), які прадэманстраваў высокі выканаўчы ўзровень, адточаную тэхніку, валоданне сучаснымі сродкамі мастацкай выразнасці, роўнасць і прыгажосць гучання інструмента ва ўсіх рэгістрах. Кожны тур яго выступленняў быў аднагалосна ацэнены членамі журы вышэйшым балам — 25. Яму прысуджаны спецыяльны прыз за віртуознасць.

Удала выступіў, заваяваўшы прыз гледачоў, дзевяцікласнік гэтай жа школы кларнетыст Яўген Ягудзін. У яго — належныя дадзеныя, каб быць прэтэндэнтам на ўдзел у міжрэспубліканскім конкурсе: выдатная тэхніка, тонкае адчуванне фразы, выдатная памяць, сцэнічная раскаванасць, артыстызм.

Добры выканаўчы ўзровень паказалі трамбаністы, сярод якіх асабліва вылучыўся выпускнік Магілёўскага музычнага вучылішча Сяргей Сцелькін. Трамбон у яго гучыць поўным, прыгожым і вельмі мяккім гукам, іграе музыкант інтанацыйна чыста, мае добрую тэхніку.

Былі свае лідэры і ў трубачоў. Гэта Анатоль Літвінчук, навучэнец III курса Брэсцкага музычнага вучылішча, і Андрэй Купрыянаў, навучэнец III курса Магілёўскага музычнага вучылішча. Аднак ім яшчэ трэба шмат працаваць, каб пазбегнуць выпадковых «агрэхаў» пры выкананні твораў кампазітараў-класікаў.

Выканаўцы на ўдарных інструментах Алег Роўда, выпускнік Брэсцкага музычнага вучылішча, і Сяргей Лазарэнка, выпускнік Магілёўскага музычнага вучылішча, паказалі добрае валоданне ўсімі ўдарнымі інструментамі, стабільнасць і дакладнасць выканання аўтарскіх указанняў у нотным тэксце. Безумоўна, таленавіты і артыстычны (атрымаў прыз за артыстычнасць) выпускнік Мінскага музычнага вучылішча Валерый Жаўнерчык. Ды, на жаль, у час выступленняў не ўсе ўдарныя інструменты ў яго гучалі ярка, дапускаў ён і пэўныя «адвольнасці» ў тэксце.

На добрым прафесійным узроўні выступілі тубісты Аляксандр Жаўнерчык (Маладзечна) і Франц Садоўскі (Наваполацк): думаю, яны могуць стаць адметнымі аркестравымі музыкантамі.

А якія ж агульныя вынады можна зрабіць на падставе праведзенага конкурсу?

Высокай ацэнкі вартая работа аддзялення духавых інструментаў ССМШ пры Белдзяржкансерваторыі (загадчык аддзялення Л. Гучак). Яно, як паказаў конкурс,—вядучае ў рэспубліцы па падрыхтоўцы кваліфікаваных выканаўцаў на духавых інструментах. З дзевяці ўдзельнікаў II тура восем атрымалі званні лаўрэатаў. Пераканаўчым было выступленне прадстаўнікоў Мінскага музычнага вучылішча. З васьмі ўдзельнікаў II тура шасцёра атрымалі званні лаўрэатаў.

Больш значным, чым на мінулым конкурсе, было выступленне прадстаўнікоў Магілёўскага музычнага вучылішча. Дала вынік карпатлівая і мэтанакіраваная работа выкладчыкаў (загадчык аддзялення М. Міхлін) пасля крытычных заўваг, выказаных на мінулым конкурсе выкладчыкамі кафедры духавых інструментаў кансерваторыі і прадстаўніком Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі. Усе пяцёра ўдзельнікаў II тура сталі лаўрэатамі.

Пацвердзілі сваю добрую рэпутацыю навучэнцы Маладзечанскага музычнага вучылішча: з чатырох удзельнікаў II тура трое атрымалі званні лаўрэатаў. Шкада, што сярод прызёраў даўно няма маладзечанскіх фагатыстаў, флейтыстаў.

Своеасаблівая традыцыя — на кожным рэспубліканскім конкурсе дзіцячых музычных школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў рэспублікі выхаванцы педагога Брэсцкага музычнага вучылішча В. Грыгарука займаюць вядучае месца. Маладым педагогам-ударнікам у іншых нашых навучальных установах варта было б вывучыць педагагічны вопыт і метадычныя прынцыпы В. Грыгарука.

На жаль, не паказваюць належнага ўзроўню выкладчыкі аднаго са старэйшых музычных вучылішчаў рэспублікі — Гомельскага. З пяці ўдзельнікаў-гамяльчан толькі валтарніст Р. Кот выйшаў на 3-е месца (клас педагога В. Дубянка). На мінулым жа рэспубліканскім конкурсе ўсе тры ўдзельнікі засталіся без узнагарод. Ёсць над чым падумаць выкладчыкам ад паведнага аддзялення Гомельскага музвучылішча... Сціплыя дасягненні і ў Лідскага музычнага вучылішча. З пяці ўдзельнікаў адзначаны толькі кларнетыст С. Гаель (3-е месца, клас педагога М. Ткачова). Грамату атрымаў трамбаніст Віцебскага музычнага вучылішча В. Кузьменка (клас педагога В. Балтушэнкава)— астатнія восем удзельнікаў-віцябчан паказалі сярэдні выканаўчы ўзровень.

Ужо на двух рэспубліканскіх конкурсах не мае лаўрэатаў Баранавіцкае музычнае вучылішча. З дзесяці ўдзельнікаў ужо двух рэспубліканскіх конкурсаў навучэнцы Гродзенскага музычнага таксама не маюць лаўрэатаў. Сціплыя паказчыкі аддзялення духавых інструментаў і па падрыхтоўцы абітурыентаў для музычных ВНУ. За 9 апошніх гадоў паступіла ў кансерваторыю восем выпускнікоў Гродзенскага музычнага вучылішча: гэта адзін з самых нізкіх паказчыкаў сярод сярэдніх навучальных устаноў рэспублікі.

Ніжэй усялякай крытыкі справа ў Мазырскім вучылішчы, дзе падрыхтоўка выканаўцаў на духавых інструментах — сур'ёзная праблема. За 9 гадоў тут падрыхтаваны толькі 4 абітурыенты для кансерваторыі. Выкладчыкі кафедры духавых інструментаў БДК абмяркоўвалі такое становішча і прынялі захады, накіраваныя на аказанне метадычнай і практычнай дапамогі педагогам і навучэнцам Мазырскага музычнага вучылішча.

Сёлетні конкурс яшчэ раз пацвердзіў, што ў рэспубліцы па-ранейшаму нездавальняюча вядзецца падрыхтоўка фагатыстаў. Слабы ўзровень паказалі і валтарністы, хоць у рэспубліцы дастаткова вопытных і кваліфікаваных выкладчыкаў па гэтай спецыяльнасці.

А яшчэ конкурс паказаў, што паспяхова вырашаецца пытанне набыцця высакаякасных духавых інструментаў, хоць пытанне гэтае і застаецца на парадку дня. Горш справа з ударнымі інструментамі. Навучэнцы не забяспечаны дабраякаснымі двухраднымі ксілафонамі, вібрафонамі, іншымі ўдарнымі інструментамі. Нават таленавіты выканаўца не зможа на ўдарных інструментах нізкай якасці іграць яскрава, уражальна.

Увогуле ж рэспубліканскі конкурс, які прайшоў у Лідзе, паказаў, што за апошнія тры гады вырас агульны ўзровень выканальніцтва амаль на ўсіх духавых інструментах, з'явілася група здольных і таленавітых музыкантаў. Лаўрэаты гэтага конкурсу «рангам вышэй» за лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу 1982 года. Павысіўся ўзровень выканаўчага майстэрства канцэртмайстраў.

Конкурс прывабіў шматлікіх слухачоў, пазнаёміў грамадскасць рэспублікі з маладымі музыкантамі. Ён падвёў пэўныя вынікі творчай работы выкладчыкаў і навучэнцаў сярэдніх музычных навучальных устаноў рэспублікі і вызначыў чарговыя задачы ў павышэнні выканаўчага майстэрства ігры на духавых і ўдарных інструментах.

Б. НІЧКОЎ,
старшыня журы,
заслужаны артыст БССР.

ПРЫНЦЫПОВА, РАШУЧА, НАСТУПАЛЬНА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 4).

прыклад, у 13 пад'ездах абсталяваны міні-кафэ, дзе прадаецца марожанае, сокі, малочныя кактэйлі, кандытарскія вырабы і г. д.).

Сёлета намечана адкрыць яшчэ 79 спецыялізаваных чайных, пельменных, закусачных.

Кар.: — Гэта сапраўды вельмі зручна для пакупніка. Праўда, у спякотны дзень не вельмі цягне выпіць напітку з бутэлькі, што цэлы дзень грэецца на сонцы.

М. А. Макаед: — Так, у нас страшэнны дэфіцыт гандлёвага абсталявання, халадзільных установак, розных аўтаматаў, тэрасная мэблі і г.д.

К. М. Платонаў, намеснік міністра ўнутраных спраў БССР: — Што датычыць органаў унутраных спраў, дык у пастанове дакладна вызначана, што і як нам трэба рабіць, каб адолець п'янства. Адказнасць на нас ускладзена вельмі вялікая.

Кар.: — Нагадаю, Канстанцін Міхайлавіч, наступныя радкі пастановы: «Міністэрству ўнутраных спраў СССР даручана ажыццявіць меры па спыненні фактаў п'янства ў грамадскіх месцах...» Я ведаю, многія спадзяваліся, што пасля 1 чэрвеня — дня ўводу ў дзеянне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР «Аб узмацненні барацьбы з п'янствам» — апівох на нашых вуліцах паменее, п'яны чалавек не рызыкне сустрэцца з міліцыяй. Мы з вамі гутарым 25 чэрвеня, Указ дзейнічае ўжо больш як тры тыдні, а і сёння п'яны на вуліцы зусім не рэдкая з'ява...

К. М. Платонаў: — Вам хацелася б, каб за некалькі тыдняў перавыхаваліся ўсе апівохі? Мне — таксама. На жаль, працэс гэты вельмі складаны. Чаму міліцыя не затрымлівае запар усіх п'яных? Думаю, што не абавязкова затрымліваць чалавека, які хоць і выпіў, але паводзіць сябе ціха. Дастаткова зрабіць яму заўвагу, строга папярэдзіць. Ну, а тых, хто страціў чалавечае аблічча, адпраўляюць у медвыцвярэзнік або ў аддзел міліцыі, што цягне за сабой або адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе папярэджання, або штраф у памеры ад 20 да 30 рублёў, калі чалавека затрымалі першы раз. Калі ж — другі, штраф адпаведна павялічваецца ад 30 да 50 рублёў і г. д.

Кар.: Сёння п'янага затрымалі ў Першамайскім раёне Мінска, а праз тыдзень таго ж самага ў Заводскім. Там ён таксама будзе лічыцца «навічком»?

К. М. Платонаў: — Ні ў якім разе. Створана спецыяльная картатэка, куды заносяцца прозвішчы і месца працы затрыманых за парушэнне Указа. Даведку адтуль аддзел РАУС можа атрымаць у любы момант. Цяпер наконт вашай заўвагі, што п'яных усё яшчэ нямала на нашых вуліцах. Між тым, за тры тыдні чэрвеня было затрымана апівох намнога больш, чым раней затрымлівалі за цэлы месяц. Гэта не значыць, вядома, што сталі піць болей. Проста міліцыя стала больш патрабавальнай да гэтай катэгорыі грамадзян.

Хачу зрабіць адну істотную заўвагу. Нас вельмі трывожыць, што на большасці прадпрыемстваў, устаноў абыякава ставяцца да п'янства сваіх работнікаў. Аб кожным факце затрыманага п'яніцы мы паведамляем на месца яго работы, прапануючы ўздзейнічаць на парушальніка адміністрацыйнымі, калектыўнымі мерамі. На свае паведамленні мы атрымалі вельмі мала адказаў. У чым справа? Не хочуць выносіць смецце з хаты? Баяцца сапсаваць вытворчыя і іншыя паказчыкі, нарэшце, баяцца адказнасці? Скажу больш, яшчэ нярэдкія выпадкі, калі самі адказныя работнікі п'юць на службе. Вось перада мной спіс такіх асоб. Прыклады? Калі ласка. Распівалі спіртное на рабочым месцы намеснік галоўнага бухгалтара Мінскага завода зборнага жалезабетону Г. Грыпінскі, загадчыца Дома быту ў вёсцы Падароск Ваўкавыскага раёна А. Глусава разам з жанамістам спіртзавода З. Анушкам, дарэчы, сакратаром партарганізацыі і г. д. Гэта тое, што выяўлена...

Кар.: — Вось яшчэ адна вялікая праблема, Канстанцін Міхайлавіч. П'яны — за рулём. Ці ёсць тут пазітыўныя зрухі?

К. М. Платонаў: — П'яны за рулём — гэта вялікае няшчасце. З усёй адказнасцю скажу, што гэтай з'яве аб'яўлена бязлітасная вайна. Дастаткова сказаць, што за тры тыдні чэрвеня затрымана 3098 нецвярозых вадзіцеляў, 1279 з іх пазбаўлены вадзіцельскіх правоў, 821 аштрафаваны (а штраф не малы — 100 рублёў).

Што асабліва насцярожвае: сярод затрыманых 106 чалавек — службовыя асобы, якія селі за руль службовых машын у нецвярозым стане. П'яныя вялі машыны, напрыклад, Д. Клім — дырэктар саўгаса «Коханаўскі» Верхнядзвінскага раёна, П. Стаўскі — галоўны архітэктар Чэрыкаўскага раёна і г. д.

Мы аналізуем усе гэтыя факты і не можам не абурацца яшчэ і тым, што пераважная большасць нецвярозых вадзіцеляў сядзела за рулём у рабочы час. Значыць, на прадпрыемствах, дзе яны працуюць, не маглі не бачыць, у якім стане чалавек адпраўляецца ў рэйс. Бачылі — і маўчалі!

Кар.: — Я размаўляў з міністрам гандлю рэспублікі М. А. Макаедам, які гаварыў аб тым, што і гандаль сёння стаў на шляху п'яніц вялікай перашкодай, — напрыклад, не ўсюды і не ў любы час можна купіць спіртныя напіткі...

К. М. Платонаў: — П'яніцам, вядома, новы парадак продажу гарэлкі і пладова-ягаднага віна не спадабаецца. Хоць я б не сказаў, што яны пастаўлены ў безвыходнае становішча. Не так ужо і мала магазінаў, дзе спіртное прадаецца. А калі трэба, дык апівоха і ў чарзе можа пастаяць, яму часу свайго не шкада. Але справа не толькі ў гэтым. Нярэдкія яшчэ выпадкі грубага парушэння правілаў продажу спіртнога і ў горадзе, і ў вёсцы. За 20 дзён чэрвеня ў такіх парушэннях міліцыя выкрыла больш як 390 прадаўцоў.

Кар.: — Міліцыі, відаць, прыбавілася клопатаў і па выяўленні самагоншчыкаў?

К. М. Платонаў: — Што і казаць, многія з іх да апошняга часу адчувалі сябе больш-менш спакойна. Цяпер мы за іх узяліся. За тры тыдні чэрвеня за выраб самагону пакарана 639 чалавек, 237 з іх аштрафаваны на буйныя сумы.

У. І. Чыгір, старшыня праўлення Белспажыўсаюза: — Пакуль што бутэлька спіртнога застаецца таварам. Але таварам асаблівым, пры продажы яго трэба вельмі строга захоўваць правілы гандлю.

Кар.: — Ёсць праблемы ў арганізацыі кантролю за продажам спіртнога ў горадзе. У вашай жа сістэме большасць магазінаў знаходзіцца ў вёсцы, дзе, бывае, прадавец прадастаўлены сам сабе. Тут пракантраляваць захаванне правілаў гандлю куды цяжэй.

У. І. Чыгір: — Вы забываецеся, што за ўсім гэтым павінны сачыць мясцовыя ўлады, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, міліцыя. Праўленнем Белспажыўсаюза прынята пастанова, згодна з якой забаронены продаж віна-гарэлачных вырабаў у сталовых, якія знаходзяцца на прамысловых прадпрыемствах, а таксама ў дыетычных, малочных, маладзёжных, кандытарскіх кафэ.

Кар.: — У народзе кажуць: як свіння заўсёды знойдзе лужыну, так і п'яніца — дзе набрацца гарэлкі... І вялікай праблемы для яго тут няма — магазінаў, дзякаваць богу, у нас хапае.

У. І. Чыгір: — Думаю, што і ў вёсцы, і ў раёне апівоху сёння разгуляцца стала цяжэй. Чаму? Больш як сем тысяч магазінаў і прадпрыемстваў грамадскага харчавання спынілі продаж спіртных напіткаў. Строга забаронены продаж алкаголю праз аўтамагазіны, у многіх сельскіх магазінах, якія гандлююць таварамі паўсядзённага попыту. Вось вам прыклады. У Бераставіцкім райспажыўсаюзе раней гандлявалі спіртнымі напіткамі 62 магазіны і 12 прадпрыемстваў грамадскага харчавання. Сёння — 22 магазіна, рэстаран і кафэ.

Кар.: — У вядомай усім нам пастанове ўказана, што продаж спіртных напіткаў трэба весці толькі ў спецыялізаваных магазінах або ў асобных аддзелах прадуктовых магазінаў. У сельскіх магазінах, як правіла, побач з гарэлкай стаяць кнігі, ляжыць хлеб, цукар, соль і г. д. Спецыяльна будаваць памяшканне для продажу спіртнога, відаць, не выпадае. Але ж пастанову трэба выконваць. Тут ёсць і пэўны псіхалагічны фактар — у магазін прыходзяць і дзеці, на вачах якіх дарослыя дзядзькі і цёткі купляюць віно, якое, бывае, тут жа, на месцы, і выпіваюць. Мне аднойчы давялося быць сведкам такога выпадку.

У. І. Чыгір: — Вы маеце рацыю. Мы намецілі комплекс мерапрыемстваў па пераходзе ў бліжэйшыя два гады на продаж гарэлкі і віна ў райцэнтрах, гарадскіх пасёлках і іншых буйных населеных пунктах толькі ў спецыялізаваных магазінах або аддзелах.

Кар.: — У вашай сістэме вырабляецца нямала пладова-ягаднага віна?

У. І. Чыгір: — Так, у нас тры вінзаводы, якія выпускаюць 370 тысяч дал (дал — 10 літраў) віна.

Кар.: — Праз два-тры гады выраб віна давядзецца спыніць. Як будзе выкарыстана сыравіна — яблыкі і ягады? Гэта ж тысячы тон!

У. І. Чыгір: — На вінаробчых прадпрыемствах будзе арганізаваны выраб пладовага воцату, канцэнтраваных яблычных сокаў, безалкагольных напіткаў, квасу і г. д.

У. В. Радчанка, першы намеснік міністра харчовай прамысловасці БССР: — Партыйнай пастановай прадугледжваецца, пачынаючы з 1986 года, штогадовае скарачэнне аб'ёму вырабу гарэлкі і віна. А да 1988 года поўнасцю спыніць выраб пладова-ягадных він. У нашай рэспубліцы мы мяркуем гэта зрабіць на год раней.

Кар.: — На тое ідуць горы яблыкаў і ягад. Колькі канкрэтна?

У. В. Радчанка: — 70 тысяч тон.

Кар.: — Зразумела, што яблыкі і ягады, якія ідуць на віно, не гатункавыя, у продаж іх не пусціш. Але ж з іх можна рабіць павідла, джэмы, сокі. Дарэчы, яблычны сок у нас не танны — 16 капеек шклянка...

У. В. Радчанка: — Адчувальна будзе павялічаны выпуск менавіта гэтай прадукцыі. Вы не ўспомнілі безалкагольныя напіткі. Многія з іх робяць на аснове канцэнтраваных яблычных, журавінных, бруснічных, клубнічных сокаў... У 1987 годзе мы будзем выпускаць да 400 тысяч дэкалітраў безалкагольных напіткаў на аснове дзікарослых пладоў і ягад. А ўсяго плануецца давесці выпуск безалкагольных напіткаў у 1987 годзе да 15 мільёнаў дэкалітраў.

Кар.: — Я далёкі ад думкі, што апівоху шклянка ліманаду заменіць шклянку віна. І ўсё-такі вельмі правільна ставіцца пытанне аб павелічэнні вытворчасці безалкагольных напіткаў, таго ж квасу, напрыклад. Я ведаю людзей, якія становяцца ў чаргу за півам, дарэчы, алкагольным напіткам (сярод яго аматараў мала непітушчых), таму што побач няма квасу, а на вуліцы гарачыня і вельмі хочацца піць. Вы, відаць, самі бачылі, якія чэргі ў спякотныя дні выстройваюцца за квасам.

У. В. Радчанка: — Сапраўды, ёсць раёны, дзе мы квасу наогул не робім — няма неабходнага абсталявання. Праўда, наша прамысловасць вырабляе канцэнтрат хлебнага квасу ў бутэльках. Летась яго было прададзена 1.132 тыс. літраў. З кожнага літра канцэнтрату можна зрабіць 10 літраў квасу...

Кар.: — Сапраўды, бутэлькі з тым канцэнтратам свабодна стаяць у магазіне, а побач, на вуліцы, чарга ля бочкі з квасам...

У. В. Радчанка: — Разам з тым, нашы цэхі па вырабе гэтага напітку выкарыстоўваюцца ў рэспубліцы толькі напалову. А ў Мінску, напрыклад, наогул на 22 працэнты. Уяўляеце? Гандаль нам дыктуе попыт. Колькі заказваюць, столькі даямо...

Інтэрв'ю ўзяў
М. ЗАМСКІ.

АД РЭДАКЦЫІ:

У гэтых інтэрв'ю закрануты самыя розныя аспекты барацьбы з п'янствам і алкагалізмам — ад праваахоўнага і медыцынскага, да гандлёвага і вытворчага.

Як меў магчымасць заўважыць чытач, у гэтай, сёння найважнейшай справе, ёсць яшчэ нямала праблем. Што б ні казалі кіраўнікі гандлёвых ведамстваў, але і ў горадзе, і ў вёсцы гандаль усё яшчэ ў значнай ступені арыентуецца на пакупніка—аматара выпіўкі. Яго антыпод пакуль што адчувае сябе няўтульна ў многіх кафэ, закусачных, шашлычных, бутэрбродных, барах, дзе спіртныя прэвалююць.

Вельмі насцярожваюць шматлікія факты парушэння правілаў гандлю гарэлкай і віном. Тым больш, што нават унушальная лічба, якую называе К. М. Платонаў, — гэта толькі тое, што выяўлена. А колькі не выяўлена?!

Не можа не устрывожыць і яго крытычная заўвага наконт таго, што на многіх прадпрыемствах дасюль мірацца з п'янствам, хаваюць ад грамадскасці гэтыя факты.

Так, вакол п'яніцы яшчэ не створана абстаноўка нецярпімасці. Ён яшчэ спадзяецца, што ўсё гэта толькі чарговая кампанія, яную можна спакойна перачакаць. Трэба пазбавіць яго гэтай надзеі.

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Яўгенія МАЛЬЧЭЎСКАЯ

Залежнасць

Мая дарога за бацькоўскім
домам—
Святая сувязь з роднаю
зямлёй.
На ёй залежнасць вырасла
свядома
Ад усяго, што блізка і знаёма,
І я заўсёды ўдзячна буду ёй.

І чым жыву, з чым звязана
заўсёды,
Прад тым заўжды застануся
ў даўгу.
Залежу ад вясны і непагоды,
Ад старажытнай мудрасці
прыроды,
Ад коласа залежнасць
берагу.

Залежу ад нясказанага слова,
І ад сяброў, і ворагаў сваіх,
Ад шуму траў, ад гоману
ляснога,
Ад усяго звычайнага, зямнога,
Ад вас, людзей, і грэшных,
і святых.

Надзейна так залежу
ад работы,
Ад страт і ад любога адкрыцця.
Залежу так, што, ўсё згубіўшы,
потым
Не будзе нават існаваць ахвоты,
Не будзе нават сэнсу
для жыцця.

●

Ноч, нібыта на сцішаным
беразе,
Пакідае пакой.
Можа, гэта ад белага ветразя
У душы неспакой.

Можа, проста пастукала
раніца
І застыла ў акне.
Я у верасень крочу
настаўніцай,
Як сустрэнуць мяне?
У сабе мову дзіўную, матчыну,
Як таемнасць, нашу.
Абуджаю Купалавай спадчынай
За душою душу.

●

Жыве свой сэнс у кожным
адкрыцці,
Напрамак мае кожная сцяжына,
Яна з зямлёй бацькоўскай—
сарцавіна,
Не разарваць і ўбок
не адысці.

Ўсе фарбы і адценні у жыцці
З гадамі бачыш іншымі вачыма.
Пражыць жыццё—не поле
перайсці,
А абмінуць, тым болей,
немагчыма.

Ідуць са мною побач землякі,
Вядзе удаль жыццёвая
сцяжына.
А родны дом—маленькая
айчына
Глядзіць услед з-пад
матчынай рукі.

●

Свінцовы град апальвае траву,
Свідруюць неба грозныя
ракеты...
І ўжо расце над сэрцам
у планеты
Той смертаносна-рэактыўны
ціск.

А я жыву. І гэта я жыву?!
А я ж магу не жыць на гэтым
свеце...
Я завяззю з'явілася на веццi
Усяго жыцця, каб сцвердзіцца
у ім.

І каб спазнаць і нават
перайначыць.
Не пад акном апасці
на зямлю,
А каб сказаць адвечнае
«люблю»
І даць жыццё для новага
цвіцення.

Роберт БЁРНС

Багатая паэтычная спадчына выдатнага сына шатландскага народа Роберта Бёрнса даўно ўжо стала блізкай і дарагой беларускім чытачам. Бёрнс загаварыў на нашай роднай мове дзякуючы высокаму перакладчыцкаму майстэрству Я. Семяжона, які падарыў нам дзве кнігі выбраных паэм, вершаў, балад, песень, эпіграм, эпітафій вялікага паэта Шатландыі («Шатландская слава» (1958), «Вам слова, Джон Ячмень!» (1983).

У практыцы мастацкага перакладу нярэдка здараецца, што да творчасці аднаго і таго ж замежнага пісьменніка звяртаецца не адзін, а некалькі перакладчыкаў. Так, напрыклад, было з некаторымі творамі французскага паэта П. Верлена, якія на беларускую мову перакладалі М. Багдановіч, А. Лойка, А. Зарыцкі, С. Ліхадзіеўскі...

А вось паэтычная ліра Р. Бёрнса прыцягнула да сябе зусім яшчэ маладую перакладчыцу — выпускніцу Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў Галіну Дубянецкую, чые пераклады і прапануюцца сёння чытачу. Адпаведнасць зместу арыгінала, адэкватная перадача рыфмоўкі, рытмікі бёрнсаўскага верша, добрая беларуская мова — вось чым, на маю думку, заслугоўваюць увагу першыя творчыя крокі пачынаючай перакладчыцы.

Леанід КАЗЫРА.

Мелодыя — для некага

У сэрцы ціха боль жыве —
У сэрцы боль пра Некага;
Мне спаць уночы не дае
Той ціхі боль пра Некага.

О-гой! пра Некага!
О-гэй! пра Некага!

Гатовы цэлы свет прайсці
Я, каб дайсці да Некага.
Каханне чыстае, дашлі
Мой сэрца стук да Некага
Ад усіх нягод абарані
І зберажы мне Некага!

О-гой! мне Некага!
О-гэй! мне Некага!

Няма таго, чаго б не змог
Я дзеля майго Некага.

Песня пра Яну

Ва мне ўчарашні хмель не сціх —
Ды не з віна я п'яны:
Учора на грудзях маіх
Заснулі косы Яны.
Яўрэй галодны, што шалеў,
Дарваўшыся да манны, —
І ён той слодычы не меў,
Што я — ад вуснаў Яны.

Без стомы б'юцца каралі
За рэкі і саванны;
Ды што б яны ні набылі —
Не варта стану Яны.

Нашто мне бляск імператрыц
Ці ўвесь гарэм султана?
Ніколі ім не замяніць
Пяшчоты любай Яны.

О, не спяшайся, браце дзень!
Прэч, зыркая Дыяна!
Схавайце, зоркі, свой прамень,
Калі са мною Яна.
Няхай не падымаюць вей
Свяцілы ў час кахання...
Дай, ноч, анёлаў мову мне,
Каб расказаць аб Яне.

Царква і суд няхай вярзуць,
Што буду пакараны.
Няхай яны да д'ябла йдуць,
А я пайду да Яны.
У ёй — вачэй маіх святло.
І, калі б тры жаданні
Мне ў свеце дадзена было, —
Назваў бы першым — Яну!

Лямант чорнага раба

У Сенегале ў зялёным
мяне ўзялі палонным
І прадалі ў чужыну-
Вірджынію, о!
Берагоў улюбёных
мне не бачыць да скону,
Бо зусім я, зусім я знясілены, о!

На чароўнай радзіме
няма злосных зімаў,
Як у змрочнай чужыне-
Вірджыніі, о!
Там заўжды звон птушыны
І ў кветках галіны,
Ды, нябога, зусім я
знясілены, о!

Толькі здзекі ды кпіны,
толькі шрамы на спіне —
Усё, што маю ў чужыне-
Вірджыніі, о!
Толькі жаль-успаміны
ды бобам слязіны,
Бо зусім я, зусім я знясілены, о!

Дай прыгарну цябе шчыльней

Дай прыгарну цябе шчыльней,
Каб нас не разлучыла
Нішто: ні здрадны звон манет.
Ні бляск нікчэмны чыну.

Хто з дваіх?

Станіслаў Хрысціёзава

апавяданне

АДНАГО з двух намеснікаў будуць звальняць. Навіна абляцела інстытут з хуткасцю электрычнага тока, выклікала трывогу, спадзяванні, спрэчкі, зларадныя ўсмешкі або проста нармальную чалавечую прагу да перамен. Навіна гэта стала вядома Румену Антаву пасля таго, як была ўжо на языку ў самых дробных службоўцаў, якія звычайна даведваліся аб навінах апошнімі. Гэта закранула яго значна больш, чым той факт, што менавіта ён быў адным з гэтых дваіх.

Раніцай, як заўсёды, Антаў адчыніў дзверы ў кабінет за пяць мінут да пачатку работы, зрабіў два-тры кругі па свабодным ад мэблі месцы, быццам хацеў пераканацца, што ён на сваёй тэрыторыі, і толькі пасля гэтага апусціўся ў зручнае крэсла-круцёлку. Адразу ж, разлічыўшы да секунды кожны яго рух, увайшла Ніна, маладзейшая з сакратарак, паклала на стол газеты і паднесла з добра засвоенай элегантнасцю абавязковы кубачак гарачай кавы. Яе з'яўленне было той нябачнай мяжой, якая аддзяляла яго службу ад непрыемнага ўспаміну аб кіслым падпухлым жончыным твары і аб штодзённых грашовых спрэчках з шалапутным, ахопленым магнітафоннай маніяй, сынам. Хто ведае, ці яна здагадвалася аб гэтай сваёй лекавай місіі ў жыцці намесніка, ці не.

Ніна крутанулася крыху ў кабінеце, пералажыла папку на стале, падсунула попельніцу да самай рукі Антава і пасля гэтых сімвалічных клопатаў утаропіла свае вялікія, перапоўненыя спачуваннем вочы.

— Таварыш Антаў, гэта праўда, што аднаму з намеснікаў трэба вызваляць месца?

У нетактоўнасці Ніны было столькі непасрэднасці і мілай чароўнасці, што ён, пяцідзесяцігадовы ўжо мужчына, не здолеў бы раззлавацца на яе нават тады, калі яна паведаміла б яму яшчэ больш горкую навіну. Намеснік застаўся спакойным, нават пажартаваў, але ўзрушэнне, якое выклікала ў яго навіна, было занадта моцнае, каб схаваць яго ад пільнага вока сакратаркі. Са спазненнем зразумеўшы сваю прамашку і са шкадаваннем, што шэф недаацэньвае яе пачуцця гумару, Ніна паспяшалася супакоіць яго:

— О, не хвалюйцеся, — сказала яна тонам, як мага больш аптымістычным. — Ніхто не сумняваецца, што не вам, а Веневай давядзецца пайсці.

Пасля таго, як пераадолеў першапачатковы шок, Антаў паспрабаваў упарадкаваць заблытаныя думкі. Пэўна, дзяўчына мае рацыю ў сваіх меркаваннях аб развязцы. Якія ў яго могуць быць падставы для трывогі? Пасаду намесніка дырэктара ён займае амаль дваццаць гадоў. Нікому не перайшоў дарогу, бо шэраг абставін у біяграфіі не дазваляў яму расці вышэй. Ці можа быць ён? Прытым, ніводнай драпінкі, ніводнай плямкі на службовай рэпутацыі. Не выпадкова ён перажыў некалькіх дырэктараў і ўдвайне больш падначаленых. Ягоныя калегі, сведкі шматлікіх іерархічных зменаў, тлумачылі рэдкасную яго ўстойлівасць ці шчаслівым збегам абставін, ці аратарскім яго майстэрствам. Гэта было наіўна. Адзін Румен Антаў ведаў, чаго каштавала яму трымацца на такім хісткім месцы. Нібы той воін, якому ўдалося ўзяць заваёўную вышыню, ён абараняў яе апантана, адбіваўся дзе хітрасцю, дзе з тактоўнасцю ад агрэсіўных сапернікаў. Галоўнай зброяй у той незаўважнай, схаванай за шырмай уяўнагарманічных службовых адносін барацьбе была прыроджаная інтуіцыя да прадчування маючых адбыцца службовых патрасенняў. Вядома, на дапамогу інтуіцыі прыходзіла і разведка — рамяство, якім Антаў авалодаў дасканала. Быццам нейкім звышнатуральным шляхам ён своечасова даведваўся, што «час» ягонага шэфа канчаецца. Тады надыходзіў яго час. Пачынаў бегаць па ўстановах і кафэ, запрашаў каго трэба ў госці, арганізоўваў «выпадковыя сустрэчы» з людзьмі, якія саслужаць яму службу, «занатоўваў» кожнае міжволі кінутае слова, недагаворанае меркаванне, шматзначную ўсмешку і, як вопытны сіноптык, складаў графік будучых перамен. Пасля таго лагічным шляхам «перастаноўкі пешак» дабіраўся да імя будучага дырэктара і паспяваў зрабіцца ягоным прыяцелем яшчэ да таго, як той і не падазраваў, што яго чакае начальніцкае крэсла. Такім спосабам Антаў унікаў таго, каб падмазвацца і рабіць недастойныя захады, што, натуральна, выклікала б агіду ў кожнага кіраўніка, які паважае сябе. То было дагэтуль. Толькі апошні дырэктар, цяперашні, які не паспеў яшчэ абжыцца за вялікім дубовым сталом і адразу распачаў цэлы каскад пераўтварэнняў, прыйшоў неяк нечакана і заспеў Румена Антава непадрыхтаваным. І атрымалася так, што ён не змог апярэдзіць падзеі і цяпер спрабаваў асэнсаваць усё па-філасофску. У рэшце рэшт жыццё прадаўжаецца. І калі не будуць мяняцца дырэктары, не адчуеш ніякага руху наперад, прагрэсу. І гэтыя перамены вакол цябе — ці не самы пераканаўчы доказ тваёй стабільнасці? Антаў ужо ўяўляў, як калі-небудзь, седзячы на лавачцы з прыяцелямі-пенсіянерамі, будзе ўспамінаць: быў у свой час адзін дырэктар, ахоплены маніяй перамен... Можа, яно так і было б, як заўсёды было дагэтуль, калі б не настырнае рашэнне новага дырэктара пачаць са скарачэння сваіх намеснікаў.

Пасля таго, як Ніна выйшла, пакінуўшы за сабой тонкі водар ад вельмі дарагіх для яе сціплай зарплаты духоў, Антаў паспрабаваў абдумаць усё цяперашняе. Што праўда, то праўда, у двух намесніках патрэбы няма. Штатную адзінку ўвёў хтосьці з былых дырэктараў, які вырашыў зрабіць добрую справу свайму прыяцелю. Пазней гэтае месца па інерцыі было прапанавана Веневай. І вось цяпер новы дырэктар зусім лагічна вырашыў выправіць тую памылку. Дык чаго тады гэтак перажываць?

Антаў перагарнуў лісток настольнага календара, выцягнуў ручку з унутранай кішэні пінжака, падрыхтаваўся напісаць, што яму трэба зрабіць за сённяшні дзень, але рука ягоная застыла над чыстым лістком. Ніводная са шматлікіх неадкладных задач, якія не давалі спаць праз усю ноч, не прыходзіла цяпер у ягоную галаву. Ён зручна адкінуўся на спінку крэсла, акінуў паглядам кабінет. Усё ў гэтым пакоі надавала пачуццё надзейнасці — масіўны стол, мармуровая ваза для алоўкаў, зашклёная, вышынёй аж да самай столі кніжная шафа і нават пацёрты персідскі дыван. За выключэннем мяккага, абабітага аліўкава-зялёным плюшам крэсла, уся мэбля была старая, пацямнелая і моцная — усё было стабільна, як і ён сам. У кабінеце было мноства дробных прадметаў — керамічная ваза, падораная яму першай сакратаркай, грувасткая металічная чарніліца — успамін, пра калежку, цяпер ужо пенсіянерку, карціна Генкі Генкава — калектыўны падарунак да дня яго нараджэння. І ўсё гэта было часткай ягонага жыцця. У свой час, заняўшы пасаду намесніка дырэктара, ён радаваўся не гэтак павышэнню, колькі магчымасці ўладкавацца ў прасторным кабінеце. Таму і перспектыва яго пакінуць здавалася яму больш страшнай, чым само звальненне. У кабінеце, які Антаў палюбіў мацней, чым саму работу, было вялікае акно, што выходзіла ва ўнутраны двор. Пыльнае запусценне гэтага двара ажыўлялася прысутнасцю старога міндаля. Скрыўлены, з агрубелай карой, ён цудам ацалеў у абдымках сівога бетону. Па незразумелым капрызе памяці між змрочных думак аб службе выплыў успамін пра гэтае дрэва. Асветленае скупым сонцам, душачыся бензінавымі выпарэннямі, пазбаўленае ўсялякага догляду, яно ўпарта расцвітала на працягу доўгіх гадоў. Галінкі яго засыхалі адна за адной, але сям-там на ім яшчэ тлела жыццё. Неяк Антаў падумаў, што гібель дрэва будзе для яго дрэнным знакам, і кожную вясну з трывогай і надзеяй назіраў, як яно прагна чаплялася за жыццё. І цяпер, адчуўшы падсвядомы страх, Антаў падбег да акна, гатовы да горшага. Дзякуй богу, на адной з галінак распусціліся сціплыя ружовыя кветачкі. Міндаль прадаўжаў адмерваць летазлічэнне ягонай службовай кар'еры. Супакоіўшыся, Антаў накіраваўся да стала, але не паспеў ён зноў уладкавацца ў крэсле, як у кабінет увайшла сакратарка.

— Заўтра ў дзесяць — нарада ў дырэктара, — бесклапотна паведаміла яна. — Вось, калі ласка! — прыгожыя, тонкія пальцы яе з ружовым манікюрам адарвалі лісток паперы, на якім быў напісаны парадак дня.

Пакуль дзяўчына зачыняла цяжкія абабітыя дзверы, намеснік кінуў вокам на трэці пункт парадку дня, напісаны як бы між іншым: «Пытанне аб штатных зменах».

Новы дырэктар рабіўся надта заўзятым. Было штосьці непрыстойнае ў спешцы, з якой ён хацеў змяніць традыцыі, што ўкараналіся даўно і старанна. Ён жа мог паклікаць аднаго з намеснікаў (больш вопытнага, канечне), сказаць яму аб сваіх намерах, выслухаць яго меркаванні... і тады ўжо рабіць нейкія захады. Даводзілася і самому Антаву звальняць людзей... Вядома, звальнялі па загаду дырэктараў, аднак жа па ягоных парадах, і ён добра ведаў, як усё гэта робіцца. Тут ёсць свае тонкасці. Зусім няма патрэбы склікаць нарады і прымаць калектыўныя рашэнні. Выхаванасць патрабуе, каб была захавана прыстойнасць — пакрыўджанаму чалавеку не пашкодзіць спагадлівае слова і ўсмешка на развітанне. «Вызваленне службовай асобы», як любіў гаварыць ён замест грубага слова «звальненне», павінна выспяваць спакваля, каб адпаведны службовец, калі ён інтэлігентны чалавек, зразумеў нарэшце, што дзявацца няма куды. Але для такога тонкага стылю кіраўніцтву патрэбна адпаведная культура, а яшчэ больш — вялікае цярпенне. А новаму якраз гэтага і не хапае — хоча зрабіць рэвалюцыю адным махам: раз-два — і гатова! Са свайго шматгадовага вопыту Антаў ведаў, што такія не затрымліваюцца доўга, таму што самі падсякаюць пад сабой сук. Яны падобныя на палкаводцаў, якія без надзейнага тылу і баяздольнага войска паспешліва наступаюць у незнаёмыя мясцовасці. Галоўная ўмова для таго, каб ацалець пры такім дырэктары—спакойна чакаць прыходу наступнага. А пакуль што трэба ўчапіцца зубамі за службовае крэсла і абараняць яго нават тады, калі давядзецца ўступіць у рукапашную.

Назаўтра, за некалькі хвілін да дзесяці, Антаў з прыўзнята-бадзёрым выглядам пераступіў парог дырэктарскага кабінета. Супрацоўнікаў яшчэ не было, дырэктар засяроджана пісаў нешта ў запісную кніжку і на прывітанне рассеяна кіўнуў галавой. Намеснік загладзіў няёмкасць за свой ранні прыход старанна абдуманым жартам, які і зрабіў добрую справу. Шэф стрымана, з натугай засмяяўся, але ўсё ж засмяяўся, з цікаўнасцю зірнуў на Антава і прапанаваў сесці. Даверлівай гутаркі, на якую разлічваў Антаў, на жаль, не адбылося, бо дырэктар спешна рыхтаваўся да нарады і яму было не да службовай шчырасці.

Як ніколі раней, людзі збіраліся ціха, заходзілі амаль на дыбачках, зрэдку перашэптваліся між сабой. Венева ўвайшла апошняй — даволі позна, каб Антаў мог адчуць яе настрой, але і не настолькі, каб спазніцца. Законнае яе месца паміж дырэктарам і другім намесні-

Што, Джыні? Чую сапраўды
З каханых вуснаў згоду?
Не трэба ў свеце мне тады
Вышэйшай ўзнагароды!
Мацней прыцісну да грудзей
Я скарб свой неацэнны.
І не аддам за вечны рай
Я гэтага імгнення!
Блакіту дарагіх вачэй
У вернасці клянуся!
Няхай жа прыкладуць хутчэй
Пячаць да вуснаў вусны!

Любоў мая— бы ружачка

Любоў мая — бы ружачка,
Што аздабляе сад;
Любоў мая — бы музыка,
З якою сэрца ў лад.

Я буду твой, любоў мая,
Ажно да тых часоў,
Пакуль не змоўкне акіян
Ля гэтых берагоў.

Пакуль не змоўкне акіян,
Скала не пацячэ,
Кахаць цябе, любоў мая,
Я буду ўсё крапчэй.

Бывай, адзіная мая!
Бывай! Пайду ў журбе.
І ведай: дзе б ні бег мой шлях,
Ён прыйдзе да цябе.

Красуня з Эклефэхана

— Што, хіба я,
што, хіба я
Была нявестай беднай?
А прасніца унь то чыя?
А таз вось гэты медны?!
А хаты дзедавы аж дзве:
Малая і паболей?
І ўсё—ў дадатак да мяне,
Красуні наваколля!

— Калі ўжо, люба,
твой язык
Даскачашча да стомы?
Штодня пад гэты д'яблаў
смык
Я мушу бегчы з дому!
Заглух мой спеў, мой смех і
жарт —
Хаджу, бы цень пахмуры...
Ды ўраз бы, люба, акрыяў
Я на тваіх хаўтурах!

Табе

Калі б скрозь непагадзь і змрок
З табой мы йшлі, з табой мы
йшлі,
Цябе б крылом плашча свайго
Я затуліў, я затуліў.

Калі б злаваў натоўп нягод
З усіх бакоў, з усіх бакоў,
Я б стаў між імі і табой
Цвярдзей муроў, цвярдзей
муроў.

Калі б я страціў ўсё, што меў,
Парой ліхой, парой ліхой,
То ўсё адно б лунаў мой спеў,
Бо я з табой, бо я з табой.

А быў сусвету б я ўладар —
Сказаў бы зноў, сказаў бы
зноў:
Ты — мой найдаражэйшы
скарб,
Мая любоў, мая любоў!

Пераклад
Галіны ДУБЯНЕЦКАЙ.

кам было вольнае, але яна нібыта не бачыла пустога крэсла, перасекла кабінет і села каля акна. Антаў крышачку падсунуўся і схаваў свае вочы за цёмнымі акулярамі, каб зручней і непрыкметна назіраць за «праціўнікам». Венева горда расправіла плечы. О, як ненавідзеў ён яе звычку сядзець, з выклікам наставіўшы высокую прычоску. На што ж разлічвае гэтая жанчына? Наколькі яму было вядома, яна яшчэ не паспела падладзіцца да новага дырэктара, ды і не спрабавала нават. Для гэтага патрабуецца талент і такт, а яна толькі і ведае, што важнічае і высоўваецца з ініцыятывамі.

Праз усю апошнюю бяссонную ноч, заняўшы ў думках месца дырэктара, Антаў сіліўся аб'ектыўна рашыць дылему: хто з дваіх? Ён ці Венева? Проста смешна было ставіць такое пытанне. Яе прызначылі два гады таму назад зусім выпадкова, бо баяліся, каб не прыйшоў хто-небудзь збоку са сваімі прэтэнзіямі. А яна ўжылася ў сваю новую ролю, пачала выдаваць ідэі, кінулася ў работу з агіднай добрасумленнасцю ўчарашняга дробнага службоўца. Калі пасаду намесніка параўнаць з багаццем, дык Антаў збіраў яго па адной капейцы, пазбаўляў сябе многіх уцех, а Венева атрымала яго задарам, нібы выйграла ў латарэю. Ён пакутаваў ад гэтай несправядлівасці, жанчына побач з ім прыніжала ягоную вагу ў калектыве. Не, ён нічога не меў супраць жанчын, у асабістым жыцці ён з задавальненнем адводзіў ім належнае месца, але прысутнасць іх у службовай іерархіі глыбока закранала яго самалюбства. Можа, другую якую ён мог бы яшчэ цярпець, але Веневу... З гэтай настаўленай прычоскай і непрыемнай прывычкай гаварыць «у лоб», з гульнёй у прынцыпы, заўсёднай гатоўнасцю спрачацца... Баба з выбрыкамі — ды па ёй проста плача звальненне. Ну-ну, зараз ты яго атрымаеш.

У кароткім, выпрашаным курцамі перапынку ён бачыў, як мерала яна сваімі доўгімі нагамі калідор, і адчуваў злараднае задавальненне ад думкі, што для яго абыякавыя яе формы, якія нахабна лезуць мужчынам у вочы. Што можа больш пакрыўдзіць жанчыну, чым мужчынская абыякавасць да яе, спалучаная з мілай увагай да іншых калежак! Але разам з асалодай ад сваёй мужчынскай помсты ў душу Антава закралася і трывога—не трэба забывацца, што ў адрозненне ад яго яна мае яшчэ адну зброю. Праўда, яна яшчэ не рабіла спроб выкарыстаць яе, але ці не было гэта прытворнай дабрачыннасцю ў вялікай гульні?

Румен Антаў не паспеў закончыць свае разважанні, бо супрацоўнікі ўжо зноў запаўнялі вялікі кабінет, і дырэктар перайшоў да крытычнага пункту ў парадку дня. Як і трэба кіраўніку, ён пачаў з асцярожных слоўных манеўраў, з якіх рабілася зразумела, што адбудзецца сур'ёзная рэарганізацыя: «пераадоленне закасцянелых традыцый», «канцэнтрацыя сіл», «вызваленне сацыяльных рэсурсаў», «неабходнасць змен» і г. д. На простай і бясхітраснай мове Ніны гэта азначала, што адзін з намеснікаў павінен вызваліць месца. Хто ж з дваіх? Гэтае пытанне, зусім нядаўна недарэчнае і ці не смешнае ў вачах Румена Антава, цяпер навісла над ім з усёй няўхільнасцю. У свядомасці яго подла ўзнікла і другое пытанне: «Што будзе, калі...» Ён не знайшоў у сабе смеласці адказаць: «нічога», але адчуў, што самаадчуванне яго расцякаецца, нібы вада, пазбаўленая ўстойлівай прасторы сасуда. І пачаў ліхаманкава прыгадваць трывожныя сімптомы блізкай небяспекі. Дапусціў, каб прызначылі дырэктарам чалавека, ад якога можна чакаць усяго. Далей. Абыякава паставіўся да ягоных новаўвядзенняў. Недаацаніў вабнасці Веневай, якая ўсё-такі можа спакусіць якога-небудзь наіўнага чалавека ў гадах. Ён, гэты наіўны, прывык прадбачыць усе хады шэфа, умеў гэта зрабіць па адным намёку сакратаркі. А памылкі беспакарана не праходзяць. Пагроза стаяла перад ім у незвычайных абрысах пяшчотных жаночых плеч, вытачанай шыі пад пышнай прычоскай, вачэй, нахабна прыцягальных.

Антаў непрыкметна расслабіў вузел на гальштуку і пастараўся зрабіць незалежны выгляд чалавека, для якога змены ў калектыве не маюць ніякага значэння. У той момант да слыху яго даляцелі нейкія словы... Адразу ён не надаў ім значэння—гучалі яны проста непраўдападобна. Па кабінеце пракацілася хваля стрыманага шуму. Намеснік акінуў паглядам твары калег, шукаючы пацвярджэння таго, што пачуў. Страх, які валодаў ім дагэтага, перашкодзіў адразу паверыць у цуд. Венева падала заяву на звальненне. Не, няма ніякага сумнення! Вось дырэктар бярэ белы аркуш... Антаў выразна бачыць яе подпіс... Дзіўная жанчына! Яна зразумела непазбежны вынік усяго і замест таго, каб прыняць яго пакорліва, як зрабіў бы гэта кожны нармальны чалавек, вырашыла сыграць чарговы і апошні нумар. Прыгожы жэст, нічога не скажаш! І што яна яшчэ строіць з сябе? Хто яна такая, каб гэтак дэманстраваць? Чаму не падала заяву раней, а цяпер, калі і без таго дні яе злічаны?

Намеснік ужо не слухаў заключных слоў дырэктара. Цяпер гэта не мела значэння. Прыемная цеплыня разлілася па ягоным целе. Зірнуў на Веневу. Тая па-ранейшаму сядзела, выпрастаўшы спіну, як салдат. Цяпер то ўжо навошта рысавацца? Хоць, вырашыў дабрачынна Антаў, няхай сабе пацешыцца, калі гэта дае ёй задавальненне. Цяпер ужо не варта заядацца з ёй. Ён мог нават прапанаваць Веневай цікавую работу — непатрэбная яе добрасумленнасць будзе толькі яму на карысць.

Пакутлівая нарада закончылася. Намеснік разам з усімі рушыў да дзвярэй. Крыху наперадзе ішла Венева. І ён упершыню агледзеў яе мужчынскім вокам. Для сваіх гадоў выглядала яна някепска: высокая, стройная, з прыемнай лініяй стану, яна ўсё-такі вабіць вока.

— Антаў! — пачуўся патрабавальны голас дырэктара.

Намеснік, які быў ужо каля дзвярэй, борздка павярнуўся і накіраваўся да шэфа з вінаватай усмешкай. Можна было самому дапяць, што трэба застацца, пра сёе-тое паразважаць, падумаць разам. Ці ж мала работы ў іх наперадзе!

— Сядайце! — паказаў яму на канапу дырэктар і таксама прысеў. — Як думаеце, ці зразумеюць людзі перамены ў калектыве?

— Натуральна, — крыху здзівіўшыся такому пытанню, адказаў Антаў.

— Ну, а вы як?

«Натуральна», — зноў хацеў было сказаць намеснік, але тон начальніка яго збянтэжыў, і ён прамаўчаў.

— Хацелася б, каб вы правільна мяне зразумелі, — працягваў дырэктар. — Таму што... Я мяркую Веневу не адпускаць.

— Як? — выдаў сваю збянтэжанасць Антаў, але тут жа ўзяў сябе ў рукі. — Ах, ну вядома!.. Я таксама хацеў прапанаваць не звальняць яе. На любой нізавой пасадзе яна спатрэбіцца, як і кожная жанчына. Вось як мы аднолькава з вамі думаем.

Дырэктар устаў, прыбраў запісную кніжку ў партфель і, не спяшаючыся, пачаў яго зашпіляць. Затым некалькі разоў рытмічна пастукаў аўтаручкай па стале, быццам адмерваў час.

— Справа ў тым, Антаў, што мы з вамі думаем не аднолькава. Вы памыляецеся.

Намеснік таксама ўстаў. Ён не спяшаўся з адказам. Маўчанне было патрэбна яму не гэтак для таго, каб авалодаць сабой, як надаць большую вагу сваім словам.

— Гэта вы памыляецеся, таварыш дырэктар, — сказаў ён з прыхаванай іроніяй. — А за памылкі заўсёды даводзіцца расквітвацца.

Неўзабаве Антаў стаяў каля акна ў сваім кабінеце, таго самага акна, з якога назіраў, як у двары ўпарта змагаецца са смерцю напаўзасохлы міндаль.

— Яшчэ пабачым, хто з нас, — працадзіў праз зубы намеснік...

Думаў ён ужо не пра Веневу, а пра самога дырэктара.

З балгарскай пераклала
Вера МАСЛОЎСКАЯ.

ПОШУКІ ЗНАХОДКІ

РАДЗІВІЛАЎСКАЯ БІБЛІЯТЭКА Ў СЛУЦКУ

Слуцк у XVII стагоддзі быў прыватнаўласніцкім горадам (з 1612 г. належаў Радзівілам), буйным гандлёвым і рэлігійна-культурным цэнтрам беларускіх зямель. Жыло ў ім той парою сем з паловай тысяч жыхароў.

З 1624 г. у горадзе існавала кальвінісцкая гімназія, дзе працавалі выкладчыкі з Польшчы, Германіі, Маравіі. Акрамя гімназіі, у горадзе была школа для гараджан, у якой па распараджэнні князя навучаліся дзеці слуцкіх мяшчан.

Заснавальнік гімназіі князь Багуслаў Радзівіл быў адукаваным чалавекам. Ён шмат падарожнічаў па Еўропе, два гады жыў у Парыжы. Пасля смерці Януша Радзівіла Багуслаў становіцца на чале літоўскіх кальвіністаў. Юнакі з Літвы і Беларусі з яго дапамогай атрымлівалі адукацыю ў Оксфардскім, Берлінскім універсітэтах, у Эдзінбурзе, Франкфурце, Лейпцыгу...

Працяглыя падарожжы па Еўропе спрыялі збіранню кніг. Асновай радзівілаўскай бібліятэкі з'явілася бібліятэка князёў Алелькавічаў, ранейшых уладароў Слуцка. Апошняй карыстаўся вядомы гісторык Мацей Стрыйкоўскі, які напісаў «Хронику польскую, литовскую, Жамойтийскую и всея Руси» (1582 г.).

Слуцкая бібліятэка была пакінута ў спадчыну Багуславам Радзівілам яго праўнучатаму пляменніку Фрыдрыху-Вільгельму, кюрфюрсту Брандэнбурга і герцагу Прусіі — з умовай, што кнігі будуць перададзены ў Кёнігсбергскую бібліятэку герцага. У 1673 г. у Кёнігсбергу ў друкарні Фрэдэрыка Ройзнера надрукавалі ў двух тамах каталог кніг Слуцкай бібліятэкі, які дае нам уяўленне пра яе багацце. Склаў каталог і напісаў да яго ўводзіны бібліятэкар герцага доктар тэалогіі Марцін Сільвестр Грабэ. Ва ўводзінах гаворыцца, што князь Багуслаў Радзівіл падарыў усе кнігі, што засталіся ў яго пасля разграблення бібліятэкі шведамі.

Кнігі, уключаныя ў каталог, падзелены на дзве часткі: у поўны друкаваны ліст і ў чвэртку друкаванага ліста.

Чым цікавы для нас гэты каталог зараз? Па кнігах, што былі ў бібліятэцы, можна меркаваць пра распаўсюджанне навуковых ведаў і заходнееўрапейскай лацінскай кнігі ў Беларусі ў XVII ст.

Каталог змяшчае 371 назву, 313 кніг было на лацінскай, 44 на нямецкай і французскай і толькі 4 на польскай мове. У сувязі з гэтым нельга пагадзіцца з меркаваннем гісторыка А. Грыцкевіча аб значным распаўсюджанні ў Слуцку ў XVI — XVIII стст. польскай кнігі.

Слуцкая калекцыя лацінскай кнігі складалася з выданняў XV—XVI стст. Яны друкаваліся ў Нюрэнберзе, Венецыі, Базелі, Франкфурце, Віттэнбурзе, Цюрыху, Парыжы, Рыме, Балонні. 4 кнігі на польскай мове выдадзены ў Празе, Вільні, Кіеве.

Для Слуцкай бібліятэкі характэрны свецкі змест кніг. Палову ўсяго збору складаюць творы антычных аўтараў і кнігі па гісторыі і філасофіі. Тут мы знаходзім працу Плутарха «Аб маралі» (1580 г.), сачыненне Ц. Лівія «Гісторыя рознымі заўвагамі» (1588) іншыя.

Пра вялікія геаграфічны адкрыцці, што здзяйсняліся сярэднявеччы, расказвалася «Апісанні ўсходняй Індыі» ў частках, у «Новым атласе» Я. Янсані.

У бібліятэцы знаходзілася 15 кніг па медыцыне і заалогіі. Адна з найбольш старажытных — гэта сачыненне абата Халі «Медыцына тэарэтычная і практычная» (1492). Звяртае на сябе ўвагу твор класіка антычнай медыцыны, старажытнарымскага ўрача Клаўдзія Галена «Тэрапеўтыка» на грэчаскай мове. Несумненную цікавасць для даследчыкаў уяўляе сямітомная бібліяграфія, складзеная Нікалаі Нікалі Фларанціні «Кнігі навуковыя і медыцынскія» (Венецыя, 1507).

Сярод кніг па матэматыцы неабходна адзначыць «Матэматычныя творы» нідэрландскага матэматыка Сімона Стэвіна, выдадзеныя яго вучнем Альбертам Жырардам у 1613 г.

Уладальнік Слуцкай бібліятэкі цікавіўся таксама астраноміяй і фізікай, пра што гавораць кнігі славутага Я. Кеплера «Новая астраномія» (Амстэрдам, 1609). Трэба назваць і кнігу Себасцьяна Мюнстэра «Касмаграфія» (Базель, 1572 і 1598 гг.). Яна цікавая тым, што ў ёй прыведзена апісанне Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. На карце, прыкладзенай да сачынення, упершыню нанесены беларускія землі. Уся вобласць сённяшняга Палесся пакрыта лясамі, паказаны правы прыток Дняпра, але няма ні Прыпяці, ні балот, ні азёр.

У бібліятэцы, акрамя таго, было 10 кніг па мастацтве. Найбольш раннім выданнем з'яўляецца «Сучасная архітэктура Бельгіі» Карнеліса Данкертса (Амстэрдам, 1631).

У слуцкім зборы знаходзіліся кнігі-інкунабулы, выдадзеныя на зары кнігадрукавання. У іх шырока прадстаўлена багаслоўская тэматыка — ад прац так званых «отцов церкви» і да сярэдневяковай схаластыкі.

Прадстаўлена таксама біблія — як у інкунабулах, так і ў выданнях XVI ст. на нацыянальных мовах. У радзівілаўскай бібліятэцы былі дзве рукапісныя нямецкія біблії і дзесяць друкаваных.

Такім чынам, можна зрабіць вывад і аб разнастайнасці інтарэсаў слуцкага магната, і аб распаўсюджванні ў Беларусі тых часоў прыродазнаўчых ведаў. Характэрна, што скарбамі княскай бібліятэкі карысталіся таксама выкладчыкі і навучэнцы слуцкай гімназіі.

В. ЦЫБУЛЯ.

АДКРЫВАЮЦЬ ТАЙНУ МУЗЫКІ

20-годдзе адзначыла Капыльская дзіцячая музычная школа. Спачатку ў ёй займалася 96 вучняў, працавала чатыры выкладчыкі па трох спецыяльнасцях: фартэпіяна, баян, акардэон. Цяпер тайны музычнага майстэрства па сямі спецыяльнасцях тут спасцігаюць 123 хлопчыкі і дзяўчынкі, з якімі працуюць 15 высокакваліфікаваных педагогаў. За гэты час школу закончылі больш як 200 чалавек. Многія з іх назаўсёды звязалі свой лёс з музыкай.

Педагагічны калектыў аказвае дапамогу самадзейным артыстам, мастацкім калектывам. Ні адзін канцэрт у Капылі, ды і за яго межамі, не праходзіць без актыўнага ўдзелу выкладчыкаў і вучняў музычнай установы.

І. ПРАКАРЫНА.

З НАРОДНЫХ КРЫНІЦ

«НА КУПАЛЛЕ, НА СВЯТОЕ...»

У нашага народа ёсць старажытнае летняе свята Купалле, карані якога — у глыбокай даўніне. Яно паэтызуе лета, якое ўваходзіць у сілу, супадае з заканчэннем сяўбы, пачаткам касьбы, ростам новага ўраджаю. Святкуецца Купалле ў дзень летняга сонцастаяння і нічога агульнага не мае з царкоўным святам Іаана Хрысціцеля. Проста царкоўнікі выкарыстоўвалі народнае свята.

Цікавасць да купальскага свята абуджаецца зноў. Цяпер многія даследчыкі і вучоныя, тыя, хто займаецца вывучэннем народных святаў і абрадаў, з вялікай цікавасцю збіраюць матэрыял пра Купалле, як з'яву нацыянальнай духоўнай культуры. І не дарэмна. Таму што ў многіх мясцінах Беларусі яшчэ жыве традыцыя купальскага свята. Хоць, на жаль, многае, вельмі многае страчана...

Святкуюць Купалле на Віцебшчыне, слаўнай Полаччыне, у Браслаўскім, Лунінецкім, Маладзечанскім раёнах, у вёсках Патапавічы, Падлессе, Дарава Ляхавіцкага раёна, Пешкі Бярозаўскага раёна, Застарынне Баранавіцкага раёна і многіх іншых кутках нашай рэспублікі, на берагах рэк і азёр. Калі б у ноч з 6 на 7 ліпеня выйсці на ўзгорак, перад намі раскінулася б прастора зямлі, і на ёй неяк па-роднаму пяшчотна мігцелі б агеньчыкі купальскіх кастроў...

У вёсцы Адворня Ушацкага раёна свята праводзіцца на Панькавай гары, самым высокім месцы ўсяго наваколля. Жанчыны і дзяўчаты збіраюць у полі кветкі, упрыгожваюць хаты, плятуць вянкі. Вечарам, калі ўправяцца з гаспадаркай, усе ідуць на гару. Сюды збіраюцца людзі і з навакольных вёсак. Яны спяваюць старадаўнія купальскія песні. Пасля спеваў пачынаюцца масавыя гульні ля вогнішча, абавязковай часткай якіх з'яўляюцца карагоды, танцы. Хлопцы скачуць праз агонь. Апоўначы маладыя пары разыходзяцца шукаць папараць-кветку, кветку шчасця, якая цвіце толькі ў купальскую ноч. Паводле падання, той, хто яе знойдзе, будзе шчаслівы. Звітыя напярэдадні свята вянкі моладзь апускае ў возера Янава: маўляў, у які бок паплыве вянок, у той бок дзяўчына пойдзе замуж.

Хто пабываў у ноч з 6 на 7 ліпеня на беразе Заходняй Дзвіны, бачыў дзівоснае відовішча: па рацэ плывуць плыцікі з вогнішчамі і надпісамі вёсак, дзе святкуюць гэтае свята. Па ўсёй рацэ бачыш вогненныя кропкі.

Адзначаецца свята і ў гарадах Маладзечне, Лагойску, Плешчаніцах і інш. У Лагойску работнікамі Дома культуры ў 1974 годзе быў напісаны спецыяльны сцэнарый, створаны аргкамітэт з 25 чалавек, і з таго часу свята праводзіцца ў гарадскім парку на беразе ракі Гайна. Узяўшы за аснову верш Н. Гілевіча: «Ах, якая над Гайнай купальская ноч...», работнікі культуры імкнуліся захаваць асноўныя элементы народнага свята. Тут і купальскія песні, і песні аб прыродзе, аб працы ў выкананні самадзейных калектываў сельскіх клубаў, і палявыя кветкі, якімі ўпрыгожваецца летняя эстрада. Абавязковым рытуалам купальскага свята з'яўляецца распальванне кастроў на вадзе ў выглядзе вянкоў, на беразе праводзяцца спаборніцтвы, конкурсы.

Элементы купальскага свята ўключаюцца ў святы моладзі, як, напрыклад, гэта праводзіцца ў парку вёскі Дарашэвічы Петрыкаўскага раёна.

Якая цудоўная багатая спадчына, колькі радасці яна прыносіць людзям. Чаму ж не зрабіць яе сучаснай?

Гэта залежыць толькі ад нас, каб свята Купалля ператварылася ў народнае масавае гулянне, праводзілася ў калгасах, саўгасах, санаторыях і дамах адпачынку, у парку культуры і адпачынку. Народнае гулянне ў купальскі вечар можна зрабіць больш змястоўным, вясёлым, узбагаціць яго сацыялістычным зместам, духам калектывізму, яно можа стаць святам песні, услаўлення прыроды, працы, савецкага ладу жыцця. Каля кастроў можна праводзіць спаборніцтвы, віктарыны, конкурсы, выступленні ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, фальклорных ансамбляў. На гэтым свяце добра гучалі б песні аб працы, роднай прыродзе, не лішнімі былі б і жартоўныя песні, гумар, прыпеўкі, лірыка. Можна добрым словам успомніць перадавікоў вытворчасці, а заадно і пасмяяцца з гультаёў, парушальнікаў дысцыпліны. Як і ў даўніну, можна выбраць вядучых свята Купаліша і каралеву купальскага свята Купалінку.

З Купаллем звязана імя нашага беларускага песняра Янкі Купалы, які нарадзіўся ў гэты дзень. І ўрыўкі з яго вершаў будуць на свяце цудоўнымі і непаўторнымі. Хоць бы гэтыя радкі з верша «На Купалле»:

На Купалле, на святое
Рві, матуля, зелле тое,
Што ў нас папараць
завецца!
І шчаслівым быць
здаецца!

Іскрынкі Купалля яшчэ гараць. Вялікая роля ў тым, каб яны не згаслі, належыць нашай інтэлігенцыі, моладзі, такім арганізацыям, як рэспубліканскі і абласныя навукова-метадычныя цэнтры народнай творчасці і культурна-асветнай работы, міжсаюзным дамам мастацкай самадзейнасці. На жаль, да сённяшняга дня яны не падрыхтавалі неабходных рэкамендацый па правядзенні купальскага свята, не забяспечылі імі сельскія, раённыя клубы і дамы культуры. За аснову можна ўзяць сцэнарый свята, распрацаваны ў г. п. Заслаўе, ініцыятарамі якога выступілі мясцовы музей народнага мастацтва і рамёстваў, філіял Дзяржаўнага мастацкага музея БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

На жаль, Саюз пісьменнікаў і іншыя творчыя саюзы рэспублікі пакуль таксама не аказалі дапамогі ў адраджэнні і правядзенні гэтага народнага свята.

Пры не такіх ужо і вялікіх намаганнях можна зрабіць купальскае свята пасапраўднаму ўсенародным, як гэта робяць нашы добрыя суседзі латышы, літоўцы. Яны зрабілі сваё свята Ліга, якое мае тыя ж вытокі, што і наша Купалле, усеагульным. (Між іншым, у Латвіі існуе спецыяльная пастанова на гэты конт, прынятая амаль пяць дзесяцігоддзяў назад).

Я. ЛІПЕНЬ,
выкладчык Мінскага інстытута культуры.

УЛЮБЁНЫ Ў ПРЫГОЖАЕ

Імя мастака шклозавода «Нёман» У. Жохава добра вядома не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Тым больш, што ён адзіны майстар па скульптуры са шкла ў рэспубліцы. Працуе творча, натхнёна. У гэтым пераконваешся, знаходзячыся ў яго майстэрні. Колькі фантазіі і цеплыні, мастацкага густу ў кожнай скульптуры — лясным волаце-зубры, казачных персанажах — чорце, вожыку, чарапасе і іншых звярках.

Асаблівае ўражанне робяць манументальныя работы Уладзіміра Паўлавіча.

Дэкаратыўны комплекс «Рускае поле» ўдастоены залатога медаля на міжнароднай выстаўцы ў чэхаславацкім горадзе Ябланцы.

На здымку: мастак У. Жохаў са сваім новым творам — кампазіцыяй кветак «Песня аб шкле».

Тэкст і фота
Г. БАРАЎЦОВА.

НА ЭКРАНЕ

з 8 па 14 ліпеня

9 ліпеня, 18.10
«ПІСЬМЕННІК І СУЧАСНАСЦЬ».
Пісьменнік Л. Левановіч разважае аб праблемах вольнага часу і адпачынку.

11 ЛІПЕНЯ, 21.35
С. АЛЕШЫН. «ТЭМА З ВАРЫЯЦЫЯМІ».
Спектакль Кіеўскага акадэмічнага рускага тэатра імя Л. Украінкі.
У ролях: народныя артысты Украінскай ССР В. Заклунная, А. Рашэтнікаў, В. Сівач.

12 ЛІПЕНЯ, 19.45
ПАКАЗВАЕ БРЭСТ. ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСОПІС «БУГ».

12 ЛІПЕНЯ, 20.35
КАНЦЭРТ ЖАНОЧАГА НАРОДНАГА ХОРУ МІНСКАГА МУЗЫЧНАГА ВУЧЫЛІШЧА ІМЯ М. І. ГЛІНКІ.
Вы пачуеце беларускія народныя песні і песні беларускіх кампазітараў.

13 ЛІПЕНЯ, 12.30
«СЛОВА ПАЭЗІІ».
Свае новыя вершы чытае В. Шніп.

13 ЛІПЕНЯ, 13.05
«У ЖЫВАПІСЕ, ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ».
Вы пабываеце на выстаўцы твораў В. Пярова.
У перадачы прымае ўдзел супрацоўнік Дзяржаўнага мастацкага музея БССР А. К. Рэсіна.

13 ЛІПЕНЯ, 15.10
«НАВІНКІ КНІГАРНІ».
Вядучая — паэтэса Н. Тулупава.

13 ЛІПЕНЯ, 17.15
ВЕЧАР АРТЫСТАЎ БАЛЕТА ДЗЯРЖАЎНАГА АКАДЭМІЧНАГА ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА МАЛДАЎСКАЙ ССР.
Вы пазнаёміцеся з балетным спектаклем «Вечар старадаўняй і сучаснай харэаграфіі». Будуць паказаны фрагменты з балетаў.
У спектаклі прымаюць удзел народны артыст Малдаўскай ССР А. Міхалакі, заслужаныя артысты Малдаўскай ССР В. Гур'еўская, В. Шчыпачова, Ул. Гелбет.

13 ЛІПЕНЯ, 22.55
«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».
Эстрадная праграма з удзелам малдаўскай спявачкі А. Лазарук.

14 ЛІПЕНЯ, 13.05
С. РАХМАНІНАЎ. 2-ГІ КАНЦЭРТ ДЛЯ ФАРТЭПІЯНА З АРКЕСТРАМ.
Выконвае Дзяржаўны сімфанічны аркестр Армянскай ССР.

14 ЛІПЕНЯ, 16.30
СПЯВАЕ ЛАЎРЭАТ УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ В. ПАРХОМЕНКА.
У праграме беларускія народныя песні.

14 ЛІПЕНЯ, 20.30
«КЛАРЫ ВІК ПРЫСВЯЧАЕЦЦА...»
Старонкі жыцця і творчасці кампазітара Р. Шумана і піяністкі К. Вік.

ЗАПРАШАЮЦЬ МУЗЕІ

У вёсцы Заастравеча Клецкага раёна за кароткі тэрмін узняўся аднапавярховы цагляны дом. Тут размясціўся гісторыка-краязнаўчы музей мясцовай дзесяцігодкі. Шмат сюды прыходзіць наведвальнікаў, каб сустрэцца з мінулым, у дакументах убачыць сённяшні дзень.

Педагагічны калектыў школы з ліку вучняў старэйшых класаў падрыхтаваў групу экскурсаводаў. Цікава праводзіць экскурсіі дзесяцікласніца Алена Кендыш. Яна добра вывучыла мунулае роднай вёскі, сабрала ўсё, што мае дачыненне да яе слаўнай гісторыі. Аб усім гэтым шчыра і захапляюча расказвае наведвальнікам.

Нядаўна з вопытам работы заастравецкага музея пазнаёміліся сакратары райкомаў і гаркомаў партыі, намеснікі старшынь гарвыканкомаў Мінскай вобласці.

Цяпер такіх музеяў, пакояў бавой і працоўнай славы на Міншчыне больш за 700. Пастаўлена задача адкрыць іх у кожнай школе, у кожным калгасе і саўгасе.

К. ПАДЛЕСКІ.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 00241 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела мастацтваў — 33-21-53, аддзела арганізацыйна-масавай работы — 33-19-65, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЕЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.